WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛІСТАПАДА 2009 г.
СЕРАДА
№ 213
(26571)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## ВРВІ і грып

Прафілактыка і лячэнне вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, грыпу, а таксама ўскладненняў, абумоўленых гэтымі захворваннямі, будуць у полі зроку нашай чарговай медыцынскай «прамой лініі». **18 лістапада,** у сераду, на вашы пытанні па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21 **з 14.00 да 15.30** адкажа кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры інфекцыйных хваробаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Святаслаў Алегавіч ВЕЛЬГІН.

**Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

# Аляксандр Лукашэнка адобрыў прапановы ЦВК па змяненні Выбарчага кодэкса

Прэзідэнт Беларусі правёў нараду па ўдасканаленні нацыянальнага выбарчага заканадаўства. Кіраўніку дзяржавы былі прадстаўлены прапановы па змяненні Выбарчага кодэкса рэспублікі.

Прэзідэнт адзначыў, што меры па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства Беларусі, якія абмяркоўваюцца сёння, — гэта вялікі крок наперад. Аднак вынікі такога кроку павінны быць загадзя дасканала пралічаны. «Трэба зыходзіць выключна з нацыянальных інтарэсаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, каб усе змяненні, што рыхтуюцца, няўхільна адпавядалі і літары, і духу Канстытуцыі Беларусі.

Удасканаленне законаў не патрабуе ўнясення змяненняў у Асноўны закон. «Яшчэ адзін рэферэндум праводзіць па змяненні Канстытуцыі, лічу, і не час, і няма такой неабходнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што лібералізацыя выбарчага заканадаўства не павінна прывесці да палітычных беспарадкаў і анархіі ў час будучых кампаній: «Хачу перасцерагчы, што разгляд магчымасці гэтых змяненняў не павінен даць старт нейкім кампаніям бразгання палітычнай зброяй. Таму што калі мы цяпер, у час эканамічных цяжкасцяў, пачнём гэтым займацца, то мы наўрад ці выберамся з гэтага стану».

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць: гэта ні ў якім выпадку не трэба разумець так, што мы раптам перастанем займацца эканомікай, канкрэтнымі пытаннямі жыцця людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што выбары павінны прайсці спакойна. «Не звяртайце ўвагі на гэты піск, віск і ўнутры краіны, і з-за мяжы, — заклікаў ён. — Мы павінны спакойна працаваць і рабіць сваю справу».

«Сёй-той трактуе неабходнасць змянення выбарчага заканадаўства як выкананне патрабаванняў Еўрасаюза па палітычнай лібералізацыі Беларусі. Націскаць на нас — контрпрадукцыйна, і гэта ў Еўропе разумеюць. Мы — суверэнная дзяржава і самастойна выпрацоўваем сваю знешнюю і ўнутраную палітыку, зразумела, улічваючы ўсё лепшае з сусветнага вопыту», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт растлумачыў, што Беларусь спакойна ўспрымае крытыку ЕС наконт нацыянальнага выбарчага заканадаўства. «Давайце не будзем скрываць: еўрапейцы выстаўляюць нам пэўныя патрабаванні, — сказаў ён. — Нядаўна сустракаючыся з прадстаўнікамі кіраўніцтва Еўрасаюза, я гаварыў ім, што ў нас няма ніякай алергіі, ніякага непрыняцця тых патрабаванняў, якія ўносіць Еўрапейскі саюз». «Проста нам трэба крыху часу. І мы практычна ўсе 12 патрабаванняў ад Еўропы прымаем — без урону для нашай унутранай палітыкі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Еўрасаюз, ЗША і Расія намякаюць Беларусі на тое, што ў нечым не шкодзіла б падкарэктаваць заканадаўства краіны. Мы не супраць, калі нам падказваюць. Але яшчэ раз падкрэсліваю, што мы будзем ствараць усе ўмовы, каб захоўваць стабільнасць і кіруемасць у краіне. Гэтыя выбары мы робім для сябе, для нашага народа, для ўнутранай палітыкі нашай краіны. І калі сітуацыя не была дэстабілізавана, усё павінна адпавядаць Канстытуцыі Беларусі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Выбары павінны быць сумленнымі, справядлівымі і адкрытымі. І калі законы краіны трэба для гэтага палепшыць, то зрабіць гэта неабходна аператыўна, лічыць ён. «Мы ўжо сёння павінны прыняць прынцыповае рашэнне наконт гэтага. Пажадана, каб наш парламент ужо на гэтай сесіі правёў адпаведныя папраўкі ў нацыянальнае заканадаўства, і звесткі аб іх былі своечасова даведзены да выбаршчыкаў», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

Асаблівая ўвага на нарадзе была ўдзелена наступным прапанаваным новаўвядзенням. Па-першае, фарміраваць выбарчыя камісіі (акрамя Цэнтрвыбаркама) так, каб не менш за трэць у іх складалі прадстаўнікі палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. «Я наогул не бачу па гэтым пытанні праблемы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Рашэнні прымае выканкам. Ідзіце ў выканкам, там вас уключаць у выбарчыя камісіі. Але сілай прымушаць — маўляў, у такойсьці камісіі палавіну або трэць павінны складаць прадстаўнікі палітычных партый — не трэба».

СТАР. 2

ШКОЛЬНЫЯ ДВАЙНЯТКІ

Дзіяна і Яніна ГОЛЬКІНЫ — вучаніцы другога класа Мсціслаўскай сярэдняй школы № 2. «Сястрычкі са шматдзетнай сям'і старанна вучацца, клапоцяцца адна пра адну, сябруюць між сабой і з аднакласнікамі, — кажа пра гэтую двойню іхняя настаўніца Вера Віктараўна Длюгава.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падзея

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ПРЭСА

**Павелічэнне якасці і канкурэнтаздольнасці — гэта надзённая задача не толькі для прамыславікоў, але і для журналістаў.**

У Магілёве прайшоў рэспубліканскі семінар па пытаннях інфармацыйнага забеспячэння сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. У ім бралі ўдзел кіраўнікі дзяржаўных СМІ і ідэалагічных службаў, а таксама прадстаўнікі міністэрстваў — усяго каля 200 чалавек.

Семінар пачаўся 9 лістапада ў Шклоўскім раёне, а ўчора прадоўжыўся ў абласным цэнтры ў зале пасяджэнняў Магілёўскага аблвыканкама.

**Міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ** адзначыў, што патрабаванні да супрацоўнікаў СМІ ўзраслі: ад іх артыкулаў і праграм чакаюць аператыўнасці, актуальнасці, цікавай падачы. «У найбліжэйшы час мы павінны прыкласці максімум намаганняў да таго, каб нашы выданні выглядалі годна і канкурэнтаздольна на рынку СМІ, а тэзіс аб барацьбе літаральна за кожнага чытача павінен стаць аксіёмай у працы», — сказаў міністр.

**Намеснік кіраўніка беларускага ўрада Уладзімір ПАТУПЧЫК** расказаў на семінары пра прыярытэтныя кірункі развіцця сацыяльнай сферы. Па яго словах, антыкрызісныя меры дазволілі пазбегнуць абвалу ў эканоміцы Беларусі і сацыяльнай напружанасці. Захаваны працоўныя калектывы, сітуацыя на рынку працы падкантрольная, рэальныя даходы людзей не паменшыліся, бюджэт захаваў сацыяльную накіраванасць.

Што датычыцца прэсы, то ў краіне рэалізуюцца праграма па перааснашчэнні рэдакцый. І разам з тым, **ад дзяржаўных СМІ чакаюць павелічэння ўдзельнай вагі ўласных даходаў.** Уладзімір Патупчык паведаміў, што фінансава-эканамічнае становішча рэгіянальнай прэсы паляпшаецца. У 2000 годзе ў краіне ўсяго было 10 рэдакцый, якія працавалі з прыбыткам. А сёлета іх колькасць павялічылася да 40.

Перад сродкамі масавай інфармацыі ставяць задачу: ва ўмовах абмежаваных сродкаў нельга страціць якасць, трэба ісці ў нагу з часам, сачыць за сучаснымі тэндэнцыямі. Таму разам з пытаннямі ўдзельнікаў семінара да Уладзіміра Патупчыка пра свабодныя цэны, пенсіі і працаўладкаванне актуальна прагучала і наступнае: **як друкаваным выданням можна выжыць у канкурэнцыі з электроннымі СМІ?** Ёсць прагнозы, што апошнія праз 10-15 гадоў выцесняць газеты з рынку інфармацыі.

— У свеце ўсё цячо і развіваецца, і трэба адэкватна рэагаваць на выклікі часу, — выказаў сваё меркаванне намеснік прэм'ер-міністра. — Вам, прафесіяналам, трэба меркаваць, якія захады дазволяць павялічыць канкурэнтаздольнасць друкаваных выданняў. Трэба быць цікавымі сваім чытачам, асвятляць актуальныя тэмы, арыгінальна іх падаваць і адчуваць адказнасць перад грамадствам і краінай.

Некалькі прамоў на семінары выступоўцы прысвяцілі **эканамічным праблемам і ўплыву на беларускую эканоміку сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу.** Наўздагон сацыёлагі нагадалі, што менавіта эканамічныя змены з'яўляюцца рухавіком сацыяльных узрушэнняў. Паводле даследаванняў, жыхары Беларусі сёлетняй восенню маюць ужо менш негатыўных настрояў, чым на пачатку года. Але ўсё ж занепакоеных эканамічным крызісам і яго наступствамі вельмі шмат.

Сацыёлагі пераконваюць журналістаў, што сацыяльную заклапочанасць у людзей выклікаюць не толькі асабістыя праблемы, але і трывожныя пагалоскі, чуткі. Гэта выявілася і ў апошняй сітуацыі з усплёскам захваральнасці на грып. Таму аб'ектыўная інфармацыя, аператыўна пададзеная ў СМІ, дазваляе людзям ведаць праблемы і спосабы іх вырашэння, арыентавацца ў сітуацыі і не паддавацца панічным настроям.

Сацыёлагі таксама адзначаюць імклівы **рост папулярнасці інтэрнэт-медыяў.** Калі яшчэ на пачатку 2000-х гадоў толькі 0,3 % людзей даведваліся пра тыя ж эканамічныя навіны праз інтэрнэт, то цяпер гэта лічба павялічылася да 19,6 %. Таму нездарма на семінары абмяркоўваліся і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ў сферы СМІ, развіццё інтэрнэт-сайтаў друкаваных выданняў.

**Міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ** нагадаў удзельнікам семінару пра важнасць падпісной кампаніі на 2010 год. Ён заклікаў не дапусціць зніжэння падпіскі.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ААТ «ГРОДНА АЗОТ»: у цяжкім становішчы, але з разуменнем, што рабіць

Антыкрызісная эканоміка

## Новы кіраўнік хімічнага гіганта спадзяецца вырашыць існыя праблемы з дапамогай усяго калектыву

**РОЗНЫЯ варыянты ўдзелу расійскіх структур у кіраванні гродзенскім «Азотам», і перш за ўсё «Газпрама» як галоўнага пастаўшчыка сыравіны, як кажуць, на слыху ўжо даўно. І таму, калі сёлета ў жніўні прадпрыемства ўзначаліў расіянін Ігар Жылін, у горадзе над Нёманам, ды і, пэўна, сярод саміх азотчыкаў адразу ж загаварылі, што зроблены першы крок у гэтым кірунку. У тым ліку і з трывогай, што магчыма скарачэнне кадраў, сацыяльных гарантый.**

**Сапраўды, гэта нетыпова для нашых рэалій, што адным з найбуйнейшых і, па вялікім рахунку, нягледзячы на акцыянерны статус, дзяржаўных прадпрыемстваў краіны кіруе прадстаўнік саюзнай, братняй, але ўсё ж цяпер іншай дзяржавы.**

**Што ж стаіць за прыходам расійскага спецыяліста да «руля» ААТ «Гродна Азот»? Менавіта такім было першае пытанне карэспандэнта «Звязды» да Ігара Жыліна, які, дарэчы, адразу ж згадзіўся на інтэрв'ю — без, як здараецца ў журналісцкай практыцы, папярэдніх пытанняў і загадзя падрыхтаваных адказаў.**

Фота Барыса ПРАКОПЧЫКА.

— Ведаеце, я ніколі не лічыў Беларусь замежнай дзяржавай і толькі тут пачуў такія да мяне звароты, што з Расіі нейкі замежнік прыехаў. Гэта мяне нават некалькі шакіруе, бо, паўтаруся, я ў прынцыпе ніколі не задумваўся, што Беларусь і Расія — гэта дзве розныя дзяржавы.

Што ж датычыцца вашага пытання... Вядома ж, гэта не азначае прыход нейкага капіталу, пакуль ні ў якай ступені. Па ініцыятыве кіраўніцтва рэспублікі год таму я быў запрошаны даць ацэнку работы прадпрыемства «Гродна Азот» і тады ўбачыў некалькі параметраў, якія насцярожылі. Гэта, па-першае, буйныя інвестыцыйныя ўкладанні без пацвярджэння рэсурсамі. І другое — без пацвярджэння дакладнай аддачы ад іх. Ці будзе эфект? Такой рэальнай аналітыкі не было. І кідацца ў такія нетры толькі дзеля паказчыкаў — гэта, на мой погляд, небяспечны эксперымент. Бо калі мы ўклалі грошы, нешта набылі, то павінны ведаць, калі гэтыя сродкі вернуцца. Тым больш што гэтыя грошы ўкладзены не сабе ў хату на мэблевы гарнітур.

У нас была даволі сур'ёзная спрэчка. Калі кіраўнікі прадпрыемства сцвярджалі, што яны цалкам выконваюць усе паказчыкі інвестыцыйнай праграмы, то маё сцвярджэнне было ўразрэз гэтаму. Я казаў, што гэту праграму і выконваць не трэба, бо яна яшчэ сур'ёзна не асэнсаваная. Так, можна ўкласці грошы, выканаць паказчык, але ці дасць ён аддачу? А калі не дасць, то скажыце, навошта гэты паказчык?

СТАР. 5

**НАША ДАВЕДКА.**

*Ігар Жылін нарадзіўся ў 1941 годзе, закончыў Томскі політэхнічны інстытут па спецыяльнасці «хімічнае машынабудаванне» і з таго часу працуе ў хімічнай прамысловасці. Першае месца працы — азотна-тукавы завод у Вахшы (Таджыкістан). Затым — Наваі (Узбекістан) , Роўна (Украіна), Чарапавец і Варонежская вобласць (Расія), шэраг кампаній ад «Газпрама», Руставі (Грузія)... Дарэчы, у маладосці напісаў з Вахша ліст у Гродна, дзе тады будаваўся завод па аналагічнай з Таджыкістанам схеме, з просьбай аб працаўладкаванні. Але яму ветліва адказалі, што ў такіх спецыялістах патрэбы не маюць. І вось цяпер такая патрэба з'явілася.*

## БОЛЬШ ЯК 15500 БОЕПРЫПАСАЎ

было здадзена добраахвотна насельніцтвам краіны з 2 па 6 лістапада ў ходзе аператыўна-прафілактычных мерапрыемстваў «Арсенал». Жыхары краіны самі здалі 261 адзінку незарэгістраванай зброі і 838 зарэгістраваных «ствалоў». Насельніцтва ахвотна адклікнулася на акцыю. У прыватнасці, жыхар Гродна, які ўбачыў буклет «Не — зброі, якая незаконна захоўваецца», прынёс у міліцыю «ППС-43» і 166 патронаў, што знайшоў пры разборцы хлява. Разам з тым, у выніку спецмерапрыемстваў за розныя парушэнні ў краіне было канфіскавана 135 адзінак незарэгістраванай зброі, крыху менш за 3,5 тысячы боепрыпасаў і 7 выбуховых прыстасаванняў. За незаконныя дзеянні ў адносінах да зброі, боепрыпасаў і выбуховых прыстасаванняў узбуджана 7 крымінальных спраў і выяўлена 478 парушэнняў адміністратыўнага заканадаўства.

**Ігар ГРЫШЫН.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ КОМИССИИ ПО РАБОТЕ С ИМУЩЕСТВОМ, ОБРАЩЕННЫМ В ДОХОД ГОСУДАРСТВА, ПРИ БОРИСОВСКОМ РАЙИСПОЛКОМЕ**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства имущества, расположенного по адресу: **Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 78** в составе: **Лот № 1:** изолированное помещение № 1, общ. пл. 62,7 кв.м. Начальная цена – 25 037 000 бел. рублей. **Лот № 2:** изолированное помещение № 2, общ. пл. 134 кв.м. Начальная цена – 51 038 000 бел. рублей. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **11.12.2009 г.** в 15.00 по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.12.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 324.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

**Извещает о проведении аукциона по продаже недвижимости 25 ноября 2009 г.**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Продавец | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение № 3 | г. Гомель, ул. Циолковского, 121 | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Советского района г. Гомеля | Изолированное помещение – 2-й этаж в двухэтажном кирпичном здании. Общая площадь изолированного помещения 1214,4 кв.м | 814 623 280 | 81 000 000 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 24 ноября 2009 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Дата, время, место, проведения аукциона** | **25 ноября 2009 г. в 11.30** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления залога** | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |
| **Условие продажи** | Без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс)**

## Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 538

### АБ ЗВАЛЬНЕННІ Ў ЗАПАС ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ТЭРМІНОВАЙ ВАЕННАЙ СЛУЖБЫ, ЯКІЯ ВЫСЛУЖЫЛІ ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ТЭРМІНЫ ВАЕННАЙ СЛУЖБЫ ПА ПРЫЗЫВУ, І ПРЫЗЫВЕ ГРАМАДЗЯН НА ТЭРМІНОВУЮ ВАЕННУЮ СЛУЖБУ Ў КАСТРЫЧНІКУ—СНЕЖНІ 2009 Г. І СТУДЗЕНІ—ЛЮТЫМ 2010 Г.

*(Вынятка)*

1. Звольніць у запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву.

2. Прызваць у кастрычніку—снежні 2009 г. і студзені—лютым 2010 г. на тэрміновую ваенную службу грамадзян Рэспублікі Беларусь мужчынскага полу, якім да дня прызыву споўнілася 18 гадоў і якія не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву, а таксама грамадзян прызыўнога ўзросту, якія страцілі права на адтэрміноўку.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласным, Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам забяспечыць выкананне мерапрыемстваў, звязаных з прызывам грамадзян на тэрміновую ваенную службу, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

4. Міністэрству абароны да 1 сакавіка 2010 г. накіраваць прызваных на тэрміновую ваенную службу грамадзян ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Рэспублікі Беларусь у міраваны колькасці згодна з дадаткам*.

5. Устанавіць, што пацярпелыя ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС грамадзяне, прызваныя на тэрміновую ваенную службу, накіроўваюцца ў воінскія часці і фарміраванні, якія не знаходзяцца на радыеактыўна забруджаных тэрыторыях, і назначаюцца на воінскія пасады, не звязаныя з работамі па эксплуатацыі крыніц іанізуючага выпрамянення, звышвысокіх частот і з кампанентамі ракетнага паліва.

6. Дзяржаўнаму аб'яднанню «Беларуская чыгунка» забяспечыць па заяўках Міністэрства абароны, іншых дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, перавозку ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву, і грамадзян, прызваных на тэрміновую ваенную службу.

7. Ваенным камісарам на падставе адпаведных рашэнняў раённых (гарадскіх) прызыўных камісій накіроўваць у органы пракуратуры матэрыялы на грамадзян, якія ўхіліліся ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, для прыцягнення іх да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

8. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 20 красавіка 2010 г. прадставіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь інфармацыю аб выніках прызыву грамадзян на тэрміновую ваенную службу.

9. Гэты Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

* Дадатак — для службовага карыстання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**

*9 лістапада 2009 г.*
*г. Мінск.*

# ПЕНСІЯ ЗАРПЛАТУ НЕ ЗАМЕНІЦЬ

## КОЛЬКАСЦЬ ІНВАЛІДАЎ, ЯКІЯ ШУКАЮЦЬ ПРАЦУ, ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ БОЛЬШ ЧЫМ УТРАЯ

**АБМЕЖАВАНЫЯ магчымасці — яшчэ не значыць абмежаваныя патрэбы. І ў тым ліку ў сродках. Так, не сакрэт, што ў кожнага інваліда заўсёды існуе варыянт пенсіі. Але ёсць і факт іншы: сёння «на групе» знаходзіцца больш за паўмільёна грамадзян Беларусі. Прычым іх значная частка можа і, галоўнае, хоча працаваць.**

### Ці трэба вёсцы гардэробшчык?

Статыстыка сведчыць, што колькасць інвалідаў у працаздольным узросце пакрысе змяншаецца. Тым не менш ад значных і часам нечаканых праблем са здароўем у самым росквіце сілаў не застрахаваны нікто. Сапраўды, само па сабе прызначэнне «групы» з'яўляецца законнай падставай для звальнення толькі ў адным выпадку — калі заставацца на ранейшым месцы забараняюць медыкі. Але здараецца і такое. Некаторыя наймальнікі проста чакаюць, калі ў інваліда закончыцца тэрмін кантракта. А потым лічаць за лепшае «развітацца».

Пэўныя гарантыі на працяг працоўнай дзейнасці тут існуюць толькі для тых, хто атрымаў вытворчую траўму. Усім астатнім даводзіцца пачынаць з «нуля». Пры гэтым цяжкасці з новым уладкаваннем могуць з'явіцца ўжо на першым этапе. Патрабаванне прадставіць працоўныя рэкамендацыі ад урачоў, безумоўна, слушнае — чалавек павінен выконваць работу, якая не нашкодзіць яго здароўю. Аднак падбор «прымальных вакансій» — тэма іншая. Гэта на Захадзе інваліда, з улікам яго асаблівасцяў, могуць метадычна «тэсціраваць» на розных месцах, пакуль у рэшце рэшт не знойдзецца варты варыянт. У нас жа часта ўсё зводзіцца да стандартнага трохкутніка «вахцёр-вартаўнік-гардэробшчык». Вось толькі дзе знайсці «лішнюю» пасаду таго ж вахцёра ў невялікім горадзе або ў вёсцы — невядома.

— Даведка медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі з'яўляецца ці не адзінай «дадатковай» умовай для працаўладкавання інваліда, — кажа **загадчык юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір ШЭЛКОВІЧ.** — А вось асаблівасцяў занятасці тут нашмат больш. Заканадаўства прадугледжвае, што інвалідам нельга вызначыць выпрабавальны тэрмін, чалавека з абмежаванымі магчымасцямі без яго згоды немагчыма накіраваць у службовую камандзіроўку, прыцягнуць да начных і звышурочных работ, а асноўны водпуск супрацоўніка на «групе» складае не 24, а 30 каляндарных дзён. Больш за тое, інваліды I і II груп маюць права на скарочаны рэжым: яны працуюць па 35 гадзін у тыдзень з аплатай у такім жа памеры, што і работнікам пры поўнай норме занятасці.

### «Прыватнік» убаку

Працоўныя льготы — рэч неабходная. І разам з тым калі-нікалі перашкодай для ўладкавання становяцца менавіта яны. Абавязковага патрабавання да наймальнікаў даваць пісьмовыя тлумачэнні адмовы прыёму інваліда на працу няма. Што ж да жадання працадаўцаў, то тут даволі паказальна: спробы карэспандэнта «Звязды» пацікавіцца вакансіямі ў шэрагу буйных кампаній сталіцы і ў кадравых агенцтвах прынеслі нулявы вынік.

Па сутнасці не змянілі малюнак і звароты ў дробныя фірмы. Некаторыя прапановы (напрыклад, аператара на хатнім тэлефоне, кур'ера ці расклейшчыка абвестак) з іх боку насамрэч ёсць, але — у вельмі абмежаванай колькасці. Адсюль можна зрабіць выснову: прыватны сектар для інвалідаў застаецца практычна зачыненым.

— На жаль, гэта сапраўды так, цікавасць да супрацоўнікаў з абмежаваннямі па здароўі вельмі нізкая,— заўважае кансультант галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанна Шчэмелева. — Прычым самае дзіўнае, што стымулы для ўладкавання гэтай катэгорыі ёсць. І гаворка не толькі аб падатках — напрыклад, пры накіраванні чалавека на «групе» на адаптацыю ў арганізацыі ёсць магчымасць тэрмінам да года атрымліваць са сродкаў садзейнічання занятасці кампенсацыю на выплату зарплаты інваліду. Па сутнасці ў такім выпадку цэлы год работнік-інвалід становіцца для наймальніка «бясплатным». Аднак сцвярджаць, што гэтай магчымасцю ў нас карыстаюцца актыўна, не выпадае. Бо хтосьці з наймальнікаў элементарна не ведае заканадаўства. А хтосьці проста не хоча мець «лішніх клопатаў».

### Пачынаць ніколі не позна

І ўсё ж што рабіць непасрэдна інваліду, які хоча працаваць, мае дазвол медыкаў, але не можа ўладкавацца? Шляхоў тут нібыта шмат, ад размоў з сябрамі-суседзямі да пошукаў вакансій у інтэрнэце. І ўсё ж ці не самы перспектыўны напрамак — зварот у раённую службу занятасці. І, да слова, толькі з пачатку гэтага дзесяцігоддзя колькасць такіх зваротаў павялічылася ў 3,5 раза.

— З улікам нізкай канкурэнтаздольнасці на рынку працы інвалідаў для іх уладкавання вызначаецца спецыяльная броня, — кажа Жанна Шчэмелева. — Прычым гэта справа знаходзіцца пад асаблівым кантролем. Так, невыкананне наймальнікам абавязкаў па стварэнні працоўных месцаў для грамадзян, што маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы, вядзе да штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь. І зноў-такі штраф ад 20 да 50 базавых велічынь пагражае службовым асобам, якія неабгрунтавана адмаўляюць у прыёме на працу інваліду, які быў накіраваны на ўладкаванне ў арганізацыю за кошт спецыяльнай броні.

Так, магчымасці рэгіёнаў тут далёка не аднолькавыя, розныя і прапановы па зарплаце: дзесьці яна абмяжоўваецца ўсяго «мінімалкай», а дзесьці — перавышае мільён рублёў. Аднак, лічаць у міністэрстве, шанцы ў рэшце рэшт атрымаць месца ўсё ж ёсць. Праўда, часта не меншую ролю ў гэтым плане адыгрывае ўзаемнае імкненне ісці на кампраміс.

— Практыка паказвае, што ці не асноўнай перашкодай для ўладкавання становіцца адсутнасць спецыяльнасці, прымальнай для інваліда і адначасова — патрэбнай у канкрэтным горадзе або раёне, — адзначае Жанна Шчэмелева. — Безумоўна, змяняць від дзейнасці, асабліва ў 40 ці 50 гадоў, заўсёды складана. Але калі наступае інваліднасць, часта нічога не застаецца. Трэба вучыцца ці перавучвацца, прычым з аглядкай на кан'юнктуру мясцовага рынку. І тут таксама нельга скідваць з рахунку службы занятасці. Яны могуць не толькі накіраваць у навучальную ўстанову, але і аплаціць выдаткі на праезд і пражыванне, выплачваць стыпендыю.

Новая прафесія зусім не абавязкова будзе прэстыжнай і высокааплатнай — магчыма, давядзецца асвоіць работу цырульніка, фатографа ці майстра па рамонце абутку. Але больш важна, што гэтыя заняткі могуць даць зарплату і стаж. У выніку ж у многіх з'яўляецца магчымасць пераходу з пенсіі па інваліднасці на працоўную пенсію. А ў большасці выпадкаў гэта, як кажуць, ужо іншыя грошы.

**Сяргей ГРЫБ.**

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.11.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 710,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 059,04 |
| 1 латвійскі лат | 5 726,36 |
| 1 літоўскі літ | 1 176,27 |
| 1 чэшская крона | 159,22 |
| 1 польскі злоты | 964,72 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 94,30 |
| 1 украінская грыўня | 330,89 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 28,7391 |
| UAH | 35,0050 |
| 1000 BYR | 10,5853 |
| EUR | 43,0742 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# Беларусь і Азербайджан павінны давесці аб'ём узаемнага гандлю да $500 млн

Беларусь і Азербайджан павінны давесці аб'ём узаемнага гандлю да паўмільярда долараў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 лістапада ў інтэрв'ю азербайджанскаму інфармацыйнаму агенцтву Trend News.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што, нягледзячы на дзесяціразовае павелічэнне тавараабароту за апошнія 5 гадоў, яго аб'ём у суме крыху больш як $100 млн не адпавядае таму патэнцыялу, які ёсць у дзвюх дзяржаў.

«Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва трэба пашыраць, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Нам трэба рухацца тут хутчэй, трэба даводзіць яго да паўмільярда».

Ён таксама падкрэсліў, што калі азербайджанскі рынак не мае патрэбы ў такой колькасці беларускай прадукцыі, то там неабходна стварацьсумесныя вытворчасці і гандляваць з Азербайджана з трэцімі краінамі, што дзяржавы сёння паспяхова і робяць.

**БЕЛТА.**

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ РОДНЫМ І БЛІЗКІМ ІГАРА СТАРЫГІНА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і блізкім заслужанага артыста Расіі Ігара Старыгіна ў сувязі з яго смерцю.

«Гэта быў чалавек шматграннага таленту і велізарнага асабістага абаяння, які ўмеў ствараць незабыўныя вобразы герояў розных лёсаў і гістарычных эпох, захапляючы бляскам свайго даравання і майстэрства. Фільмы з удзелам Ігара Старыгіна ўвайшлі ў залаты фонд савецкага і расійскага кінематографа і заваявалі ўсенароднае прызнанне», — гаворыцца ў спачуванні.

«Для беларускіх гледачоў Ігар Уладзіміравіч назаўсёды застанецца адным з самых папулярных і любімых акцёраў, чыя творчасць несла людзям радасць і дабро, садзейнічала ўмацаванню дружбы і культурных сувязяў паміж народамі», — адзначыў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Ва Урадзе

# «ЧЫСТАЯ ВАДА» «ПАЦЯЧЭ» Ў АГРАГАРАДКІ І ВЁСКІ

**Праблемы, звязаныя з забеспячэннем беларусаў чыстай пітной вадой, абмяркоўваліся ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага. Быў разгледжаны не толькі ход выканання дзяржаўнай праграмы «Чыстая вада» на 2006—2010 гады (прадугледжваецца забяспечыць якасць пітной вады ва ўсіх гарадах, раённых цэнтрах і пасёлках гарадскога тыпу), але і перспектывы па паляпшэнні крыніц вады паўсюдна, дзе жывуць людзі.**

Што датычыцца рэалізацыі гэтай праграмы, то за чатыры гады, было адзначана на пасяджэнні, шмат што ўжо зроблена і застаецца літаральна год, каб насельніцтва ва ўсіх гарадах і пасёлках краіны спажывала толькі якасную ваду. Сёлета, напрыклад, запланавана будаўніцтва 105 аб'ектаў, у тым ліку ўвод 48. Паводле інфармацыі **міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзіміра БЕЛАХВОСТАВА,** па выніках дзевяці месяцаў, у эксплуатацыю ўведзена пакуль 13. Гомельская вобласць гадавое заданне выканала, а вось у Мінскай і Віцебскай уведзена па 3 аб'екты, па 2 — у Магілёўскай і Мінску, 1 — у Гродзенскай. Нягледзячы на тое, што да новага года часу засталося не так ужо і шмат, міністр упэўнены, што ўсе прадугледжаныя на 2009 год мерапрыемствы будуць выкананыя. Што, між іншым, пацвердзілі кіраўніку Урада і прадстаўнікі тых аблвыканкамаў, дзе своечасовае ўвядзенне аб'ектаў выклікае сумненні. У прыватнасці, сярод праблемных згадваліся тры аб'екты ў Гродзенскай вобласці — ачышчальныя збудаванні ў Свіслачы, Лідзе і на РУП «Віцязь». У сваю чаргу прэм'ер Сяргей Сідорскі зрабіў акцэнт на тым, што пры выкананні праграмы на месцах павінны працаваць не толькі для «галачкі». «Трэба атрымаць вынік, даць людзям якасную чыстую ваду», — падкрэсліў ён.

А вось апошняе патрабаванне, паводле слоў **старшыні Камітэта дзяржкантролю Зянона ЛОМАЦЯ,** выконвацца не заўсёды. «У некаторых рэгіёнах станцыі абезжалезвання ўводзяцца, а якасць вады пагаршаецца», — заўважыў ён.

Гэтую праблему плануецца вырашаць паэтапна. Уладзімір Белахвостаў нагадаў, што праграма на 2006—2010 гады здымае пытанні забеспячэння якаснай вадой вялікіх і малых гарадоў, пасёлкаў гарадскога тыпу. Наступны ж этап рэалізацыі праграмы ахопіць аграгарадкі і вёскі, дзе, паводле яго слоў, існуе адна галоўная праблема — абезжалезванне вады. Цяпер, паведаміў міністр, распрацоўваецца праграма на 2011—2015 гады, якая дасць чыстую ваду і вёскам. На яе рэалізацыю патрабуецца каля 2 трыльёнаў рублёў, таму што давядзецца выканаць вялікія аб'ёмы работ. Нягледзячы на вялікі кошт будучай праграмы, ніякіх сумненняў не выклікае тое, што гэтая работа павінна быць зроблена. «Там, дзе спрацавала цяперашняя праграма, — кажа Уладзімір Белахвостаў, — якасць вады забяспечваецца і нараканняў ад людзей няма». У якасці прыкладу ён згадаў Жабінку, Шчучын, Клічаў і Клімавічы, дзе ў вадзе было павышанае ўтрыманне жалеза. Так, у Жабінцы да рэалізацыі праграмы ў вадзе ўтрыманне жалеза перавышала верхнюю мяжу ў тры разы, а цяпер складае толькі 0,3 мг. Як мяркуецца, канцэпцыя новай дзяржаўнай праграмы «Чыстая вада» на 2011—2015 гады будзе прадстаўлена ва Урад да канца гэтага года.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### НЕВЯДОМЫЯ САЛДАТЫ АПОШНЯЙ ВАЙНЫ

У Клімавіцкім раёне адбылося ўрачыстае перапахаванне парэшткаў пяці воінаў, якія загінулі ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета напрыканцы жніўня ў лесе паблізу вёскі Бліунг грыбнікі знайшлі косці, якія падаліся ім чалавечымі. Людзі звярнуліся ў раённы ваенкамат. Атрад 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна правёў раскопкі і знайшоў парэшткі 5 чалавечых шкілетаў, фрагменты амуніцыі, мноства стрэляных гільзаў. Імёны людзей, якія загінулі, невядомыя. Іх перапахавалі з пашанай у брацкую магілу ў вёсцы Свірэль. Там жа адбыўся мітынг памяці, праваслаўны святар адслужыў паніхіду.

**Ілона ІВАНОВА.**

# Аляксандр Лукашэнка адобрыў прапановы ЦВК па змяненні Выбарчага кодэкса

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па-другое, прапануецца спрасціць вылучэнне і рэгістрацыю кандыдатаў, у тым ліку дазволіць палітычным партыям вылучаць сваіх кандыдатаў ва ўсіх выбарчых акругах незалежна ад таго, ёсць там іх структуры або няма.

Па-трэцяе, прадаставіць кандыдатам права праводзіць масавыя мерапрыемствы па перадвыбарнай агітацыі ў паведамляльным парадку ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах, а таксама магчымасць ажыццяўляць сумесную агітацыю. «Тут таксама асаблівых праблем няма. Але давайце раз і назаўсёды дамовімся: дзе б гэта ні было — у Мінску, Мазыры, Бярозе або любым сельскім Савеце — ёсць спецыяльна адведзенае месца, і іншага месца быць не павінна ні для якіх партый. Там, калі ласка, праводзьце, загадзя інфармуйце, каб мы маглі гарантаваць бяспеку і парадак, але не дай бог кто-небудзь парушыць гэты парадак», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Па-чацвёртае, дазволіць стварэнне індывідуальных выбарчых фондаў, забяспечыўшы пры гэтым строгі кантроль за іх фарміраваннем і расходаваннем сродкаў. «Калі ў кагосьці ёсць грошы — калі ласка, няхай іх выкарыстоўвае», — сказаў Прэзідэнт.

Па-пятае, выключыць парог яўкі выбаршчыкаў, неабходны для прызнання, што выбары мясцовых Саветаў адбыліся. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што размова не ідзе аб прэзідэнцкіх выбарах. «На прэзідэнцкіх выбарах парог яўкі закранаць нельга, павінен застацца ранейшы мінімум: 50 працэнтаў выбаршчыкаў плюс 1 голас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Але пры гэтым майце на ўвазе: ацэнка дзейнасці мясцовых органаў будзе самая жорсткая — каб не было спробаў мясцовых уладаў самаўстараніцца ад правядзення выбарчай кампаніі», — дадаў ён.

Акрамя таго, прапануецца пашырыць правы наглядальнікаў, каб прадаставіць ім магчымасць аглядаць працэдуру падліку галасоў. «Але зноў жа я не бачу тут праблемы. У нас старшыня выбарчай камісіі на месцы вырашае, каго дапускаць да падліку галасоў, а каго не дапускаць. Таму любое прыняцце тут якога-небудзь жорсткага рэгламенту — гэта ўжо своеасаблівы націск і нівеліраванне таго падыходу, які сёння ў нас існуе, — лічыць Прэзідэнт. — Але, тым не менш, давайце абмяркуем і гэту прапанову».

У выніку доўгага і плённага абмеркавання практычна ўсе прапанаваныя змяненні былі адобраны ў тым варыянце, у якім былі падрыхтаваны Цэнтрвыбаркамам. Плануецца, што ўжо на наступным тыдні законапраекты са зменамі будуць унесены ў парламент і прыняты ў час бягучай сесіі Нацыянальнага сходу.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Пацверджана 128 выпадкаў інфіцыравання беларусаў свіным грыпам

**Калі меркаваць па змяншэнні на сталічных вуліцах і ў грамадскіх месцах колькасці людзей у медыцынскіх масках, то «градус напружанасці» ў нашым грамадстве, звязаны з распаўсюджваннем пандэмічнага грыпу, пачаў пакрысе зніжацца. У аптэках зніклі чэргі, праўда, і пытацца там пра арпетол ці аксалінавую мазь па-ранейшаму бессэнсоўна. Затое на аптэчных паліцах з'явіліся імунал і гропрынасін — нятанна, аднак для ўласнага здароўя грошай не пашкадуеш...**

Між іншым, учора Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр эпідэміялогіі і мікрабіялогіі распаўсюдзіў інфармацыю пра 128 лабараторна пацверджаных выпадкаў інфіцыравання беларусаў вірусам грыпу A/H1N1. Такім чынам іх колькасць павялічылася на 26 у параўнанні з мінулым тыднем. У Беларусі працягваецца правядзенне лабараторных даследаванняў па выяўленні вірусаў грыпу ў клінічных узорах ад пацыентаў з вострымі рэспіраторнымі захворваннямі. У Мінску ў панядзелак 9 лістапада па медыцынскую дапамогу звярнуліся 8697 чалавек з прастуднымі сімптомамі. Дыягназ «грып» быў пастаўлены 1180 разоў, ва ўсіх астатніх выпадках фігураваў дыягназ «ВРВІ». У стацыянары былі шпіталізаваныя 111 чалавек. За мінулыя выхадныя (суботу і нядзелю) у медыцынскія ўстановы сталіцы звярнуліся з прастудай больш як 9,6 тысячы мінчан, і 183 чалавекі былі шпіталізаваныя ў стацыянар. Увогуле за апошнія пяць дзён дыягназ «грып» усё радзей стаў з'яўляцца ў лістках непрацаздольнасці мінчан. Учора Міністэрства аховы здароўя Украіны паведаміла пра 174 памерлых у выніку свінога грыпу і вострых рэспіраторных захворванняў. Колькасць людзей, уцягнутых у эпідэмію, перавысіла ў нашых суседзяў ужо 1 мільён чалавек. Пра чацвёртую смяротную хвалю свінога грыпу ў расійскай сталіцы паведамілі і расійскія СМІ. Ад цяжкай формы грыпу, ускладненага пнеўманіяй, у дзіцячай інфекцыйнай бальніцы памерла маскоўская школьніца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# БЕНЕФІС РАДЗІВІЛАЎ У ДОМЕ ДРУЖБЫ

## Незвычайную вечарыну правяло ў Мінску таварыства «Беларусь-Польшча»

І нават не проста вечарыну, а сумоўе — так самі арганізатары акрэслілі фармат імпрэзы. Яе тэмай стаў Нясвіж і Радзівілы ў літаратуры і музыцы. Арганізатары вечара, таварыства «Беларусь-Польшча», не прагадалі з тэмай. Нават не паглыбляючыся ў роздумы, многія з нас згадаюць Радзівілаў, якія мелі дачыненне да літаратуры — Францішку Уршулю, Мікалая Крыштафа Сіротку, Рыбаньку, слынную мецэнатку беларушчыны Магдалену Радзівіл... Больш дасведчаныя людзі назавуць яшчэ Удальрыка Крыштафа, Юзэфа Мікалая, Ганну Алімпію, Кацярыну... Кажучы пра музыку, мы згадаем выдатнага кампазітара канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя Мацея Радзівіла, і, безумоўна, аўтара оперы «Фаўст» Антонія Радзівіла. Прычым лібрэта для таго «Фаўста», як вядома, напісаў сам Гётэ. А пасля пакінуў нататку ў сваім дзённіку: «Прыязджаў князь Радзівіл, паказаў мне музыку, пасля якой я зразумеў — «Фаўст» павінен быць на сцэне».

Вёў вечарыну ў Доме дружбы старшыня таварыства «Беларусь-Польшча» Анатоль БУТЭВІЧ, сталы аўтар і сябар нашай газеты.

— Вечар удаўся, і я вельмі цешуся з гэтага, — сказаў спадар Бутэвіч у інтэрв'ю «Звяздзе». — І мы назвалі яго «сумоўе», бо мусім дбаць пра больш шчыльнае супрацоўніцтва між нашымі краінамі, пра ўзаемаазнаямленне і пранікненне нашых культураў. Першую вечарыну мы прысвяцілі Радзівілам — а менавіта толькі аднаму аспекту іх дзейнасці. Бо насамрэч, калі браць гэты вялікі род, то яму можна прысвяціць шмат імпрэзаў. На сумоўі выступілі два перакладчыкі — Міхась Кенька і Леў Казлоў. Спадар Казлоў адначасова наш знакаміты картограф, які, дарэчы, стварыў найцудоўнейшы глобус для экспазіцыі адноўленага архіва-бібліятэкі Радзівілаў у замку. Выступленні былі аздобленыя чароўнымі мелодыямі ў выкананні дзяржаўнага калектыву старадаўняй музыкі «Пастараль». Яны выконвалі творы часоў Радзівілаў, а таксама саміх Радзівілаў, што асабліва захапіла гледачоў.

Вечарына атрымалася прадстаўнічай. З боку польскай амбасады выступіла дарадца амбасады — пані Эльжбета Шчэпаньска, якая выказала глыбокае задавальненне такой імпрэзай. І паабяцала, што амбасада Польшчы будзе ўсяляк спрыяць усім наступным мерапрыемствам, накіраваным на беларуска-польскае культурнае супрацоўніцтва. Прадстаўнік міністэрства культуры спадар Тадэвуш Стружэцкі зазначыў, што найважнейшае дасягненне апошняга часу ў гэтай галіне — аднаўленне сувязяў з нашчадкамі Радзівілаў.

— Пачатак гэтай працы быў пакладзены ў Польшчы, дзе я знаходзіўся на дыпламатычнай службе, а цяперашні міністр культуры спадар Павел Латушка быў амбасадарам Беларусі, — сказаў Тадэвуш Стружэцкі. — Тады гэтыя сустрэчы моцна ўсхвалявалі нас. І калі Радзівілы прыехалі ў Беларусь, гэта стала ключавым і сімвалічным момантам.

Спадар Бутэвіч прызнаўся, што да тэмы Нясвіжа і Радзівілаў мае даўні асабісты сантымент — сам нарадзіўся непадалёк ад гэтага слаўнага горада.

— З дзяцінства запомніў нават прымаўку, якую часам ужывалі бацькі, — згадаў спадар Бутэвіч. — Казалі: «Як захочаш у Нясвіж, цэлу ноччаньку не спіш». Значыць, каб патрапіць да якіх чыноўнікаў раніцай, трэба было ехаць туды яшчэ з ночы. І нашым «маленькім Парыжам» я захапляўся з дзяцінства, працягваю захапляцца і цяпер!..

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**

## Абзац

◢ Легендарны канструктар зброі Міхаіл Калашнікаў адзначыў свой 90-гадовы юбілей. Урачыстасці з гэтай нагоды прайшлі ў расійскім Іжэўску, дзе больш за паўвека жыве і працуе праслаўлены майстар зброі. Міхаіл Калашнікаў — генерал-лейтэнант, двойчы Герой сацыялістычнай працы, лаўрэат Ленінскай прэміі. Аўтамат АК, які ва ўсім свеце называюць па імені канструктара «Калашнікавым», дзякуючы сваёй папулярнасці ўнесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса.

◢ **ААТ «Цэнтр моды» 15 лістапада адчыніць у Мінску фірмовую краму плошчай каля 200 кв.м. Новая крама Avenue размесціцца ў гандлёва-забаўляльным цэнтры «Экспабел». У продаж паступіць увесь асартымент жаночага адзення, які выпускаецца Цэнтрам.**

◢ Гастраном «Цэнтральны», размешчаны ў цэнтры Буда-Кашалёва, быў абкрадзены невядомым, які змог схавацца ў краме падчас працоўнага дня і застацца на ноч. Цяпер гэта — асноўная версія знікнення выручкі з касы гастранома. Зламыснік узламаў тры касы крамы і скраў Br6 млн. Затым ён распілаваў унутраныя навясныя замкі на дзвярах склада і знік. Гастраном не быў абсталяваны сігналізацыяй і не ахоўваўся вартаўнікамі. Распачатая крымінальная справа.

◢ **Урач Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы абвінавачваецца ў шматразовым атрыманні хабару за выдачу фіктыўных бальнічных лісткоў. Раённая пракуратура распачала супраць яго крымінальную справу. Урач арыштаваны, вядзецца следства.**

◢ Цела зніклай жыхаркі Аршанскага раёна знойдзена пад падлогай яе ўласнага дома. Пошукі жанчыны 1941 г.н., што жыла ў вёсцы Пугляі, пачаліся ў лістападзе пасля звароту яе дачкі ў праваахоўныя органы. Цела было знойдзена закапаным у нежылой палове яе дома. Вынікі экспертызы паказалі, што прычынай смерці былі чэрапна-мазгавыя траўмы. Па падазрэнні быў затрыманы яе сын, 1960 г.н., які жыў разам з маці. Як высветлілі праваахоўнікі, п'яны сын у канцы кастрычніка моцна пабіў маці. На наступны дзень ён убачыў, што яна памерла ад пабояў, і закапаў цела.

## Поўны абзац

◢ **Люблінскі ўніверсітэт імя Марыі Складоўскай-Кюры (Усходняя Польшча) знайшоў спосаб прымусіць супрацоўнікаў адкрываць банкаўскія рахункі. Тыя, хто прыходзіць па зарплату ў касы, атрымліваюць яе манетамі. Па словах кіраўнікоў найбуйнейшай у Любліне ВНУ, цяпер больш за сто супрацоўнікаў універсітэта не адкрылі банкаўскія рахункі і атрымліваюць грошы ва ўніверсітэцкіх касах, што нявыгадна для навучальнай установы. Напрыклад, штомесяц даводзіцца наймаць ахоўнікаў для канваявання буйных сум грошай, плаціць банку за атрыманне наяўных, а таксама ўтрымліваць касіраў. У перспектыве ВНУ хоча адмовіцца ад выкарыстання папяровых грошай. Між тым, згодна з польскімі законамі, працадаўца не можа прымусіць працаўніка адкрыць рахунак у банку. Таму прынята рашэнне: супрацоўнікі, якія не рэагуюць на просьбы, атрымаюць зарплату манетамі. Так, сярэдняя зарплата МНС складае 1,5 тыс. злотых. Калі выдаць яе манетамі па 5 злотых, атрымаецца 3 банкаўскія пакеты агульнай вагой каля 2 кг. Кіраўнікі спадзяюцца, што супрацоўнікі, панасіўшы «цяжкую» зарплату, адкрыюць рахункі ў банках.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

### П'ЯНЫ ВАДЗІЦЕЛЬ ПАШКОДЗІЎ 13 АЎТАМАБІЛЯЎ

**У Магілёве 8 лістапада на праспекце Пушкіна адбылося незвычайнае дарожна-транспартнае здарэнне. Позням вечарам 33-гадовы жыхар абласнога цэнтра на «Жыгулях» так ліха праехаў па вуліцы, дзе былі прыпаркаваны чарадой аўтамабілі, што літаральна працарціў 12 з іх. На машынах засталіся драпіны і ўвагнутасці. Пашкоджаны і ўласны аўтамабіль віноўніка аварыі.**

Паводле інфармацыі аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ Магілёўскага аблвыканкама, вадзіцель быў нецвярозы, а яшчэ дакладней — прыстойна п'яны. Цяпер яму пагражае пазбаўленне правоў на 3 гады і значны штраф, а таксама давядзецца кампенсаваць страты на рамонт уладальнікам 12 аўтамабіляў.

**Ілона ІВАНОВА.**

# Пацыент звёў рахункі з жыццём

**Нечаканае здарэнне, усе акалічнасці якога цяпер высвятляюцца, адбылося ў сталічнай бальніцы, дзе пацыент наклаў на сябе рукі.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора горада Мінска Сяргей Балашаў, следчыя пракуратуры Маскоўскага раёна праводзяць праверку па факце самазабойства 75-гадовага пенсіянера ў палаце 9-ай клінічнай бальніцы. Пакуль дакладна невядома, што падштурхнула старога на крайні крок, чаму ён вырашыў звесці рахункі з жыццём. У бальніцы ж ён ляжаў у платнай палаце на шостым паверсе другога хірургічнага аддзялення. Знайшла цела пенсіянера медсястра, якая зазірнула ў палату каля чатырох гадзін раніцы: нябожчык павесіўся ў ванным пакоі на кабелі ад тэлевізара.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Крымінал, здарэнні

### ЗАМКНУЛА ПРАВОДКУ, ЛЮДЗЕЙ ЭВАКУЯВАЛІ

**У Віцебску ў жылым пяціпавярховым доме па праспекце Фрунзэ ў аднапакаёвай кватэры на чацвёртым паверсе замкнула электрычную праводку, жыльцоў з верхняга паверха эвакуявалі.**

Пажарныя, якія хутка прыбылі на месца здарэння, патушылі агонь у кватэры. Страта ад пажару — каля трох мільёнаў рублёў. Згарэў спальны гарнітур і іншая маёмасць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### РАСКРЫТЫ КРАДЗЕЖ ГРОШАЙ З БАНКАМАТА

**Злачынства ўчынілі жыхары Бранскай вобласці, якія цяпер затрыманыя ў Расіі.**

Крадзеж быў напрыканцы ліпеня ў памежных Клімавічах. Уначы ў бібліятэцы Клімавіцкага дзяржаўнага аграрнага каледжа невядомыя разбілі шкло, потым узламалі двое дзвярэй і атрымалі доступ да банкамата, які размяшчаўся ў гэтым будынку. З дапамогай газазваркі зладзеі раскрылі бакавую сценку банкамата і скралі 113 мільёнаў 290 тысяч рублёў.

У прэс-цэнтры Магілёўскага УУС паведамілі: злачынства ўчынілі два жыхары Бранскай вобласці — 1970 і 1960 гадоў нараджэння, раней ужо асуджаныя за крадзяжы. Цяпер яны арыштаваныя расійскай міліцыяй за аналагічныя клімавіцкаму злачынствы.

**Алена КАЗЛОВА.**

### НАБЫЎ — УКАЛІСЯ

**Асудзілі ўтрымальніка наркапрытона з Мікашэвічаў.**

37-гадовага жыхара горада Мікашэвічы і раней судзілі за захоўванне наркотыкаў. Адбыў пакаранне — і зноў за старое. Замест таго, каб зарабляць грошы законным шляхам, узяўся за выраб наркатычных сродкаў. Выраблялі, а пасля збываў ахвотным. Так, 7 студзеня ён прадаў аднаму з іх 3 мл ацэтыляванага опію, 17 студзеня — іншаму 0,5 мл. Пры гэтым пакупнікі абавязкова павінны былі ўвесці наркотык у вену ў прысутнасці прадаўца. Такімі былі яго ўмовы продажу.

Паводле слоў **старшага памочніка пракурора Брэсцкай вобласці Вольгі ДЗМІТРУК,** суд Лунінецкага раёна прыгаварыў мужчыну да 9 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Да асуджанага будзе прымянена прымусовае лячэнне ад наркаманіі. Прыгавор пакуль у законную сілу не ўвайшоў.

**Надзея ДРЫЛА.**

### ПАЦЯРПЕЛА ПАСАЖЫРКА АЎТОБУСА

**Пад вечар у Мінску было зафіксаванае дарожна-транспартнае здарэнне, у якое трапілі легкавы аўтамабіль і аўтобус МАЗ-103.**

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, а палове пятай 26-гадовы кіроўца аўтамабіля «Ровер», які рухаўся па вуліцы Гінтаўта, пры павароце на Шафарнянскую сутыкнуўся з аўтобусам, што ехаў у спадарожным напрамку. Не пашанцавала пасажырцы аўтобуса, якая ў выніку ДТЗ атрымала закрыты пералом галёнкі і была дастаўленая ў бальніцу. У гэты ж дзень на Мінскай кальцавой аўтадарозе п'яны пешаход трапіў пад колы аўтамабіля «Пежо». 28-гадовы пацярпелы вырашыў перабегчы праезную частку па-за пешаходным пераходам, ды не разлічыў сваіх сілаў: з закрытай ЧМТ лёгкай ступені і закрытым пераломам правай галёнкі ён таксама шпіталізаваны.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПАДПАЛІЎ СЯБЕ З-ЗА СВАРКІ З ЖОНКАЙ?

**У Браслаўскім раёне, у вёсцы Пагошча, мясцовы жыхар на верандзе свайго дома выліў на сябе два літры бензіну і паднёс запалку.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, гэты мужчына атрымаў моцныя апёкі — цацвёртай ступені (90 працэнтаў). Дарэчы, жонка, якая знаходзілася ў доме, калі пачула нейкі пах смаленага, паспяшалася на дапамогу. Убачыла свайго мужа, які ўвесь ляжаў літаральна ў агні на падлозе, і выліла на яго два вядры вады.

На «хуткай» мужчыну адвезлі ў рэанімацыю Браслаўскай цэнтральнай раённай бальніцы. Ёсць звесткі пра тое, што ён знаходзіўся ў нецвярозым стане. Мясцовыя міліцыянеры разбіраюцца з фактамі. Дом і маёмасць агонь не закрануў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### «НЕВЯДОМЫ» САНІТАР

**У хаце даяркі, якая пражывае ў в. Лунін Лунінецкага раёна, цэлы дзень знаходзіўся невядомы. Калі мужчына пад вечар пакінуў хату, то гаспадыня не знайшла сваіх грошай.**

На месца здарэння выехалі аператыўнікі і вызначылі, што «невядомым» быў санітар таго ж сельгаскааператыва, у якім працуе і даярка. Ён і ўкраў грошы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### І СТАЛА БЛАНДЗІНКАЙ...

**Сур'ёзнымі непрыемнасцямі скончылася для 23-гадовага гродзенца знаёмства з дзяўчынай у начным клубе. У выніку, паведамляе начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама Георгій Еўчар, заведзена крымінальная справа па артыкуле «Разбой».**

А пачыналася ўсё даволі рамантычна. Аднойчы вечарам малады чалавек успомніў пра новую сяброўку і набраў нумар яе мабільнага тэлефона. Дзяўчына пагадзілася на сустрэчу, якая і адбылася ў знятай на суткі кватэры па вуліцы Дамброўскага. Аднак у разгар вячэры там з'явіліся двое незнаёмцаў, якіх упусціла дзяўчына ў той момант, калі «каханы» знаходзіўся ў ваннай. Пасля чаго налётчыкі прычынілі яму некалькі раэнаых ранаў, а затым, прыставіўшы нож да горла, забралі грошы, дакументы і мабільны тэлефон.

Каля апоўначы пацярпелы паведаміў у міліцыю аб разбойным нападзе. Адзінае, што мелася ў распараджэнні супрацоўнікаў крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС, дык гэта агульныя прыкметы «нагляднага знаёмай дзяўчыны». Хлопец не мог нават назваць нумар яе мабільнага тэлефона, паколькі зламыснікі забралі яго сім-карту. Дапамог кваліфікавана праведзены экспертам-крыміналістам агляд месца злачынства: выяўленыя на фужэры адбіткі пальцаў супалі з «пальчыкамі» раней судзімай жыхаркі абласнога цэнтра. Праўда, на ўсіх фота і ў базе звестак валасы ў яе былі чорныя, а тут — бландзінка. Стала зразумела, што парык быў выкарыстаны зусім не выпадкова.

Праз некалькі гадзін аператыўнікі ўжо ведалі таксі, на якім з'ехалі злачынцы, а таксама маршрут іх руху. У кватэры аднаго са зламыснікаў (усе — раней судзімыя) тройцу і затрымалі. За разбойны напад ім пагражае да пятнаццаці гадоў пазбаўлення волі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ПАЦЯГНУЛА ДА РОДНАГА АЧАГА

Сярод белага дня суседзі заўважылі дым ад прыватнага дома ў вёсцы Отар Чачэрскага раёна. Адначасова з выклікам выратавальнікаў першае, што зрабілі, — выцягнулі з небяспечнага памяшкання 55-гадовага грамадзяніна, які не так даўно вярнуўся з лячэбна-працоўнага прафілакторыя і нідзе не працаваў. Як паведамляе прэс-служба Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, каб затушыць полымя, з Чачэрска і Кармы прывезлі 4 аўтацыстэрны. Ніхто і не заўважыў, што нецвярозы гаспадар дома вярнуўся да роднага ачага. Яго цела знайшлі ў тым жа месцы, адкуль толькі што выцягнулі...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ЯЛАВІЧЫНА Ў ЛЕСЕ

Падчас абследавання памежнай зоны супрацоўнікамі міліцыі, КДБ, КДК сумесна з памежнікамі ў лясным масіве каля в. Лелікава Кобрынскага раёна знайшлі 15 тушаў кароў. Хто там прыхаваў яловічыны на 20 млн, пакуль невядома.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### З ГАСПАДАРОМ ЗАСТАВАЎСЯ ДА КАНЦА

**У в. Дзераўная Баранавіцкага раёна загаръўся дом. Калі прыехалі пажарныя, то ў блочным будынку ўсё выгарала.**

Пасля абследавання пажарышча ў адным з пакояў знайшлі абгарэлы труп гаспадара, а каля яго, на падлозе, ляжаў мёртвы сабака.

Відавочна, ён заставаўся верным гаспадару да канца.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ГАЗ БЫТАВЫ ВЫБУХНУЎ, ДОМ ЗАГАРЭЎСЯ

**У вёсцы Дворышча Лепельскага раёна ў прыватным драўляным жылым доме з-за ўцечкі бытавога газу адбыўся выбух і потым пажар.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, пажарныя, якія прыбылі на месца, выратавалі з задымленага дома 81-гадовага гаспадара. Ён атрымаў апёкі, атруціўся чадным газам.

Вызначана самая верагодная прычына пажару — уцечка бытавога газу, які падаваўся з балона ёмістасцю 50 літраў да газавай пліты. Ад выбуху і пажару знішчаны дах дома, пашкоджаны столі, маёмасць.

Папярэдняя страта ад надзвычайнага здарэння — 6 мільёнаў рублёў. Выратавалі дабра на 4 мільёны рублёў.

### РТУЦЬ У ХЛЕБНІЦЫ

**У вёсцы Гілі Чашніцкага раёна гаспадар прыватнага дома знайшоў у хлебніцы ртуць.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях, мужчына наводзіў парадак у гаспадарчай забудове і ў металічнай хлебніцы знайшоў шкляную ёмістасць з-пад лаку для пазногцяў з вадкасцю, вельмі падобнай на ртуць. Выклікаў пажарных. Ім перадаў ёмістасць з 70 грамамі ртуці. Мяркуецца, што бутэльку з ртуццю схаваў у хлебніцы бацька гаспадара дома. Навошта?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома**
**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка | Целевое назначение | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | Расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, руб. | Дата и время проведения аукциона | Окончательный срок приема документов |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 221282913601000036, площадью 0,2291 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Топорино, ул. Полевая, 5 | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие центрального водоснабжения. Участок находится в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (оз. Княжное) | 498 752 | 49 800 бел. руб., р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО СБ «Беларусбанк», код банка 150801239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет | 2 026 415 | 503 359 | 14.12.2009 в 15.00 | 08.12.2009 г. до 17.30 |
| 2. | Земельный участок с кадастровым номером 221282913101000124, площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Суйково, ул. Новая, 13 | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие централизованного водоснабжения | 1 032 698 | 103 200 бел. руб., р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО СБ «Беларусбанк», код банка 150801239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет | 2 026 415 | 498 609 | 14.12.2009 в 15.00 | 08.12.2009 г. до 17.30 |
| 3. | Земельный участок с кадастровым номером 221282913101000123, площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Суйково, ул. Новая, 15 | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие централизованного водоснабжения | 1 033 368 | 103 300 бел. руб., р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО СБ «Беларусбанк», код банка 150801239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет | 2 026 415 | 498 609 | 14.12.2009 в 15.00 | 08.12.2009 г. до 17.30 |
| 4. | Земельный участок с кадастровым ном

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

11 лістапада 2009 г. № 36 (188)


## Летась — па 27, сёлета — па 6

**Летась сельскія выканаўчыя камітэты Міншчыны зарабілі 47 млрд рублёў. У асноўным — за кошт продажу зямлі з аўкцыёнаў. Ужо сёння без датацыі працуюць чатыры сельсаветы ў Мінскім раёне, два ў Лагойскім, горад Заслаўе.**

Аднак у многіх сельсаветах пярвічнага ўзроўню па-ранейшаму высокім застаецца працэнт датацыі. У некаторых доля ўласных даходаў не перавышае 15 працэнтаў бюджэту. Пра гэта расказала **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ** на адкрыцці выязнога практычнага семінара кіраўнікоў мясцовых прадстаўнічых органаў, арганізаванага Інстытутам дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Семінар прайшоў на базе Дзяржынскага раёна і быў прысвечаны пытанням фарміравання бюджэту базавага і пярвічнага ўзроўняў.

Дзяржынскі раён вылучаецца стабільнасцю эканомікі і якаснымі пераўтварэннямі ў прамысловасці і аграрным сектары. Бюджэт раёна фарміруецца за кошт уласнай даходнай базы, узровень датацыі нязначны (сёлета ён склаў усяго 5 працэнтаў). На тэрыторыі раёна размешчана 12 сельсаветаў, адзін пасялковы і адзін гарадскі.

Як паведаміў прысутным **старшыня Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль КАДЗЕТ**, дэпутатамі мясцовых Саветаў праводзіцца актыўная работа па прыцягненні індывідуальных прадпрымальнікаў і інвестараў для адкрыцця прадпрыемстваў у сельскай мясцовасці і стварэнні там новых працоўных месцаў. Дзякуючы агульным намаганням, цяпер у вёсках працуе 53 прыватныя прадпрыемствы самага рознага профілю (ад выпуску піларам і шклопакетаў да швейных вырабаў). На іх задзейнічана больш за 350 чалавек. Анатоль Кадзет звярнуў увагу на тыя абставіны, што, згодна з дзейным заканадаўствам, усе гэтыя прадпрыемствы пералічваюць падатковыя плацяжы ў раённы бюджэт. Для таго, каб больш зацікавіць сельскія выканкамы ў стварэнні прадпрыемстваў на сваёй тэрыторыі, Анатоль Кадзет прапанаваў пакідаць падаткі, якія выплачваюць навастворaныя прадпрыемствы, на першасным узроўні.

У раёне на працягу 2007—2009 гадоў праводзіцца работа па інвентарызацыі земляў. Старшынямі сельскіх Саветаў падрыхтавана 240 землеўпарадкавых спраў для продажу ўчасткаў, якія не выкарыстоўваюцца, на аўкцыёнах. Усяго за гэты час прададзена 211 участкаў (15 у 2007 годзе на суму 200 млн рублёў, 87 — у 2008-м на суму 926,2 млн, 109 — сёлета на суму 985,5 млн). Праведзеная работа дала магчымасць сфарміраваць выкананне бюджэтаў у сельскіх Саветах нават з перавышэннем.

Агульная сума бюджэтаў пярвічнага ўзроўню Дзяржыншчыны на гэты год — амаль 2,6 млрд рублёў. Выкананне за 9 месяцаў склала 100 працэнтаў, што дало магчымасць правесці шэраг значных работ па добраўпарадкаванні (абгарадзіць могілкі, адрамантаваць водаправоды і калодзежы, пабудаваць кантэйнерныя пляцоўкі для збору смецця, спілаваць аварыйныя дрэвы, ліквідаваць несанкцыянаваныя звалкі, правесці рамонт адміністрацыйных будынкаў шэрагу сельскіх Саветаў і г.д.) Значныя сродкі сельскіх выканкамаў былі зрасходаваны на добраўпарадкаванне аграгарадкоў Забалацце і Чэрнікаўшчына.

Старшыня Дзяржынскага раённага Савета адзначыў, што да добраўпарадкавання актыўна прыцягваюцца і жыхары раёна. Сіламі грамадзян і за іх уласныя сродкі толькі сёлета ўсталявана 9965 метраў агароджы.

Мясцовымі Саветамі праведзена работа па навядзенні парадку на зямлі. Дзякуючы актыўнаму ўдзелу дэпутацкага корпуса і старастаў населеных пунктаў, за 9 месяцаў гэтага года было сабрана і здадзена 327 тон металалому. Грошы ад яго рэалізацыі таксама былі накіраваны на добраўпарадкаванне.

Пасля прыняцця Указа № 21 і пашырэння правоў Саветаў у пытаннях землекарыстання значна пашырылася і даходная база бюджэтаў пярвічнага ўзроўню, што прывяло да зніжэння датацыйнасці. Паводле слоў **начальніка фінансавага аддзела Дзяржынскага райвыканкама Яўгеніі ЛІПНІЦКАЙ**, усе сельскія, пасялковы і гарадскі бюджэты Дзяржыншчыны з'яўляюцца датацыйнымі, але, пачынаючы з 2007 года, узровень датацыі адчувальна зніжаецца. Калі два гады таму ўласныя даходы сельвыканкамаў не перавышалі 26 працэнтаў (74 працэнты прыходзілася на датацыю), то ўжо праз год гэтыя суадносіны змяніліся: 41,2 і 58,8 працэнта адпаведна. За 9 месяцаў гэтага года ўласныя даходы ўзраслі да 65,6 працэнта, а датацыя скарацілася да 34,4.

Асноўнымі крыніцамі папаўнення сельскіх бюджэтаў з'яўляюцца даходы ад продажу зямельных участкаў праз аўкцыёны. Яны фарміруюць 70—75 працэнтаў даходнай базы сельвыканкамаў Дзяржыншчыны.

Аднак, падкрэсліла Яўгенія Ліпніцкая, не ва ўсіх выканкамаў пярвічнага ўзроўню ёсць магчымасць зарабляць грошы за кошт аўкцыёнаў, бо ў асобных сельсаветах — у залежнасці ад геаграфічнага становішча і наяўнасці інфраструктуры — зямельныя ўчасткі незапатрабаваныя. «Гэта ставіць сельсаветы ў няроўныя ўмовы, — адзначыла начальнік фінаддзела. — Напрыклад, Дзямідавіцкі сельскі Савет сёлета ад продажу зямельных участкаў атрымаў 237 млн, Дабрынёўскі — 219 млн, Рубілкоўскі — 182, Фаніпальскі сельскі Савет — 180 млн. У той час як Негарэльскі сельскі Савет зарабіў усяго 8 млн, Бараўскі — 22 млн. Гэта ставіць выканкамы ў няроўныя ўмовы. Таму было б мэтазгодна сродкі, зароблены на аўкцыёнах, не цалкам пакідаць у распараджэнні канкрэтнага сельскага Савета, а 50 працэнтаў накіроўваць у раённы бюджэт для далейшага размеркавання ў выглядзе датацый іншым сельскім Саветам...»

Яўгенія Ліпніцкая падкрэсліла, што для павышэння даходнасці і збалансаванасці бюджэтаў неабходна мець **стабільную даходную крыніцу**, якая павінна забяспечыць рэгуляванне бюджэтаў кожнага сельскага Савета. Яна прапанавала заканадаўча замацаваць за сельскімі Саветамі ў якасці такой рэгулюючай крыніцы адлічэнні ад падаходнага падатку, які выплачваецца з заробку работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый, размешчаных на тэрыторыі сельскіх Саветаў. Такая мера адназначна забяспечыць бездатацыйнасць сельскіх бюджэтаў.

Асноўнымі крыніцамі папаўнення бюджэту Станькаўскага сельвыканкама з'яўляюцца зямельны падатак, падатак на нерухомасць, дзяржпошліна, даходы ад арэнды памяшканняў, але самай важкай ужо не першы год застаецца продаж зямлі з аўкцыёнаў.

— Мы ўжо тры гады бяром удзел у аўкцыёнах, — расказвае **старшыня Станькаўскага сельскага Савета Людміла ШЫШКО**. — Першы правялі яшчэ ў 2007 годзе. Пробныя аўкцыёны, можа, былі і не вельмі ўдалымі, але ж і яны прынеслі ў бюджэт сельвыканкама 55 млн рублёў. Летась мы ўжо актыўна ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы ўчасткаў на продаж. Гэта не значыць, што мы «выхоплівалі» зямлю недзе ў полі. Усе ўчасткі, якія прадаюцца ў нас на аўкцыёнах, размешчаны ў межах населеных пунктаў. Мы проста робім «зачыстку» земляў, якія не выкарыстоўваюцца.

У 2008 годзе было падрыхтавана на продаж 37 участкаў, прададзена — 26 (што прынесла нам 248 млн руб.). За 9 месяцаў гэтага года ўсіх даходаў у бюджэт сельвыканкама паступіла 167 млн, з іх — 134 млн ад продажу зямлі. Гэта значыць, што нашы ўласныя даходы складаюць больш за 80 працэнтаў. Леташнія нашы даходы не параўнаць з сёлетнімі. Год таму ў цэнтры аграгарадка Забалоцце мы прадалі ўчастак за 27 млн рублёў. У гэтым годзе — такі ж участак побач — усяго за 6 млн. Цэны знізіліся ў сувязі з выхадам Указа № 64, які даў магчымасць многім грамадзянам краіны атрымліваць участкі бясплатна не толькі па месцы жыхарства і працы.

Новы год мы пачыналі са свабоднымі рэшткамі (71 млн, якія засталіся ад леташніх аўкцыёнаў), таму ў нас не было вялікіх праблем з пачаткам работ па добраўпарадкаванні.

Грошы, атрыманыя ад аўкцыёнаў, мы накіроўваем на добраўпарадкаванне і на развіццё інфраструктуры. Летась мы ў асноўным укладвалі сродкі ў аграгарадок Забалацце. Сёлета пераключыліся на іншыя населеныя пункты.

Пры запланаваным бюджэце ў 193 млн рублёў фактычнае яго выкананне ў Станькаўскім сельсавеце сёлета склала 260 млн. У лістападзе старшыня выстаўляе на аўкцыён 7 участкаў. Падрыхтаваны дакументы яшчэ на 15.

— Гэтую работу мы будзем працягваць і далей, яшчэ гады на тры нам зямлі хопіць, — падсумавала Людміла Шышко. — Аднак цалкам выйсці на самаакупнасць мы не зможам, бо цэны на зямлю зніжаюцца, а іншых паўнавартасных крыніц папаўнення бюджэту пакуль няма. Вось калі нам аддадуць падаходны падатак — тады мы будзем жыць на свае грошы.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Дзяржынскі раён.*

---

**ТЭМА ДНЯ**

## МАЛЫ БЮДЖЭТ — ДЫ ДАРАГІ

**Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання — структура параўнальна новая, утворaная ў красавіку 2007 года з мэтай каардынавання мясцовых Саветаў дэпутатаў (ад першаснага ўзроўню і да абласнога). Сістэма ўзаемадзеяння, якая склалася за гэты час, магчыма, не кідаецца ў вочы. Але пэўныя яе вынікі ўжо ёсць. І яны бачныя кожнаму, хто ўшчыльную сутыкаецца з работай органаў мясцовага самакіравання.**

– Наўрад ці нехта будзе спрачацца з тым, што ўвогуле за апошнія 2—3 гады адбыліся заўважныя паляпшэнні ў дзейнасці гэтых органаў, — заўважыў, адкрываючы чарговую сустрэчу са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, **старшыня Пастаянай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Генадзь НАВІЦКІ**. — Істотна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база Саветаў, асабліва сельскіх, прыведзеныя ў парадак і адрамантаваныя адміністрацыйныя будынкі, закупленыя аргтэхніка і транспарт. Ёсць пэўныя зрухі і ў фарміраванні бюджэтаў першаснага ўзроўню, хоць рэзерваў тут яшчэ шмат і не ўсе яны ў поўнай меры выкарыстоўваюцца.

**Аператыўнасць і якасць інфармавання ўзрастуць на парадак. А значыць, вызваліцца працоўны час, які сёння затрачваецца на папяровы «вал».**

Генадзь Навіцкі ўзгадаў і аб некаторых канкрэтных кірунках работы, якім Савет па ўзаемадзеянні надаваў апошнім часам асаблівую ўвагу. Адзін з іх — упарадкаванне справаводства ў сістэме мясцовага самакіравання.

— Не ведаю, ці заўважылі гэта работнікі Саветаў на месцах, але нам удалося амаль напалову скараціць рэгламент справаводства, зменшыць «вал» перапіскі і папераў, — адзначыў Генадзь Навіцкі.

Але галоўнае, дадаў ён, што Савет па ўзаемадзеянні «выйшаў на тэму», якая вельмі працяглы час не вырашалася. Рэч у тым, што нягледзячы на існаванне Дзяржаўнай праграмы інфарматызацыі «Электронная Беларусь» большасць мясцовых Саветаў ніяк не былі ў ёй закранутыя. На сёння, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў, у праграму «Электронная Беларусь» уключана заданне: стварыць аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму мясцовых Саветаў дэпутатаў (АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў»).

— Ужо сёння ў бюджэце прадугледжаныя сродкі для рэалізацыі гэтай задачы. І хоць мы знаходзімся практычна на пачатку шляху, але за 1,5—2 гады павінны яго пераадолець. Зразумела, з вашай дапамогай — дапамогай мясцовай улады. У выніку забеспячэнне справаводства, аператыўнасць і якасць інфармавання ўзрастуць на парадак. А значыць, вызваліцца працоўны час, які сёння затрачваецца на пераадоленне папяровага «валу».

Вырашана пытанне (дарэчы, яно было агучана прадстаўнікамі органаў мясцовай улады падчас адной з такіх сустрэч) і з напаўненнем бюджэтаў першаснага ўзроўню ў раёнах, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы. Нізавыя бюджэты там павінны мець больш адчувальную дзяржаўную падтрымку.

Апошнім часам Савет па ўзаемадзеянні ўшчыльную займаецца і пытаннем удасканалення працы землеўпарадкавальных службаў — паколькі менавіта ў іх адрас гучыць шмат нараканняў ад работнікаў сельвыканкамаў.

— Зрухі тут, на жаль, яшчэ слабыя, — канстатаваў Генадзь Навіцкі. — Значыць, ёсць над чым працаваць і нам, і вам. Тое ж самае датычыцца і механізму збору і выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомасць у сельскай мясцовасці. Інфармацыя з месцаў, якая датычыцца гэтай схемы (хто і як іх збірае), вельмі супярэчлівая. Тут мы яшчэ далёкія ад сістэмы.

Па-ранейшаму балючая тэма — напаўняльнасць бюджэтаў першаснага звяна ўлады, узровень датацыйнасці якіх застаецца вельмі высокім.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

## АД ПУГІ ДА ПЕРНІКА

**У Магілёўскім гарадскім цэнтры інфармацыйных сістэм паведамілі, што цяпер гараджане вінаватыя за камунальныя паслугі 2,4 мільярда рублёў.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Доўг сёлета паменшыўся, але для гэтага спецыялісты цэнтра выкарыстоўвалі самыя розныя метады — ад жорсткага спагнання запазычанасцяў са злосных неплацельшчыкаў да заахвочвання дысцыплінаваных.

### За суткі да высялення знайшліся грошы

Пяць гадоў таму два браты пераселі плаціць за 2-пакаёвую кватэру. Аднаму — 38 гадоў, другому — 32, але абодва нідзе не працуюць. Спачатку іх пераконвалі — хадзілі, пісалі лісты і ўгаворвалі. Потым сталі адключаць камунальныя паслугі — але, на жаль, і гэта не дапамагло. Прапаноўвалі стаць на ўлік у цэнтр занятасці: атрымаць дапамогу па беспрацоўі, перавучыцца, уладкавацца на працу... Катэгарычна адмовіліся!

Калі запас слоў і цярплівасці скончыўся, то на братоў падалі ў суд. І паступова дайшлі да крайняй меры — перасялення з добраўпарадкаванага жылля. Вядома, што ў такіх выпадках новыя жыллёвыя ўмовы неплацельшчыкаў камфортам і ўтульнасцю не адрозніваюцца.

Запазычанасць за камунальныя паслугі братоў складала 3 мільёны 800 тысяч рублёў. Але за дзень да высялення яны заплацілі ўсе гэтыя грошы. Дзе і як беспрацоўныя знайшлі такія немалыя сродкі — невядома, але ў цэнтры спадзяюцца, што цяпер яны будуць спраўна плаціць за кватэру, каб яе не страціць.

У Магілёве сёлета выселілі з кватэр у менш добраўпарадкаванае жытло 5 сем'яў, якія не плацілі за камунальныя паслугі на працягу доўгага часу. Летась такіх было 7, у 2007 годзе — 3.

— Колькі будзе высяленняў яшчэ — спрагназаваць цяжка, — каментуе **дырэктар цэнтра інфармацыйных сістэм Аляксандр СЕЛЯЗНЁЎ**. — Мы цяпер рыхтуем для судоў 79 пакетаў дакументаў, 4 падобныя іскі ўжо разглядаюцца. Для гэтых людзей альтэрнатыва такая: плаціць грошы альбо страціць кватэру.

### Дапамогуць знайсці выйсце

Аднак высяленне — гэта крайняя мера ці, так бы мовіць, пуга. У цэнтры інфармацыйных сістэм падкрэсліваюць, што гатовы не проста ўгаворваць ці патрабаваць плаціць за кватэру, але разбірацца ў кожнай канкрэтнай сямейнай сітуацыі.

— Зыходзячы з вопыту зносінаў з неплацельшчыкамі, скажу, што цяжка знайсці паразуменне з тым, хто не мае вялікай патрэбы ў грошах, але нахабнічае і не плаціць, — тлумачыць Аляксандр Селязнёў. — Але людзям, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, мы імкнёмся дапамагчы, разам шукаем выйсце.

Напрыклад, неплацельшчыкам прапануюць уставаць лічыльнікі, якія даюць магчымасць з цягам часу плаціць за камунальныя паслугі ледзь не напалову меней.

Калі сям'я бярэ крэдыт для выплаты асноўнай сумы доўга, то гэтыя сур'ёзныя намеры адзначаюцца спісаннем пені. Тым больш, калі ў сям'і ёсць дзеці. Спецыялісты цэнтра інфармацыйных сістэм гатовыя нават шукаць людзям працоўнае месца, толькі каб вырашыць праблему камунальных неплацяжоў.

— Ёсць яшчэ адно выйсце: памяняць сваю кватэру на меншую, — нагадвае дырэктар цэнтра. — У нас працуе рыэлтарская структура, якая дзейнічае на карысць людзям і гарантуе сумленнасць здзелкі. Сёлета такіх здзелак адбылося 5, і ўсе бакі задаволеныя. Людзі атрымалі меншыя кватэры, але цяпер над імі не вісяць мільённыя даўгі. Можна пачаць жыццё з чыстага ліста, з новай кватэры.

### «Ты стаіш у чарзе на высяленне!»

Беспрабуднае п'янства і асацыяльны лад жыцця — асноўныя праблемы большасці злосных неплацельшчыкаў за камунальныя паслугі. Дарэчы, злоснымі неплацельшчыкі становяцца пасля таго, як 6 месяцаў не плацяць за кватэру.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Яны п'юць дзень за днём горкую і ім няма калі плаціць па рахунках, — кажуць у цэнтры.

Звычайна, каб нагадаць такім людзям пра запазычанасці, ім адключаюць камунальныя паслугі — электрычнасць ці гарачую воду. Напрыклад, з пачатку года і па кастрычнік было «адключана» 946 кватэр. На працягу месяца адбываюцца каля сотні адключэнняў. Выпадкі, калі людзі аплачваюць доўг альбо яго частку і зноў атрымліваюць ваду і святло, зусім не рэдкія.

Тым не менш у Магілёўскім гарадскім цэнтры інфармацыйных сістэм сёлета знайшлі яшчэ больш дзейсны метад для неплацельшчыкаў. Гэта, як ні дзіўна, звычайныя надпісы на дзвярах кшталту «Ты стаіш у чарзе на высяленне!». Аказалася, гэта моцна б'е па нервах злосных неплацельшчыкаў.

— Яны прыходзяць на нас лаяцца: гэта значыць, мера аказалася эфектыўнай, — лічыць Аляксандр Селязнёў. — Яна прымусіла іх адцягнуць увагу ад бутэлькі, узняць вочы і пайсці разбірацца са сваімі запазычанасцямі.

Цяпер у Магілёве налічваецца каля 1,5 тысячы злосных неплацельшчыкаў. На іх сумленні — доўг у 1,7 мільярда рублёў.

— Але мы не даём ім жыцця, працуем актыўна, так ці інакш прымушаем аддаць даўгі, — кажуць у цэнтры інфармсістэм.

### Грашовая прэмія за дысцыпліну

Аднак абсалютная пераважнасць жыхароў Магілёва — цалкам акуратныя плацельшчыкі. Аднойчы ў цэнтры падумалі і пра пернік: як адзначыць і заахвоціць тых, хто спраўна плаціць па сваіх рахунках. Так нарадзілася ідэя атрымання 5-працэнтнай зніжкі ў адной з магілёўскіх крамаў бытавой тэхнікі, а таксама конкурс «Самы дысцыплінаваны плацельшчык».

Гэты конкурс — латарэя сярод тых, хто акуратна плаціць за камунальныя паслугі. Розыгрыш — на пачатку кожнага года. У выніку каля 300 дысцыплінаваных плацельшчыкаў атрымліваюць грашовыя прэміі.

У пачатку гэтага года ў Магілёве меркавалі, што нават у сувязі з эканамічнымі праблемамі крызіс неплацяжоў за камунальныя паслугі нас не чакае. Так і адбылося: людзі, можа, і падціснулі паясы, але параней шаму лічаць: як бы цяжка ні было, спачатку трэба аплаціць рахункі, а ўжо потым набываць нешта для сябе.

Таму і цяпер, калі з гэтага месяца рахунак-квітанцыі стануць больш «важкімі», спецыялісты не чакаюць істотнага павелічэння доўга за камунальныя паслугі. Добрасумленныя людзі аплацяць іх своечасова, а што датычыцца злосных неплацельшчыкаў — так ці іначай знойдзецца спосаб прымусіць іх вярнуць бюджэту грошы.

**Ілона ІВАНОВА.**

---

## ВЫБАРЫ АДБУДУЦЦА ПРЫ ЛЮБОЙ ЯЎЦЫ

**З пачаткам 2010 года палітычны сезон абяцае быць не пазіморaму спякотным — стартуе кампанія па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, якія адбудуцца ў другой палове красавіка. І, паводле ініцыятыў Цэнтральнай камісіі, электаральны працэс у многім зменіцца (зразумела, калі гэтыя ініцыятывы атрымаюць падтрымку на ўсіх узроўнях — у абедзвюх палатах парламента і ў кіраўніка дзяржавы). Выбар часавага адрэзку ў асноўным абумоўлены імкненнем размежаваць гэту выбарчую кампанію з прэзідэнцкай (запланаванай прыкладна на люты 2011-га). Ключавыя пераўтварэнні і іх чаканыя наступствы абмяркоўваем са старшынёй Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ.**

### Цэнтрвыбаркам прапануе адмяніць ніжні парог колькасці прагаласаваўшых за кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў

***— Лідзія Міхайлаўна, навошта адмяняць бар'ер яўкі выбаршчыкаў і што гэта новаўвядзенне за сабой пацягне, на вашу думку?***

— На мясцовыя выбары заўжды вялая яўка, людзі не маюць інтарэсу да іх і не вельмі актыўна ідуць на ўчасткі. Відаць, лічаць, што гэта ўлада — дастаткова дэкаратыўная. А высокія патрабаванні па яўцы выбаршчыкаў (у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам прагаласаваць павінна больш як 50 працэнтаў тых, хто валодае выбарчым правам. — **Аўт.**) прыводзяць да таго, што ў асобных выпадках мае месца злоўжыванне адміністрацыйным рэсурсам. Гэта калі выбаршчыкаў настолькі ўцягваюць у электаральны працэс, што яны пачынаюць скардзіцца — маўляў, ушчамляюць іх свабоду на ўдзел у выбарах. Асабліва гэта распаўсюджана там, дзе выбаршчыкі звязаныя нейкімі, скажам так, жорсткімі стасункамі з тымі, хто арганізуе выбары. Напрыклад, калі ўчастак размешчаны ў інтэрнаце ці інстытуце, то паспрабуй прайдзі міма яго — не дойдзеш да заліку, пакуль не пацвердзіш, што прыйшоў на выбарчы ўчастак. Каб зняць такія праблемы, мы прапануем на мясцовых выбарах адысці ад бар'еру яўкі. Няхай выбаршчык сапраўды свабодна — я спадзяюся, ён не будзе злоўжываць гэтай свабодай — распараджаецца сваім волевыяўленнем: ісці ці не ісці на выбары. Хоць мы ўсведамляем, што крытыкі гэтай нормы будзе вельмі шмат. Ужо цяпер, калі нават не ўнесеныя змяненні ў заканадаўства, ставяцца пытанні аб тым, наколькі легітымная гэта будзе ўлада і каго яна будзе прадстаўляць... Усе гэтыя прапановы не ад добрага жыцця, а для неабходнасці эфектыўнага правядзення выбарчай кампаніі. Так, гэта шмат у чым вызначыць якасць улады, абранай у мясцовыя Саветы. Лепшай яна будзе ці горшай — мы гэтага не ведаем...

***— Зэканоміць атрымаецца дакладна. Колькі сродкаў падаткаплацельшчыкаў пойдзе на выбарчую кампанію?***

— На яе плануецца выдаткаваць каля 18 млрд беларускіх рублёў — сума невялікая, затраты на заробкі — мінімальныя. Напрыклад, на дзень выбараў прадугледжаны заробак члена ўчастковай камісіі ажно ў 27 тысяч, за вылікам падатку. Але кола ўдзельнікаў вельмі шырокае, столькі выбарчых камісій у гэтым задзейнічана, што толькі на заробкі членаў участковых выбарчых камісій трэба больш за 9 млрд рублёў.

***— А на мясцовыя выбары не плануецца распаўсюдзіць прапанаваную норму аб асабістых фондах для кандыдатаў, як гэта прадугледжваецца для прэтэндэнтаў на пасады дэпутата парламента і прэзідэнта? Каб і яны маглі распараджацца большымі сродкамі, чым тыя, што прапануе казна, каб самі выбары былі не такімі млявымі, як звычайна.***

— У мясцовых выбарах фонды не будуць задзейнічаныя. Па-першае, удзел павінен быць даступным максімальнай колькасці кандыдатаў, і кандыдатаў часта вельмі незабяспечаных, асабліва ў сельскай мясцовасці — якія там могуць быць фонды? Па-другое, у мясцовыя Саветы дэпутатаў трэба выбіраць тых людзей, якіх і так вельмі добра ведаюць выбаршчыкі — і навошта ім дадатковая колькасць лістовак. Больш за тое, я вам магу сказаць, што нават тыя бясплатныя магчымасці, якія даюцца законам для правядзення мясцовых выбараў, паўсюдна не выкарыстоўваюцца. У сельскай мясцовасці дык наогул суцэльная эканомія. Многія кандыдаты не бяруць нават тую маленькую суму, якую мы выдаткоўваем (адна базавая велічыня) на выраб лістовак. Ну скажыце, навошта мясцоваму жыхару, калі ён балатуецца дэпутатам ад выбаршчыкаў у колькасці, скажам, 100 чалавек, якія і так яго ведаюць, яшчэ лістоўкі нейкія рабіць? Не поўнасцю выкарыстоўваюцца і магчымасці мясцовага радыё, друку, якія мы даём кандыдатам. Таму ўводзіць яшчэ нейкія фонды не мае сэнсу.

***— Якія прапановы па датэрміновым галасаванні?***

— Мы разлічваем заканадаўча замацаваць практыку, якую прымянялі падчас апошніх парламенцкіх выбараў з ухвалення і па просьбе АБСЕ: дадатковая засцярога скрыняў для галасавання — іх штодзённае апячатванне, адкрыццё выбарчых участкаў у першы дзень правамоцным складам камісіі. Больш за тое, мы дапаўняем гэты працэс складаннем штодзённага пратакола аб колькасці атрыманых бюлетэняў, тых, што былі выдадзеныя выбаршчыкам, і тых, што былі сапсаваныя. Гэта будзе ўсеагульная інфармацыя, з якой зможа пазнаёміцца любы назіральнік.

***— Ці стане празрыстасць урнаў для галасавання на чарговых выбарах абавязковай умовай?***

— Не, бо гэта прывядзе да істотнага падаражэння выбарчай кампаніі: ёсць адна скрыня для датэрміновага галасавання, тры пераносныя скрыні для галасавання дома, яшчэ адна — на асноўны дзень выбараў. Такім чынам, пяць скрыняў на кожны выбарчы ўчастак, а такіх ствараецца каля 7 тысяч — гэта велізарныя сродкі. Хто зможа сабе такое дазволіць, мы пярэчыць не будзем, але і абавязваць нікога не станем.

***— Як зменяцца магчымасці вылучэння ў якасці кандыдатаў і назірання за выбарамі?***

— Мы адыходзім ад неабходнасці засведчвання подпісаў у выканкамах, дастаткова будзе подпісу члена ініцыятыўнай групы, які збіраў гэтыя подпісы. Дапушчальна будзе ў адным лісце змяшчаць подпісы жыхароў розных раёнаў. Зразумела, гэтыя палёгкі будуць спрыяць альтэрнатыве ў выбарах. Спрашчаецца і вылучэнне ад палітычных партый: неабавязкова, каб у акрузе, па якой балатуецца кандыдат у дэпутаты, была арганізацыйная структура партыі. Мы прапануем новыя правілы для фарміравання выбарчых камісій: гарантаваную квоту ўдзелу для палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў (не менш за адну траціну), абмяжоўваем прысутнасць у выбарчых камісіях дзяржаўных служачых (таксама да адной траціны), яшчэ траціна — прадстаўнікі працоўных калектываў, звычайныя выбаршчыкі. Прадугледжваецца і скасаванне права выканкамаў і мясцовых Саветаў дэпутатаў уключаць сваіх прадстаўнікоў у камісіі. Агаворваецца таксама, што старшынёй камісіі не можа быць асоба, якая звязаная сваяцкімі адносінамі ці знаходзіцца ў прамым падначаленні ў кандыдата на выбарную пасаду. Назіральнікамі ад палітычных партый змогуць быць не толькі члены партыі, але і яе прадстаўнікі — гэта вельмі істотны момант, бо склад кожнай партыі абмежаваны. Мы таксама прапануем прапісаць у заканадаўстве, што падчас падліку бюлетэняў назіральнік павінен знаходзіцца ва ўмовах, якія дазваляюць бачыць працэдуру падліку.

Па якіх правілах пройдуць чарговыя выбары? Ці ўсе прапанаваныя змены будуць ухваленыя? А галоўнае, што гэта дасць? Ці застануцца задаволенымі назіральнікі? Пажывём — пабачым.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# МАЛЫ БЮДЖЭТ — ДЫ ДАРАГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Напаўненне вашых бюджэтаў у многім ад вас жа і залежыць, — звярнуўся да прысутных Генадзь Навіцкі. — Але што сёння даводзіцца бачыць на месцах? І работа па прыцягненні інвестараў, і садзейнічанне прадпрымальніцкай дзейнасці, і крокі ў бок развіцця экатурызму не прыносяць пакуль жаданых вынікаў. Шмат пытанняў застаецца і ў сувязі з вырашэннем задач, пастаўленых Годам роднай зямлі. Бываючы за мяжой, я з задавальненнем адзначаю для сябе, што ў некаторых кірунках мы дабіліся нават большых поспехаў, чым яны. Напрыклад, па тым жа стане некаторых дарог, магістраляў. Але... Варта ад'ехаць за 20 метраў у бок ад гэтай нашай дарогі, і пабачыш там такое... Што датычыцца прыдарожнага сэрвісу, зноў жа, нейкія зрухі заўважныя ў асноўным на магістральных кірунках: Мінск — Брэст і яшчэ некаторых. А на астатніх? Здараецца, едзеш па дарозе, як па нейкай цаліне. Толькі і радуе, што прырода. Але каб развіваць турызм, гэтага недастаткова. Людзям трэба недзе запраўляць машыну, есці, начаваць. А з гэтым, на жаль, праблемы. Дык давайце падумаем разам, як іх вырашыць.

**Здараецца, едзеш па дарозе, як па нейкай цаліне. Толькі і радуе, што прырода. Але каб развіваць турызм, гэтага недастаткова.**

Тэму напаўняльнасці мясцовых бюджэтаў прадоўжыла **начальнік аддзела рэгіянальных бюджэтаў упраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Зоя КРУГЛІКАВА**. Яна назвала зніжэнне бюджэтнай датацыйнасці найбольш важнай задачай — і не толькі для першаснага ўзроўню ўлады. Дзеля яе вырашэння быў зацверджаны Бюджэтны кодэкс, і з 1 студзеня 2010 года пачнуць дзейнічаць усе яго артыкулы.

— У ім уведзенае дакладнае размежаванне даходных і расходных паўнамоцтваў бюджэтаў усіх узроўняў, а таксама вызначаны даходныя крыніцы: замацаваныя і рэгулюючыя. Інакш кажучы, напаўняльнасць вашых бюджэтаў будзе залежаць ад таго, якія даходныя крыніцы за імі замацаваныя і якія падаткі збіраюцца.

Разам з тым, заўважыла Зоя Круглікава, палітыка дзяржавы апошнім часам накіраваная на зніжэнне падатковай нагрузкі — а значыць, падатковыя паступленні ў бюджэты скарачаюцца.

— У выніку ўзровень датацыйнасці вашых бюджэтаў не зніжаецца. Сёння ў рэгіёнах увогуле адсутнічае дастатковая падатковая база, якая здольная была б забяспечыць бездатацыйнасць бюджэтаў, — сказала прадстаўнік Мінфіна. — Натуральна, свой уплыў аказвае і агульная складаная эканамічная сітуацыя, у межах якой нам давядзецца працаваць і ў 2010 годзе.

Нягледзячы на гэта, на месцах паранейшаму праводзіцца больш мяккая фінансавая палітыка. Мясцовыя органы ўлады расходуюць грошы «па старынцы», не адчуваючы сітуацыі, якая склалася, не прытрымліваючыся прынцыпу жорсткага абмежавання непершачарговых тратаў... Усё гэта азначае, што да канца года спатрэбіцца яшчэ адно ўдакладненне бюджэту ў бок яго змяншэння, а адпаведна, адбудзецца скарачэнне датацый рэгіёнаў.

— У любым выпадку, не трэба сядзець і чакаць спецыяльнага ўказа на гэты конт. Ужо сёння неабходна прыняць меры па абмежаванні непершачарговых расходаў, нават бягучых (папера, канцтавары і г.д.), каб забяспечыць наяўнасць сродкаў для выплаты заработнай платы і падтрымку іншых першачарговых артыкулаў. Да канца года бюджэтная палітыка на месцах павінна быць дакладна скіраваная на тое, каб мінімізаваць або поўнасцю выключыць капітальныя расходы, — заявіла Зоя Круглікава. — Забудзем пакуль пра «лепшыя гады». І пачнём траціць у межах тых рэсурсаў, якія ёсць у наяўнасці. Мясцовыя бюджэты ў 2010 годзе павінны быць бездэфіцытнымі.

Закранаючы тэму фарміравання першасных (сельсавецкіх) бюджэтаў, Зоя Круглікава адзначыла, што сёння на гэтым узроўні існуюць неўрэгуляваныя пытанні. У прыватнасці, Указ № 21 не вызначае такой даходнай крыніцы, як адлічэнні ад падаходнага падатку з фізічных асобаў. А па меркаваннях фінансістаў, гэты падатак усё ж павінен «асядаць» (як рэгулюючы) на першасным узроўні — у мэтах зніжэння датацыйнасці нізавога бюджэту.

— Але сёння ва Указе № 21 такой нормы няма, а закон аб бюджэце не можа яе прапісаць, таму што ўказ вышэй. Значыць, трэба ініцыяваць унясенне змяненняў **ва ўказ**, а зрабіць гэта могуць толькі заканадаўчыя органы, — патлумачыла Зоя Круглікава. — Таму я заклікаю вас актыўна паспрыяць на сваім узроўні заканадаўчаму ўрэгуляванню гэтага пытання. Будзе норма, будуць і грошы.

Яшчэ адзін «балючы момант» — добраўпарадкаванне тэрыторый. У сэнсе: хто і за якія сродкі павінен гэтым займацца? Сельвыканкам існуе ў жорсткіх межах, дзе лімітаваныя ўсе расходы. Так проста ўзяць і купіць нешта з тэхнікі нельга. Тым не менш, многія куплялі, адносячы расходы да артыкула «добраўпарадкаванне».

— Але мясцовая ўлада, сельвыканкам — гэта не гаспадарчы орган, а дзяржаўны! Дзяржаўны орган можа толькі арганізаваць работу — з дапамогай СВК, прадпрыемства і да т.п. Каб знайсці выйсце з гэтага становішча, не парушаючы заканадаўства, неабходна абмеркаваць і вырашыць пытанне па абслугоўванні тэрыторыі на раённым узроўні, — лічыць фінансіст. — Таму што некалькі гадоў запар з бюджэту вам выдзяляюцца сродкі — і не маленькія — менавіта на набыццё спецыяльнай камунальнай тэхнікі для работы ў сельскай мясцовасці. Вашы прадпрыемствы ЖКГ рэгулярна аснашчаюцца. А ўжо на якіх тэрыторыях ім працаваць — гэта пытанне вырашае раённая ўлада. Калі арганізуеце работу правільна, я думаю, многія праблемы будуць знятыя.

**Ужо сёння неабходна прыняць меры па абмежаванні непершачарговых расходаў, нават бягучых — паперы, канцтавараў і г.д.**

Зоя Круглікава звярнула ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы і на такі важны момант, як стварэнне малых (да 100 чалавек) прадпрыемстваў — усе падаткі, якія яны выплачваюць, застаюцца ў бюджэце базавага ўзроўню. А гэта немаленькія грошы. Толькі ў Мінскай вобласці за 9 месяцаў года ў бюджэты базавага ўзроўню паступіла 19 млрд рублёў (дарэчы, лепшы паказчык па краіне).

— Гэта выключна вашы сродкі, якімі вы таксама можаце распараджацца,— сказала Зоя Круглікава.

Што датычыцца права мясцовых Саветаў павялічваць або памяншаць стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць, то яно ўсё ж захаваецца (хоць не так даўно збіраліся яго адмяніць), але будзе прапісана ў асобным нарматыўным акце. Гэта таксама дасць уладам магчымасць атрымліваць дадатковыя сродкі ў свой бюджэт.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# «ПАНСКІ» ПРАЕКТ МІКАЛАЯ МІХАЙЛОЎСКАГА

## Гаспадар з Агранамічнай: з прысядзібным участкам не прападзеш

**Мікалай Міхайлоўскі — прызнаны аўтарытэт для месцічаў і для дзелавых партнёраў, якія з ім ахвотна супрацоўнічаюць. Прыватнік даволі паспяхова разгортвае ўласную справу на зямлі. Яго праект ужо на працягу шэрагу гадоў даказвае сваю жыццяздольнасць. Мікалай Фёдаравіч разам з вялікай сям'ёй жывуць за кошт даходаў ад прысядзібнай гаспадаркі. І жывуць няблага — не горш, а можа нават і лепш, за іншых вяскоўцаў, якія працуюць у сельскай гаспадарцы ці сацыяльнай сферы. Як жа ў Міхайлоўскіх усё так спрытна атрымліваецца?**

### З горада — у вёску

Мікалай Фёдаравіч нарадзіўся і вырас у вёсцы на Аршаншчыне. Яго бацькі трымалі вялікую гаспадарку, таму да працы на ўласным падворку прывучаны з дзяцінства. Атрымаў агранамічную адукацыю і рыхтаваўся свой лёс звязаць менавіта з сельскай гаспадаркай. Але так ужо атрымалася, што на два дзясяткі гадоў стаў гараджанінам. Доўгі час працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце памочнікам майстра па ткацкай справе. Выходзіць, што таксама быў далучаны да агрmaпрамысловага комплексу, праўда, не ў глыбінцы. Міхайлоўскі заўважае, што гараджанінам у поўнай меры сябе і не лічыў.

— З ільнокамбіната пайшоў па стане здароўя, — заўважае Мікалай Фёдаравіч. — Некалькі гадоў займаўся перавозкамі, а пасля вырашыў перабрацца ў вёску — якраз была вакансія ў аграрным тэхнікуме. Адпрацаваў у навучальнай установе сем гадоў і напрыканцы 1990-х вырашыў паспрабаваць свае сілы ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Міхайлоўскі разам з сям'ёй заняліся вырошчваннем агародніны. Першую цяпліцу прыватнік пабудаваў у 1999 годзе. Прычым па ўласным праекце і сваімі рукамі. Цяпліца займае плошчу 3,3 соткі (330 квадратных метраў). Спачатку пакрыццё памяшкання было поўнасцю са шкла, паколькі на той час не было шматсезоннай поліэтыленавай плёнкі. Для ацяплення выкарыстоўваецца цікавая тэрмасіфонная сістэма. Кацёл з вадой падаграваецца дровамі і за кошт натуральнай цыркуляцыі вадкасць падаецца па ўсім перыметры цяпліцы. Атрымліваецца даволі выгадна, паколькі не выкарыстоўваецца электрычнасці. А абагрэў — з дапамогай тых самых даступных мясцовых відаў паліва.

Мікалай Фёдаравіч называе свае вытворчыя памяшканні не цяпліцамі, а плёначнымі ўкрыццямі. Як заўважае гаспадар, тут ёсць адрозненні — цяпліца працуе на працягу ўсяго года і ў ёй перш за ўсё, акрамя падагрэву паветра, ацяпляецца і глеба. Гэта значныя фінансавыя затраты, якія для прыватніка ў большасці выпадкаў проста непад'ёмныя. А вось плёначныя ўкрыцці — якраз тое, што патрэбна. Калі па-гаспадарску распарадзіцца палеткамі (нават невялікімі), то можна атрымаць добры вынік.

— Узімку для мяне вырошчванне агародніны нерэнтабельнае, — кажа Міхайлоўскі. — Ды і адпачываць чалавеку калісьці трэба. Але адпачынак — рэч умоўная. Неабходна нарыхтоўваць дровы, каб абаграваць плёначныя ўкрыцці. Гэта таксама праца даволі адказная, паколькі ў памяшканнях павінна быць адпаведная тэмпература. Ацяпленне працуе пераважна ў сакавіку, калі разгортваюцца работы. Найперш высаджваю зеляніну (зялёны лук, пятрушку, кроп), якую ў красавіку ўжо рэалізую. Адначасова закладваю пляцоўкі з расадаю памідораў і агуркоў. Расаду вырошчваю з лішкам (каб мець страхавы фонд). Калі нешта застаецца пасля высадкі, то прадаю.

### Як сабраць 1,2 тыс. цэнтнераў з гектара?

Агульная плошча палеткаў пад плёнкай каля сядзібы Міхайлоўскіх складае 17 сотак. Гэта чатыры збудаванні, якія ў чымсьці адрозніваюцца адзін ад другога. Дзесьці толькі плёнкай абцягнутыя, дзесьці пакуль і шкло выкарыстоўваецца. Два памяшканні абаграваюцца ў першы вясновы месяц, а два пачынаюць працаваць у красавіку, калі сонейка няблага прыгравае. Так што ўсё прадумана да дробязяў.

Цяпер цяпліцы (дазволю ўжываць больш прывычны для сябе тэрмін) адкрытыя, каб праветрывaліся. Уверсе зроблены спецыяльныя люкі — ствараецца добрая вентыляцыя і глеба замарожваецца. Як заўважае прыватнік, набліжаецца да натуральнага стану, абеззаражваецца. Глеба апрацавана, унесены арганічныя ўгнаенні. Мінеральны баланс таксама даволі паспяхова падтрымліваецца за кошт звычайнага попелу.

— Унясенне попелу — вельмі карысная і неабходная для глебы працэдура, — перакананы Мікалай Міхайлоўскі. — Гэта якасць прадукцыі, якую заўжды неабходна трымаць на належным узроўні. Людзі мне ў гэтым плане поўнасцю давяраюць. І пакупнікі маюць рацыю, паколькі я раблю стаўку менавіта на выкарыстанне прыродных, арганічных угнаенняў. Таму што прадукцыя з такіх палеткаў карысная для арганізма, гэта крыніца вітамінаў і мікраэлементаў.

Як бачым, прыватнік з вёскі Агранамічная (сама назва якая!) прытрымліваецца прынцыпаў «зялёнай» вытворчасці, што надзвычай папулярная апошнім часам за мяжой. (Прадукцыя, якая вырашчана адпаведным чынам, пазначаецца спецыяльным «лэйблам» і каштуе на парадак больш, чым уся астатняя. Нягледзячы на даволі высокі кошт, яна карыстаецца ўстойлівым попытам у спажыўцоў.) Міхайлоўскі на сваю агародніну цэны не завышае, але якасць у яго гарантаваная. Таму людзі заўсёды з задавальненнем набываюць прадукцыю яго прысядзібнай гаспадаркі. Прычым як гараджане, так і вяскоўцы. На мясцовым рынку агародніна таксама нядрэнна разыходзіцца.

Міхайлоўскі аддае перавагу галандскім гатункам агародніны. З цягам часу напрацаваў неабходны вопыт і цяпер вырошчвае стабільна высокія ўраджаі.

— Вы б пабачылі, якія памідоры вырастаюць, — кажа Мікалай Фёдаравіч, — усе проста дзівяцца. А мне вельмі прыемна, сваіх сакрэтаў вырошчвання ніколі не хаваю. Галоўнае — жорстка вытрымліваць тэхналогію. Высадка, апрацоўка — усё ў належны тэрмін. Калі недзе не даглядзеў, спазніўся, то і кпіць на сціплы вынік не трэба. Тут ужо так: калі ўзяўся, то трэба цягнуць, каб перад людзьмі сорамна не было.

Думаю, што нездарма пра прыватніка ўсе тутэйшыя жыхары з такой павагай кажуць. Чалавек з горада прыехаў і такіх поспехаў у вясковай працы дасягнуў. Калісьці ў Міхайлоўскіх пад капусту быў адведзены гектар палеткаў. Цяпер пад гэтай культурай — пяць сотак, з якіх сёлета сабралі шэсць тон. Выходзіць, што сярэдняя ўраджайнасць капусты склала 1,2 тысячы цэнтнераў з гектара. Вось дык эфектыўнасць!

### Дом на стагоддзі

Раней Міхайлоўскія і карову трымалі, але цяпер збылі жывёлу — не па сілах ды і неабходна нечым адным сур'ёзна займацца. Працы заўжды хапае, паколькі іншых работнікаў не прыцягваюць. Спраўляюцца самастойна: Мікалай Фёдаравіч разам з жонкай Валянцінай Пятроўнай, а таксама дзеці дапамагаюць. У Міхайлоўскіх трое дачок — Алена і Алеся з сем'ямі жывуць у Оршы, а малодшая, Марына, вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на эканаміста. У старэйшых малыя дзеці, таму не заўсёды змогуць прыехаць. Галоўнае спадзяванне — на Марыну, якая падчас канікулаў заўжды шчыруе разам з бацькамі на палетках.

У колішнім панскім доме і атмасфера — гаспадарская.

— Цяжка, зразумела, і адпачыць часам не пашкодзіць, але ўжо што рабіць, калі «запрэгліся», — усміхаецца Валянціна Пятроўна. — Ужо іншага ладу жыцця сабе і не ўяўляем, пэўна, прывыклі да таго, што ўсё залежыць ад нас самых. Ніхто не прымушае працаваць ад цёмнага да цёмнага, затое душа радуецца, калі ўсё атрымліваецца і людзі дзякуюць за смачную прадукцыю.

Іншыя з вяскоўцаў ужо памідоры з агуркамі на сваіх палетках не вырошчваюць. Паколькі ведаюць, што ўсё неабходнае можна набыць у Міхайлоўскіх. Такім чынам адбываецца своеасаблівая спецыялізацыя, якая, дарэчы, развіццю прыватнай цяплічнай гаспадаркі толькі спрыяе. Праўда, пашыраць вытворчасць Мікалай Фёдаравіч не плануе. Трэба належным чынам адпрацаваць той варыянт, якім займаецца цяпер. Тым больш, што апроч зеляніны, памідораў і агуркоў, вырошчвае сям'я і іншыя культуры.

Але гэта, заўважае гаспадар з Агранамічнай, толькі дадатак — «агарод». Каб на стале круглы год было ўсё неабходнае. У свой час Міхайлоўскі пасадзіў сад — невялікі, але на сям'ю хапае. Яблыкі смачныя і сакавітыя. Таксама ў Мікалая Фёдаравіча невялікі (на тузін вулляў) пчальнік. Бацька ў Міхайлоўскага быў добрым пчаляром, так што занятак для яго вядомы. Духмянага мёду сям'і і родным удосталь, яшчэ і на рэалізацыю сёе-тое застаецца. Ды і карысна трымаць пчол каля цяпліц — апыленне раслінам заўсёды да месца.

Так што ўсё ў гэтай прысядзібнай гаспадарцы ўзаемазвязана і працуе на канчатковы вынік. Адразу відаць — гаспадары. Гэта нават і па доме відаць. Аказваецца, будынку ўжо не менш чым 140 гадоў.

— За панамі гэта, напэўна, было гаспадарчае памяшканне, — адзначае Міхайлоўскі. — А за савецкім часам перарабілі пад жыллё. Калісьці непадалёк цэлы комплекс старажытных будынкаў побач быў, але паступова яны разбураліся. Але я задумаўся: няўжо нельга хоць што-небудзь выратаваць, зберагчы для нашчадкаў? Таму і набыў гэты дом. Вядома ж, можна было адшукаць іншае жыллё, у больш спраўным стане. Тут прыйшлося рабіць капітальны рамонт — мяняць падлогу, вокны, дзверы, сістэму ацяплення, дах. Але сам будынак даволі моцны, яшчэ не адно стагоддзе прастаіць. Так што я аб сваім выбары ніколькі не шкадую. У панскім доме, здаецца, і нейкая атмасфера асаблівая — гаспадарская. Варта прыкласці рукі, і ўсё атрымаецца як мае быць.

Так што «панскі» праект колішняга гараджаніна Міхайлоўскага праз цяжкую штодзённую працу ўдала ўвасабляецца ў жыццё. Палеткі ў спраўным стане, ёсць дом на стагоддзі, падрастаюць два ўнукі і ўнучка. Дбайныя гаспадары ўпэўненыя ў заўтрашнім дні — для сябе і сваёй сям'і.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ. Фота аўтара.**

*Аршанскі раён.*

**Сведения об объекте республиканской собственности, подлежащем разгосударствлению и приватизации**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность** | | | **Республиканское унитарное сельскохозяйственное производственное предприятие «Агрокомбинат «Приднепровский» совместно с дочерним унитарным торговым предприятием «Павлин» (РУСПП «Агрокомбинат «Приднепровский» совместно с ДУТП «Павлин»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь** |
| **Адрес** | | | 213122, Могилевская область, Могилевский район, п/о Романовичи, д. Романовичи |
| **Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции** | | | Производство яиц, мяса домашней птицы, переработка молока, разведение крупного рогатого скота; розничная торговля птицей и изделиями из птицы, молочными продуктами, яйцами, мясом и мясными продуктами |
| **Положение на рынке** | | | Не занимает доминирующее положение |
| **Планируемые сроки разгосударствления и приватизации** | | | 4 квартал 2009 г. |
| **Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации** | | | Создание открытого акционерного общества |
| **Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение** | | | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12 |
| **Численность работающих, чел.** | | | 1008 |
| **Срок предъявлений претензий** | | | Месяц со дня опубликования |
| **Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.** | | | 60 766 235 200 |
| **Стоимость основных фондов – всего, руб.** | | | 74 951 603 131 |
| **Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га** | | | 8 746,0 |
| **Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.** | | | 36 718 348 |
| **Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.** | | | нет |
| **Финансовое состояние объекта, руб.** | **Балансовая прибыль** | | 645 010 280 |
| | **Задолженность** | **кредиторская** | 12 383 557 585 |
| | | **дебиторская** | 2 329 207 480 |

**Примечание:** Преобразование РУСПП «Агрокомбинат «Приднепровский» совместно с ДУТП «Павлин» осуществляется единым имущественным комплексом по консолидированному балансу по состоянию на 01.01.2009. УНП 100745627.

# УСЕ СРОДКІ ДОБРЫЯ

## Сёлета ў Сенненскім раёне даходы бюджэту пярвічнага ўзроўню засталіся прыкладна такімі ж, як і летась

Старшыня Сенненскага раённага Савета дэпутатаў Міхаіл Вілюга адзначае, што той самы крызіс прымусіў шукаць новыя крыніцы для папаўнення бюджэту, эканоміць на тым, на чым магчыма. Пры ўсім гэтым не эканоміць на рашэнні праблем мясцовых жыхароў. Простым людзям па-ранейшаму з боку мясцовых уладаў патрэбныя ўвага, клопат і падтрымка ва ўсіх добрых пачынаннях.

— Спецыфіка нашай вобласці ў цэлым і нашага раёна ў прыватнасці таксама ў тым, што частка падаходнага падатку з грамадзян пералічваецца ў бюджэт. У нас у раёне такім чынам бюджэт папаўняецца больш чым напалову — а дакладней, на 59,7 працэнта, — расказвае старшыня раённага Савета дэпутатаў. — Увесь гадавы бюджэт пярвічнага ўзроўню — болей за 1 мільярд 639 мільёнаў рублёў.

Паводле слоў Міхаіла Мікалаевіча, менавіта ў крызісны час актыўна ствараюцца новыя малыя прадпрыемствы. Дзелавых энтузіястаў прываблівае льготнае падаткаабкладанне, магчымасць атрымання добрых крэдытаў на зручных умовах.

— Вось сёлета сем прадпрыемстваў пачалі дзейнічаць, — працягвае Міхаіл Вілюга. — І добра, што не толькі гандлем займаюцца прадпрымальныя людзі, але і вытворчасцю. Напрыклад, наш зямляк, былы міліцыянер, арганізаваў вытворчасць фільтраў для аўтамабіляў. У выніку створана некалькі новых працоўных месцаў.

Зразумела, калі на месцах прадстаўнікі ўлады кроўна зацікаўленыя ў папаўненні бюджэту, яны больш цесна супрацоўнічаюць з ініцыятыўнымі людзьмі, якія хочуць займацца бізнэсам і ўжо робяць гэта.

Развіваецца і аграрны турызм. І няхай пакуль што ўладары турыстычных сядзібаў плацяць сімвалічныя падаткі — усяго толькі базавую велічыню ў год. Але ж разам з тым даюць магчымасць тутэйшым жыхарам трохі падзарабіць на турыстах.

Расказваючы пра новыя формы папаўнення бюджэту, мой суразмоўца адзначыў, што цяпер, калі ёсць свабодныя грошы, сельскія выканкамы кладуць іх на банкаўскі дэпазіт. Такім чынам сёлета на працэнтах зарабілі яшчэ каля 3,5 мільёна рублёў.

І на сабаках зарабляюць. Ёсць попыт па зборы падаткаў з уладальнікаў сабак. Сёлета такія паступленні ў цэлым склалі каля 235 тысяч рублёў. Мала? Але і гэтыя грошы можна накіраваць на дапамогу людзям. Напрыклад, патраціць іх на добраўпарадкаванне і гэтак далей. Збор з нарыхтоўшчыкаў ягад і грыбоў сёлета склаў каля 2,5 мільёна рублёў. У асноўным лясныя дары нарыхтоўваюць раённая спажывецкая кааперацыя і лясгас. Традыцыйна нядрэнныя паступленні ад падаткаў на нерухомасць і незавершаное будаўніцтва — пералічаны 40 мільёнаў рублёў. Ільвіная доля іх паступае ад аператараў мабільных паслуг, якія інтэнсіўна будуюць спецыяльныя вышкі.

На тэрыторыі Сенненскага раёна восем сельсаветаў і адзін пассавет — Багушэўскі. У апошні час усе яны вельмі зацікаўленыя ў продажы зямельных участкаў грамадзянам пад будаўніцтва.

— Мы не кінутыя землі прапаноўваем купіць на аўкцыёне, а ўчасткі каля азёраў, лесу, — працягвае Міхаіл Мікалаевіч. — У наш час восемдзесяць сотак у жывапісным месцы — гэта ж добрае ўкладанне грошай! І людзі, якія хочуць купіць участкі, выдатна гэта разумеюць. І мясцовым уладам гэта выгадна. Ужо 2,5 мільёна рублёў на продажы зямлі зарабілі. Рыхтуюцца да продажу ўчасткі на тэрыторыі Багушэўскага пассавета, у Студзёнкаўскім, Ходцаўскім сельсаветах. Дарэчы, літаральна сёння ў апошнім прадалі ўчастак зямлі за 1,7 мільёна рублёў.

Будзем рады, калі і жыхары сталіцы захочуць пабудаваць дамок у вёсцы менавіта ў нас. І краявіды тут непаўторныя, і Віцебск — радзіма Шагала і «Славянскага базару» — недалёка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# БЕЛАРУСКАЯ ПРАКТЫКА

**Незадоўга да святкавання Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай галіны аграпрамысловага комплексу ў Смаленску завяршыўся другі форум «Сельская моладзь і інавацыйнае развіццё». Сёлета яго арганізатары для абмеркавання праблем маладых спецыялістаў запрасілі прадстаўнікоў 17 рэгіёнаў Цэнтральнай Федэральнай акругі Расіі.**

У пошуку адказаў на вельмі складанае для расіян пытанне — як вярнуць моладзь у вёску — у ходзе дыскусій яе ўдзельнікі неаднаразова спасылаліся на практыку мясцовай улады Беларусі, дзе шмат робіцца для замацавання моладзі ў вёсцы. У прыватнасці, як станоўчы момант адзначалі вялікі клопат нашай дзяржавы пра комплекснае адраджэнне вёскі, стварэнне па ўсёй Беларусі аграгарадкоў. На форуме гаварылі і пра наяўнасць адпаведнай нацыянальнай праграмы, якая выконваецца ў сапраўднасці, а не на паперы. Многія ўдзельнікі форуму выступалі за ўкараненне беларускай сістэмы дзяржаўнага размеркавання маладых спецыялістаў.

Такая цікаўнасць да нашай краіны невыпадковая. Смаленск, як вядома, трывала звязаны з Беларуссю. У гэтым расійскім рэгіёне пераймаюць у беларусаў практыку навядзення парадку на зямлі, замацавання маладых спецыялістаў у гаспадарках, забеспячэння іх годным жыллём у вёсцы. Дарэчы, многія выпускнікі расійскіх сельскіх ВНУ, якія ўдзельнічалі ў форуме, актыўна цікавіліся становішчам сельскай гаспадаркі ў Беларусі, дзейнасцю органаў мясцовай улады ў развіцці аграрнай галіны.

**Леанід ТУГАРЫН.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договора аренды земельного участка в Глубокском районе**
**Организатор: РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»**

| ЛОТ № | Вид аукциона | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения, срок аренды Инженерно-геологические условия* | Расходы, связанные с изготовлением документации, руб. | Начальная цена, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | д. Шуневцы, ул. Садовая, д. 2а Коробовского с/с Глубокского района Витебской области, площадью 0,2485 га, кадастровый номер 221582818601000146 | - охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В – 0,0084 га | 485 030 | 1 000 000 |
| 2 | | д. Долгое, ул. Озерная, д. 21 Зябковского с/с Глубокского района Витебской области, пл. 0,1644 га, кадастровый № 220882014601000027 | - земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов 0,1644 (озеро Долгое) | 492 690 | 2 000 000 |
| 3 | на право заключения договора аренды | «Комплекс зданий и сооружений придорожного сервиса» на землях землепользователей Глубокского района Витебской области, площадью 0,6999 га, кадастровый номер 221500000001000031 | - срок аренды 40 лет;<br>- водоохранная зона ручья № 11 – 0,700 га;<br>- охранная зона линии электропередачи напряжением 10кВ – 0,040 га;<br>- проведение проектно-изыскательских работ в срок до 2 лет;<br>- снятие плодородного слоя почвы, сохранение, использование его для благоустройства данного участка | 2 144 399 | 160 920 |

* инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания и сооружения на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры территории: возможность подключения к инженерным сетям.

1. Аукцион состоится **18 декабря 2009 года в 11.00** по адресу: Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 42.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положениями, утвержденными Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года № 462. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Последний день приема заявлений и документов **14.12.2009 года до 17.00.** Заключительная регистрация участников **18.12.2009 года с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

3. К участию допускаются по Лотам 1, 2 – физ. лица (граждане Республики Беларусь), по Лоту 3 – физ. и юр. лица, подавшие документы в соответствии с п.4 настоящего извещения. Задаток за участие в аукционе составляет 10 % от начальной цены лота. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», ул. Ленина, 22/16, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

4. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении подать заявление, подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить следующие документы: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность.

5. УСЛОВИЯ: по ЛОТам 1, 2 – осуществление Победителем аукциона в 2-месячный срок после принятия решения местным исполнительным комитетом о передаче ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства о государственной регистрации права на него; по ЛОТу 3: заключение Победителем аукциона с Глубокским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка гос. регистрации права на земельный участок; получение Победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

6. Ориентировочные затраты на организацию и проведение аукциона составляют 1 093 631 рубль по каждому лоту. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона будут объявлены дополнительно перед проведением торгов.

**Контактные телефоны: 8 (0212) 435 435; 435 495; 8 (029) 591 00 02; 8 (029) 384 24 05;**
**эл.почта: vit.in@tut.by; www.Ocenka.by, тел. в г. Глубокое (802156) 2 19 37**

# ААТ «ГРОДНА АЗОТ»: у цяжкім становішчы, але з разуменнем, што рабіць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зрэшты, мала прааналізаваць сітуацыю, галоўнае — яе выправіць. Калі мне прапанавалі за гэта ўзяцца, то я не паддаўся на нейкія імгненныя падпісанні. Узяў месяц на тое, каб прыняць завод. І прыняў па акце з дадаткам, у якім паказаў усю глыбіню сітуацыі, пасля чаго папрасіўся на прыём ва ўрад. І калі сітуацыя была зразумета ва ўрадзе так, як яна ёсць, усе ўключыліся ў работу.

Я добра разумею, што калі запушчана праграма, якую трэба спыніць, то яна ўжо наносіць пэўны ўрон. Але я слаба сабе ўяўляў глыбіню фінансавай «ямы», у якой апынулася прадпрыемства. Меркаваў, што залезлі ў крэдыты толькі пад маёмасць новабудоўляў. У сапраўднасці ж, як кажа адзін мой сябар, усё не так дрэнна, усё значна горш. Акрамя прыкладна 250 мільярдаў беларускіх рублёў па новабудоўлях (незавершанага будаўніцтва назапасілася амаль на 300 мільярдаў рублёў), у нас былі яшчэ і даўгі па бягучых плацяжах. Гэта значыць, што ўласных грошай, атрыманых ад продажу нашага тавару, не хапае, каб разлічыцца за сыравіну, электраэнергію, па зарплаце. Першы месяц, калі я пачаў працаваць, жнівень, складваўся так. 170 мільярдаў рублёў — наш прыход грошай і і 270 мільярдаў — расход. Значыць, трэба ісці ў банк, браць крэдыты і аплачваць нашы расходы. За студзень — жнівень гэтага года толькі на абслугоўванне крэдытаў і іх частковае вяртанне мы патрацілі каля 315 мільярдаў рублёў, тады як на сыравіну для вытворчасці — 288 мільярдаў рублёў. Прадпрыемства настолькі закрэдытавана, што на адзін рубель прададзенай прадукцыі сёння траціцца рубель і трыццаць капеек, з якіх сорак капеек — на абслугоўванне банкаўскіх крэдытаў. Пры гэтым сярэдняя стаўка, якая цяпер выплачваецца па крэдытах, 14,9 працэнта, а рэнтабельнасць работы прадпрыемства ў цэлым — 3,9 працэнта. Мы доўга пражывём у такой сітуацыі?

> **«Калі мы ўклалі грошы, нешта набылі, то павінны ведаць, калі гэтыя сродкі вернуцца. Тым больш што гэтыя сродкі ўкладзеныя не сабе ў хату на мэблевы гарнітур. Так, можна ўкласці грошы, выканаць паказчык, але ці дасць ён аддачу? А калі не дасць, то навошта гэты паказчык?»**

***— Дзе ж выйсце з гэтай даўгавой «ямы» і што канкрэтна робіцца?***

— Ёсць некалькі шляхоў. Першы датычыцца ўжо распачатых праектаў. Паколькі незавершанае будаўніцтва яшчэ больш абцяжарвае наша фінансавае становішча, то мы, зразумела, будзем завяршаць праекты, якія выйшлі на заключную фазу. Аднак мы не будзем выконваць далей інвестыцыйную праграму, якая не вырашае задачы кардынальнага павышэння эфектыўнасці вытворчасці і па большасці праектаў мае працяглы тэрмін акупляльнасці, у тых аб'ёмах, што былі намечаны.

Гэта першы шлях па скарачэнні так званых вялікіх крэдытаў. Другі — аднаўленне ўласных абаротных сродкаў. Ён заключаецца ў наступным. Паколькі ўсе прызвычаіліся вельмі, скажам так, шырока крочыць, то на складах прадпрыемства, як паказаў аналіз, скапілася на 48 мільярдаў рублёў прадукцыі, запасных частак і іншага тавару, які шмат гадоў проста ляжыць без руху і не ўдзельнічае ў вытворчым працэсе. Прычым нашы спробы яго рэалізаваць натыкнуліся на нормы беларускага заканадаўства, якія гэта забараняюць. Аказваецца, калі вы набылі маёмасць і не можаце ёй скарыстацца, то і прадаць яе не можаце па сённяшняй цане на рынку. А толькі не ніжэй за цану набыцця. Гэта, сама меней, здзіўляе. Няхай неліквіды і далей ляжаць мёртвым грузам у нашых кладоўках замест таго, каб хоць нейкі іх кошт вярнуць у абаротныя сродкі прадпрыемства?!

Мяркую, я не першы, хто задаецца такім пытаннем. Дык давайце ж вырашым гэту задачу, якая, не сумняваюся, хвалюе не толькі нас, але і іншыя прадпрыемствы. І калі ёсць занепакоенасць, што на рэалізацыі неліквідаў захоча зарабіць нехта нячысты на руку, то давайце арганізуем гэту справу на дзяржаўнай аснове, забяспечым адпаведны дзяржаўны кантроль.

Яшчэ адзін шлях у кірунку нармалізацыі фінансавага становішча — нашы расходныя нормы, сыравінныя патокі: як мы на іх уплываем? І тут аказалася шмат рэзерваў, якія можна аценіць прыкладна ў 40 мільярдаў рублёў. У гэтым пытанні мяч, як кажуць, на нашым баку і мы ўводзім жорсткія нормы, патрабаванні. З мэтай скарачэння расходаў будзе працаваць балансавая камісія. У тым ліку і што датычыцца расходных нормаў, звязаных з працай падрадных арганізацый. Сёлета да майго прыходу мы выплацілі падрадчыкам столькі грошай, колькі зарплаты свайму 7,5-тысячнаму калектыву. Пры гэтым асабліва не думаючы, а ці патрэбна нам гэта. Навошта нам з накладнымі расходамі ўтрымліваць нейкую падрадную арганізацыю, калі гэта работа не з'яўляецца спецыфічнай і мы яе самі можам выканаць?

Альбо такая праблема, таксама звязаная з нашымі ўнутранымі рэзервамі. У нас ёсць шэраг структурных падраздзяленняў, якія прыносяць страты. У прыватнасці, агульны аб'ём затрат па аўтатранспартным цэху за верасень склаў прыкладна адзін мільярд рублёў, у тым ліку больш за 300 мільёнаў — на зарплату яго работнікам. А даходу гэты цэх прынёс каля 500 мільёнаў рублёў. Мы прапанавалі гэтаму і іншым нерэнтабельным падраздзяленням пашукаць свае ўнутраныя рэзервы, а калі гэта не атрымаецца, то найбольш рэальным варыянтам бачыцца іх перавод у арэндныя калектывы. Сёння кожны павінен думаць, як зарабіць грошы. Бяры, дапусцім, у арэнду аўтобус і працуй, зарабляй, каб і табе было выгадна, і прадпрыемству.

> **«Сёння кожны павінен думаць, як зарабіць грошы. Я бачу адной са сваіх задач прывіць людзям гэта разуменне, што за іх ніхто непакоіцца не будзе, што сацыяльна арыентаваная дзяржава — гэта не значыць дойная карова. І калі сёння гэта не зразумець, то заўтра будзе позна».**

Я бачу адной са сваіх задач прывіць людзям разуменне: за іх ніхто непакоіцца не будзе, што сацыяльна арыентаваная дзяржава — гэта не значыць дойная карова. І калі сёння гэта не зразумець, то заўтра будзе позна.

***— Як жа ўспрымаецца такі падыход?***

— Разумею, што гэта не адразу даходзіць. Чалавек прыходзіў на працу, была гарантаваная зарплата, а тут — аўтобус вазьмі ў арэнду... Але я не саромеюся выходзіць у калектыў, сустракацца з прафсаюзным актывам. Раз, два, тры патлумачыў — на чацвёрты людзі ўжо прыходзяць з прапановамі.

***— Як вядома, даўняя праблема «Азота» — гэта запазычанасць за пастаўленыя на айчынны рынак азотныя ўгнаенні. Ці няма сельгасработ, калі аграрнікі рэалізуюць сваю прадукцыю і разлічацца за ўгнаенні, гэта папера ў банка выкупляецца.***

***— Ці чакаецца на прадпрыемстве скарачэнне кадравага складу?***

— Чаго я не маю на ўвазе, дык гэта прамога скарачэння кадраў. І вось чаму. Гэта нерэнтабельна. Чаго дабʼёмся? Возьмем цэх аміяку. У сабекошце яго тавару зарплата складае адзін працэнт. Звольнім пяць-шэсць чалавек і што атрымаем, акрамя сацыяльнага незадавальнення? Да таго ж, колькасць работнікаў на хімічных прадпрыемствах і так аптымізаваная, ды і рэзерв павінен быць, паколькі для падрыхтоўкі талковага хіміка неабходна некалькі гадоў. Таму ісці на сацыяльныя канфлікты дзеля нейкай незразумелай выгады няма ніякага сэнсу — і з чыста чалавечых, і з камерцыйных меркаванняў.

Ёсць, паўтаруся, іншы шлях — атрымаць больш эфектыўную працу і аддачу ад усіх структурных падраздзяленняў.

***— У цяперашнім эканамічным становішчы ці захаваюцца сацыяльныя гарантыі для работнікаў прадпрыемства? Якім будзе далейшы лёс дзіцячых садкоў, лячэбна-аздараўленчых і іншых аб'ектаў, што знаходзяцца на балансе ААТ «Гродна Азот»?***

— Сацыяльная праграма не павінна разглядацца як нешта адарванае ад прадпрыемства. У прыватнасці, нягледзячы на ўсе даўгі, мы цяпер узяліся за рамонт нашага прафілакторыя «Жамчужына», склалі графік работ, і неўзабаве ён, як і належыць, будзе выконваць свае аздараўленчыя функцыі.

Але ёсць і іншае пытанне. Сёння на балансе прадпрыемства 8 дзіцячых садкоў, дзе толькі 30 працэнтаў дзяцей, чые бацькі ў нас працуюць. Пры гэтым прадпрыемства плаціць усе прадугледжаныя заканадаўствам падаткі, удзельнічае ў фарміраванні гарадскога бюджэту, з якога павінны фінансавацца дзіцячыя ўстановы. Таму неабходна вырашаць пытанне аб іх перадачы гораду альбо сумесным фінансаванні.

***— Ігар Фёдаравіч, ці адчуваеце падтрымку на вышэйшых узроўнях дзяржаўнай улады? І як ставяцца да новых падыходаў у калектыве прадпрыемства?***

— Цяпер мы ўжо маем пратакол нарады, якая адбылася на прадпрыемстве з удзелам першага намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра Сямашкі. Прыняты вельмі важныя рашэнні па ключавых пытаннях і па шмат з іх ужо праводзіцца канкрэтная праца.

Што ж датычыцца калектыву, то спачатку без непаразуменняў не абыходзілася. Некаторыя людзі, пэўна, думалі, што новы кіраўнік пачне шукаць, хто вінаваты, і спрабавалі схаваць свае «грахі». Аднак калі стала зразумела, што вінаватых не шукаюць, а думаюць, што зрабіць, то на гэтым нашы непаразуменні скончыліся. Мяркую, што на сёння калектыў, скажам так, выстраіўся пад агульную задачу. І, спадзяюся, што мы разам наяўныя праблемы вырашым.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# КРОХКАЯ СПАДЧЫНА

Парламенцкі дзённік

## Падчас выязнога семінара народныя абраннікі абмеркавалі праблемы захавання гісторыка-культурных каштоўнасцяў

**СТАРАДАЎНІЯ муры, цікавыя народныя абрады — гэта наша жывая гісторыя, самы каштоўны нацыянальны скарб. Тое, што дазваляе нам захаваць сваю адметнасць, самабытнасць, вылучыцца сярод іншых народаў і разам з тым адчуць сваю згуртаванасць, з'яднанасць агульнымі каштоўнасцямі. І скарб гэты мае патрэбу ў чуйнай, надзейнай ахове. 4787 аб'ектаў уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Чатыры выдатнасці, якія цалкам або часткова знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, аднесеныя да сусветнай спадчыны ЮНЕСКА: Белавежская пушча, замкавы комплекс «Мір», архітэктурна-культурны комплекс «Рэзідэнцыя Радзівілаў у Нясвіжы» і Геадэзічная дуга Струвэ. Свой унёсак у агульную справу па захаванні нацыянальнай спадчыны робяць заканадаўцы. Чарговы выязны семінар ніжняй палаты парламента прайшоў па маршруце Нясвіж — Мір.**

— Вывучэнне таго, як ішла тут работа, з якімі праблемамі, у тым ліку, заканадаўчымі, сутыкаліся прадстаўнікі ўлады і будаўнікі, навукоўцы і рэстаўратары, дапаможа нам вызначыць болевыя пункты ў заканадаўстве, намеціць перспектывы яго ўдасканалення, — падкрэсліў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. — У будучыні гэтыя прапановы могуць стаць нарматыўнымі палажэннямі адпаведных заканадаўчых актаў, у першую чаргу Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», з даты прынятця якога прайшло ўжо больш як тры гады.

Спікер адзначыў, што пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны аднесеныя ў Беларусі да прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі. Захаванне і эфектыўнае выкарыстанне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны разглядаюцца таксама і як важны складнік эканамічнага росту.

— Прадуманая палітыка ў гэтай сферы садзейнічае павышэнню эканамічнай актыўнасці насельніцтва, стварэнню новых працоўных месцаў. Трэба памятаць і пра ролю гісторыка-культурных каштоўнасцяў у фарміраванні прывабнага іміджу краіны ў вачах міжнароднай супольнасці, — дадаў палітык.

Ён звярнуў увагу ўдзельнікаў семінару на тое, што, разглядаючы сучасную сітуацыю ў сферы гісторыка-культурнай спадчыны і прапановы па ўдасканаленні заканадаўчай базы, трэба прагназаваць яе развіццё з улікам лібералізацыі эканомікі, павышэння дзелавой актыўнасці (у тым ліку ў сферы турызму), інтэграцыі ў сусветныя эканамічныя і культурныя працэсы.

— Патрабуе заканадаўчага рашэння пытанне аб праве ўласнасці на зямлю, на якой знаходзіцца аб'ект спадчыны. Улічваючы асаблівую актуальнасць пытанняў інвестыцыйнай дзейнасці ў справе захавання і аднаўлення нерухомых помнікаў, мэтазгодна іх адлюстраваць у заканадаўстве аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Акрамя таго, у ім павінны шырока прымяняцца палажэнні міжнародных нарматыўных дакументаў ЮНЕСКА. Усё гэта будзе разглядацца ў рамках работы па кадыфікацыі заканадаўчых актаў у сферы культуры.

Да распрацоўкі Кодэкса аб культуры плануецца прыступіць да канца работы Палаты прадстаўнікоў дзейнага склікання, — паведаміў Уладзімір Андрэйчанка журналістам. І сёння важна пазнаёміцца з практыкай прымянення наяўнага заканадаўства, ацаніць, якія папраўкі трэба ўнесці. Неабходную глебу стварыць і гэты навучальны семінар.

— На наступны год у праекце бюджэту запланавана каля 50 млрд рублёў на рэстаўрацыйныя, аднаўленчыя работы, таму што шкадаваць на гэта грошай не трэба — культура нам заўжды адплаціць, — адзначыў спікер. — Сёння развіццё турыстычнага бізнэсу — вельмі важны момант, які станоўча дзейнічае на эканоміку краіны. Шмат сёлета зроблена па лібералізацыі нашай эканомікі, і калі сёння ўзнімаюць пытанне кіраўнікі, што вось не хапае гасцініц і гэтак далей — я лічу, сёння гэта задача не дзяржавы наогул: мы стварылі нармальную нарматыўна-прававую базу і ў гэту работу павінен актыўна ўключацца бізнэс. І літаральна на гэтай сесіі мы будзем адпаведны закон прымаць — аб падтрымцы малога і сярэдняга бізнэсу, улічым усе прапановы, якія пачулі сёння.

**Міністр культуры Павел ЛАТУШКА** ў сваім выступленні на семінары абазначыў прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурных каштоўнасцяў — як матэрыяльных, так і нематэрыяльных.

— Варта павысіць ролю Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры ў разглядзе навукова-праектнай дакументацыі, арганізацыі нагляду за ходам рэстаўрацыйных работ на аб'ектах спадчыны, выпрацоўцы метадычных падыходаў па іх прыстасаванні, утрыманні, прымяненні будаўнічых матэрыялаў і тэхналогій падчас рэстаўрацыі і рэканструкцыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Гэтыя пытанні сапраўды павінны вырашаць спецыялісты, якія ўваходзяць у раду, — мяркуе кіраўнік ведамства.

Важным кірункам ён назваў навуковы нагляд пры выкананні работ на аб'ектах спадчыны.

— І тут мы гаворым пра неабходнасць павышэння ўзаемадзеяння навукоўца кіраўніка з заказчыкам і падрадчыкам. Пры гэтым заказчык павінен разумець ступень непасрэднай адказнасці за вынікі рэстаўрацыі, а падрадна-будаўнічая арганізацыя павінна ўсведамляць своеасаблівасць характару прац на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Спадар Латушка паведаміў таксама, што ў планах — аднавіць дзейнасць рэстаўрацыйнага савета пры Мінскульце, задачай якога павінен стаць не толькі паэтапны аналіз ходу работ па рэстаўрацыі твораў мастацтва, але і прысваенне кваліфікацыйных катэгорый спецыялістам-рэстаўратарам.

Міністр прыгадаў цікавыя помнікі архітэктуры, якія сёння, на жаль, знаходзяцца ў заняпалым стане і зрабіў акцэнт на прыцягненні інвестараў у гэту сферу — для правядзення комплексу рэстаўрацыйных работ на помніках культуры і іх прыстасавання для патрэб развіцця розных формаў турызму. У сувязі з гэтым, на думку П. Латушкі, мэтазгодна разгледзець пытанне аб падатковых ільготах. «Мы павінны быць рэалістамі — на працягу некалькіх гадоў мы не вырашым гэтую праблему, таму трэба шукаць дадатковыя варыянты прыцягнення прыватнага капіталу ў гэту сферу».

Спадар Латушка па традыцыі выступаў па-беларуску, многія дэпутаты таксама пераходзілі на беларускую мову, каб задаць пытанні міністру і нават дзякавалі, маўляў, мова — наша самая галоўная каштоўнасць.

— Гэта абсалютна натуральна, нармальна і лагічна, што міністр культуры Беларусі размаўляе па-беларуску, і за гэта дзякаваць не трэба. На гэта проста не трэба звяртаць увагі, — сказаў Павел Латушка.

Дэпутаты звярнуліся да яго з пытаннямі і прапановамі па інвестыцыйным складніку, распрацоўцы нацыянальнай праграмы аднаўлення гісторыка-культурных каштоўнасцяў, узмацненні санкцый за вандалізм у дачыненні да помнікаў культуры.

— Мы не супраць нацыянальнай праграмы, але давайце будзем рэалістамі: ці ў стане сёння ўрад выдаткаваць на гэта значныя грошы, — адзначыў міністр культуры. — Тое, што зроблена дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта і Урада за апошнія 10 гадоў, ніколі ў гісторыі нашай краіны не рабілася. А мы так і працягваем крытыкаваць... Адразу ж усяго не зробіш. Ідэя добрая, мы прапрацуем яе.

Пыталіся народныя абраннікі і пра рэстаўрацыю замкаў.

— Навагрудскі, Крэўскі замкі, руіны Гальшанскага... Мы не казалі пра тры гэтыя аб'екты адначасна, — трэба быць рэалістамі. З рэспубліканскага бюджэту знайсці грошы на гэтыя аб'екты сёння нерэальна. Праз два-тры-чатыры гады мы будзем прапаноўваць разглядаць гэтыя аб'екты на магчымую рэстаўрацыю, але сёння мы гаворым пра абранне аднаго аб'екта і за кошт менавіта прыцягнення грамадскай увагі, грамадскіх сродкаў, у нас ёсць латарэя «Скарбніца», правесці рэстаўрацыю аднаго з гэтых трох аб'ектаў. Які менавіта? Я думаю, што ў самы блізкі час мы акрэслімся.

Сваімі ўражаннямі ад убачанага ў Міры і Нясвіжы падзяліўся з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір ЗДАНОВІЧ**:

— На прыкладзе Мірскага замка (дзе дэпутатам прадэманстравалі гасцявыя апартаменты, якія размясціліся наўпрост унутры легендарнага замка — **Аўт.**) мы назіраем, —гэта маё суб'ектыўнае меркаванне, таму што я не спецыяліст, і кажу як абывацель, — мне падаецца, некаторы перахлёст менавіта ў бок эканомікі ва ўрон культурна-гістарычнай спадчыне. А вось што датычыцца Нясвіжа, там, мне падаецца, гарманічна ідзе працэс рэстаўрацыі. У гэтых пытаннях мы павінны абіраць залатую сярэдзіну, каб у пагоні за прыбыткам не згубіць унікальную каштоўнасць. Можна ўкладваць сродкі ў рэстаўрацыю, і максімальна набліжаць аб'ект да патрэбаў сучаснасці, усю інфраструктуру рабіць унутры аб'екта — унікальнага будынка. На мой погляд, гэта не зусім добра. Сучаснага чалавека не здзівіш камфортам. Яму цікава паглядзець на тое, што было некалькі стагоддзяў таму. Усё ж такі калі чалавек ідзе па замку, у яго павінна ўзнікаць адчуванне старажытнасці, сівой даўніны, уражанне таго, што аднекуль раптам з'явіцца прывід. За гэта людзі гатовыя плаціць грошы. А ўся інфраструктура павінна знаходзіцца недзе побач, прынамсі, за межамі таго ж замкавага комплексу. На мой погляд, гэта самы прымальны варыянт. Таму што мы можам ператвараць унікальныя збудаванні ў сучасныя гатэлі, яны першапачаткова, магчыма, і будуць карыстацца попытам, але потым людзі згубяць да іх інтарэс — асабліва дасведчаныя, спакушаныя гісторыка-культурным турызмам... З іншага боку, мы сёння церпім з-за таго, што ў нас ёсць добра адноўленыя помнікі даўніны, але вакол іх няма інфраструктуры і з-за гэтага страчваем вялікія грошы, таму што замежныя госці на некалькі дзён спыняюцца недзе на суседніх тэрыторыях і потым транзітам едуць праз Беларусь, таму што тут ля тых жа вось унікальных збудаванняў проста няма нармальных умоў існавання, праблема з гасцініцамі і ля Нясвіжа... І істотныя сумы грашовых сродкаў застаюцца на сумежных тэрыторыях, а мы страчваем прыбыткі за кошт культурнага турызму.

Дэпутат таксама звярнуў увагу на гісторыка-культурныя каштоўнасці катэгорыі тры:

— Яны практычна не забяспечаныя ніякімі фінансавымі рэсурсамі. І тут трэба шырэй прыцягваць прадпрымальнікаў. Таму што людзі часам не разумеюць, што пабудаваць невялікую крамачку, гатэльчык каля помніку даўніны няхай сабе і трэцяй катэгорыі, і маленькую капейку пусціць на падтрыманне гэтага помніка — гэта ўнікальнасць, непаўторнасць гандлёвай маркі, гэта магчымасць атрымаць у будучыні велізарны прыбытак. Я думаю, тут трэба прыцягваць увагу нашых прадпрымальнікаў, каб яны пра гэта задумаліся.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# Браслаўскія рыштаванні

У Браславе ў прыазёрнай частцы горада распачата рэстаўрацыя мемарыяльнай кампазіцыі на воінскім пахаванні 1944 года. Аднаўленча-рамонтныя работы вядзе брыгада пад кіраўніцтвам Івана Сцефановіча будаўнічай фірмы «Віталіч-Луг».

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Сяргей ГУРЭНКА:

# «ХАДЗІЛА ШМАТ РАЗМОЎ, ШТО «ДЫНАМА» ПАВІННА ЎСІМ «ЗЛІЦЬ». МЫ ІХ СПЫНІЛІ»

**МЕНАВІТА сталічнае «Дынама», якое загадзя аформіла віцэ-чэмпіёнства, у апошніх турах прадэманстравала сумленнасць і прынцыповасць. У перадапошнім туры каманда сапсавала настрой і планы «Гомеля», абыграўшы яго на выездзе, чым і садзейнічала вылету клуба ў першую лігу. Магчыма, і адпомсціла за хатні пройгрыш у першым крузе — тады лік быў такім жа — 1:2, толькі на карысць «Гомеля». У апошнім матчы сталічныя бела-блакітныя гэтак жа бязлітасна расправіліся з «Дняпром» — на сваім стадыёне, але з немалой колькасцю магілёўскіх заўзятараў, якія прыехалі ў Мінск, каб стаць сведкамі зававання бронзы. Прычым лік у матчы адкрылі магіляўчане, і нічога не прадракала ім бяды — першы тайм скончыўся ўнічыю — 1:1. А вось у другім было забіта 5 мячоў, прычым 4 з іх дынамаўцамі. Калі б не сюрпрыз ад «Граніта», які абыграў «Шахцёр», паехалі б магіляўчане ў нядзелю дамоў ні з чым. Так атрымалася, што ў нядаўніх кубкавых матчах «Дынама» таксама патрапала «Днепр» — 4:2 і 3:1. Пракаментаваць апошнія гульні карэспандэнт «Звязды» папрасіла галоўнага трэнера каманды — віцэ-чэмпіёна Сяргея Гурэнку.**

— Шчыра кажучы, гэтыя закулісныя размовы, крыніц якіх я не ведаю, што мы цяпер павінны ўсім «зліць», проста надакучылі. Я рады, што мы ўсім даказалі, што гэта пустыя плёткі.

***— Наколькі складана вам матываваць каманду, калі яна сваю задачу выканала?***

— Хлопцы набралі форму, яны самі імкнуцца наперад, футбол для іх у радасць, таму зараз галоўнае — не перакаджаць ім.

***— «Дынама» чамусьці найбольш упэўнена выступае і выйграе, калі ёй нічога вырашаць ужо і не трэба...***

— Выйграваць трэба заўсёды. Так атрымалася сёлета, на мой погляд, таму, што мы далекаватая БАТЭ ў першым крузе адпусцілі.

***— Сёння праз некалькі гадзін пасля матча ў каманды банкет па прычыне...***

— Заканчэння сезона...

***— ...Ці капітан Паўлюковіч, які скончыў кар'еру, прастаўляецца? (Перад пачаткам апошняга матча, які стаў для Сяргея Паўлюковіча развітальным, намеснік генеральнага дырэктара групы кампаній «Трайпл» і ўладальніка «Дынама» Юрыя Чыжа Уладзімір Япрынцаў уручыў шматгадоваму капітану бела-блакітных ключы ад кітайскага пазадарожніка Great Wall, — Аўт).***

— Не, зразумела. Футбол — такая рэч, якая заканчваецца. Вечна гуляць не будзеш. Трэба пачынаць новае жыццё. Для Сяргея цяпер вельмі спрыяльны момант.

***— У вас таксама быў такі ж спрыяльны час...***

— Я, шчыра кажучы, не быў да яго гатовы.

***— Пасля таго былі моманты, калі вы пашкадавалі аб прынятым рашэнні ператварыцца з гульца ў галоўнага трэнера?***

— Сёння магу адназначна сказаць — не. Радасць хлопцаў, якую я сёння бачыў, была вартая таго. Значыць, я быў патрэбны ім.

***— У эмацыянальным плане дзе прасцей знаходзіцца — на полі ці на трэнерскай лаўцы?***

— На полі лягчэй — там можна ўсё выправіць самому.

***— Які з матчаў, якія вы правялі ў якасці галоўнага трэнера, найбольш папсаваў вам нервы?***

— Матч з брэсцкім «Дынама». Ён стаў пераломным. Я за сваю кар'еру ніколі так не радаваўся. Нават калі станавіўся чэмпіёнам, не памятаю такіх эмоцый, якія былі перажытыя перад і пасля перамогі ў Брэсце. Гэта была радасць за хлопцаў, за каманду, яна ні з чым у гульнявой кар'еры не параўнальная.

***— Збоку здавалася, што найбольш эмоцый вы пакінулі ў Барысаве на матчы з БАТЭ...***

— Гэта БАТЭ да нас ставіцца неспакойна, а я іх нармальна ўспрымаю. Для іх «Дынама» дадаткова раздражняльнік. Так чамусьці атрымліваецца, што БАТЭ лічыць, што адны яны гуляюць у чэмпіянаце. І іх трэнер бачыць толькі сваю каманду. Я прывучаю сваіх гульцоў з павагай ставіцца да суперніка.

***— Нават калі супернік — запісны аўтсайдар?***

— У такіх выпадках я кажу гульцам, што на стадыёне прыходзяць балельшчыкі. І яны хочуць бачыць толькі перамогу. Футбол існуе не для трэнераў, не для супрацоўнікаў клуба, а для заўзятараў.

***— Дарэчы, вы задаволеныя той колькасцю балельшчыкаў, якія падтрымлівалі ў гэтым сезоне каманду на хатнім стадыёне «Дынама-Юні»?***

— Маскоўскі «Лакаматыў» пачынаў з такой жа колькасці заўзятараў. Чым больш яркую гульню мы будзем дэманстраваць, тым больш у нас з'явіцца прыхільнікаў. Спадзяюся, што калі мы будзем выступаць гэтак жа, як напрыканцы гэтага сезона, у нас балельшчыкаў будзе шмат. І прыйдзецца перабудоўваць стадыён.

***— Калі ўзніклі паралелі з маскоўскім «Лакаматывам», у якім кампаненце найперш саступае наша першынство расійскаму?***

— У хуткасці. Прычым найперш у хуткасці мыслення. Мне тут гуляць было больш складана.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КАРЭЙЦЫ ПАСТРАЛЯЛІ АДЗІН У АДНАГО

**У Жоўтым моры каля заходняга ўзбярэжжа Карэйскага паўвострава адбылося баявое сутыкненне паміж ваеннымі караблямі Паўднёвай Карэі і КНДР.**

Патрульны катэр КНДР перасёк паўночную размежавальную лінію, якая служыць фактычнай марской мяжой паміж дзвюма Карэямі. Гэтае дзеянне вымусіла паўднёвакарэйскія ВМС даць папераджальныя стрэлы, на што катэр КНДР адказаў агнём. Сутычка адбылася паблізу вострава Пенэнда ў некалькіх кіламетрах на поўдзень ад лініі. У выніку сутыкнення ВМС Паўднёвай Карэі стратаў не панеслі, тады як паўночнакарэйскаму судну была нанесеная «значная шкода». Баявыя сутыкненні паміж караблямі ВМС Паўднёвай Карэі і КНДР адбываліся ў Жоўтым моры і раней, але апошні падобны інцыдэнт, які суправаджаўся стратамі з абодвух бакоў, меў месца 29 чэрвеня 2002 года.

### У РАСІІ БУДУЦЬ ЗМАГАЦЦА З ДЗЕДАЎШЧЫНАЙ?

**У 2010 годзе ва Узброеных сілах РФ з'явіцца ваенная паліцыя.**

Новы інстытут зойме месца навядзеннем парадку і ўмацаваннем законнасці ў войску і на флоце. Як чакаецца, колькасць ваеннай паліцыі складзе каля 5 тысяч чалавек, падпарадкоўвацца яна будзе першаму намесніку міністра абароны. Да таго, як ваенная паліцыя з'явіцца ва Узброеных сілах, у Галоўным упраўленні баявой падрыхтоўкі і службы войскаў будзе ўведзены аддзел ваеннай паліцыі. Сваю працу ён пачне 1 снежня.

### БЕРЛУСКОНІ ЗАСНУЎ У БЕРЛІНЕ

**Прэм'ер-міністр Італіі задрамаў у разгар юбілейных урачыстасцяў у сталіцы Германіі.**

На святкаванні 20-годдзя падзення Берлінскай сцяны Сільвіа Берлусконі падчас выступленняў палітыкаў папросту заснуў на вачах усіх прысутных. Гледзячы па ўсім, частыя пералёты і бяссонныя бурныя ночы згубна адбіваюцца на самаадчуванні італьянскага прэм'ера. 72-гадовы палітык ужо не ў сілах спраўляцца са сваімі шматлікімі абавязкамі, у якія, як вядома, уваходзяць і рэгулярныя сустрэчы з разнастайнымі красунямі, паведамляе Life News.

### MTV УРУЧЫЛА ПРЭМІЮ ГАРБАЧОВУ

**Першы Прэзідэнт Савецкага Саюза Міхаіл Гарбачоў адзначаны ўзнагародай MTV. Палітык атрымаў прэмію Free Your Mind падчас 16 па ліку штогадовай цырымоніі MTV Europe Music Awards 2009, якая адбылася ў Берліне.**

Былы кіраўнік СССР прыняў узнагароду з рук старшыні і выканаўчага дырэктара MTV Networks International Біла Роўдзі. Прэмію Free Your Mind прысуджаюць за барацьбу з нецярпімасцю, расавымі і рэлігійнымі забабонамі і іншыя дасягненні ў гуманітарнай сферы. Узнагарода прысуджаецца асобе або арганізацыі, якія ўвасабляюць свабодалюбныя прынцыпы жыцця MTV.

## Суд задаволіў іск начальніка ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці аб абароне дзелавой рэпутацыі

**КАСАЦЫЙНАЯ інстанцыя Гомельскага абласнога суда задаволіла іск начальніка ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці Івана Каржа аб абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі і абавязала адказчыка абвергнуць недакладныя звесткі, размешчаныя ў інтэрнэт-публікацыях, паведамілі ў судзе.**

Раней начальнік УКДБ па Гомельскай вобласці як прыватная асоба звярнуўся ў Гомельскі раённы суд з іскам аб абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі пасля серыі публікацый, размешчаных у інтэрнэце сваякамі міліцыянераў, затрыманых па так званай паляўнічай справе. У іх рабіліся заявы аб тым, што затрыманне і арышт міліцыянераў напрамую звязаныя з правядзеннем праверак у дачыненні да супрацоўнікаў КДБ па фактах злоўжывання імі службовымі паўнамоцтвамі. У прыватнасці, узгадваўся ўдзел апошніх у нелегальным увозе тытунёвых вырабаў у рэгіён, садзейнічанні ў незаконнай перадачы зямельнага участка плошчай 70 тыс. га ў Петрыкаўскім раёне і іншыя.

Касацыйная інстанцыя ўчора пакінула без змянення рашэнне Гомельскага раённага суда, які прыйшоў да высновы аб тым, што прыведзеныя ў публікацыях звесткі не адпавядаюць рэчаіснасці, ганяць гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю начальніка УКДБ і яго падначаленых. Суд абавязаў адказчыка на працягу месяца абвергнуць раней апублікаваныя заявы на тых жа інтэрнэт-сайтах.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

## ДРОБЯЗЬ, А ПРЫЕМНА

— Сумка са святлоадбівальнымі палоскамі — быццам бы дробязь, але ж гэта рэальны шанц, што вас заўважаць у цемры, — кажа Ігар Макушэнка, выканаўца абавязкаў начальніка Гомельскага ўпраўлення ДАІ. Ён звяртаецца да жанчын, якія толькі-толькі набылі свабоду.

Літаральна за воротамі папраўчай калоніі была праведзена акцыя «Твая бяспека на кожны дзень» Дзяржаўтаінспекцыі сумесна з прадстаўнікамі Гомельскага швейнага прадпрыемства, якое спецыялізуецца на вырабе прадукцыі са святлоадбівальнымі элементамі. Гаспадарчыя сумкі з бліскучымі палоскамі па баках былі ўручаны 25 вясковым жанчынам, якіх па амністыі ў гэты дзень выпусцілі з-за калючага дроту. Між іншым, па звестках статыстыкі, 80 % ДТЗ з наездамі на пешаходаў адбываюцца ў цёмны час сутак. Амаль палова з тых, хто трапіў у здарэнне, прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці, чвэрць — раней судзімыя. Нямала сярод іх жанчын. Вось таму супрацоўнікі ДАІ Гомельшчыны і вырашылі звярнуць увагу на гэтую сацыяльную групу. Тым больш, што жанчынам, якія пэўны тэрмін былі за кратамі, трэба адаптавацца да жыцця на волі.

— Зразумела, гаспадарчая сумка не выратуе ад усіх выпрабаванняў у жыцці, але ж прыемна, калі пра цябе хтосьці клапоціцца, — кажа адна з вызваленых жанчын і... перакладае ў новую сумку свае рэчы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ **Оценка оборудования и транспортных средств**
❖ **Оценка

**УТВЕРЖДЕНО**
*Наблюдательный совет ОАО «АСБ Беларусбанк» 21 октября 2009 года протокол № 26*

# БЕЛАРУСБАНК

*Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь*
**ЗАВЕРЕНО**
_____ *А.Л. Гальперин*
*03 ноября 2009 года*

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций шестьдесят седьмого – семьдесят третьего выпусков

Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента:**
полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);
сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»).

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**
Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, телефон – (017) 2188408, телефон / факс – (017) 2222626, e-mail – info@belarusbank.by.

**3. Сумма зарегистрированного уставного фонда**
Уставный фонд Банка составляет 2.288.787.859.000 (Два триллиона двести восемьдесят восемь миллиардов семьсот восемьдесят семь миллионов восемьсот пятьдесят девять тысяч) белорусских рублей.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**
Бухгалтерская отчетность по итогам работы Банка за 2008 год опубликована 28.03.2009 в газете «Звязда» (№ 58). По итогам работы Банка за 2009 год и последующие годы указанная информация будет опубликована не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Звязда».

**5. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии)**
С более подробной информацией и копией проспекта эмиссии облигаций шестьдесят седьмого – семьдесят третьего выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк», оформленной в установленном порядке, можно ознакомиться визуально в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) в течение их рабочего времени.

**6. СВЕДЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖИ ОБЛИГАЦИЙ**

**6.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**
Решение о выпуске шестьдесят седьмого – семьдесят третьего облигационных займов в соответствии с подпунктом 10.2 Устава Банка принято Наблюдательным советом Банка 21 октября 2009 года, протокол № 26.

**6.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций:**

| Номер выпуска | 67 выпуск | 68 выпуск |
|---|---|---|
| Валюта займа | Белорусские рубли | |
| Форма выпуска и вид облигаций | Документарные, на предъявителя, процентные, неконвертируемые | |
| Объем эмиссии | 30 миллиардов | 30 миллиардов |
| Количество облигаций | 60.000 штук | 30.000 штук |
| Серия, номера облигаций | ВИ67 000001-060000 | ВК68 000001-030000 |
| Номинальная стоимость | 500.000 | 1.000.000 |

| Номер выпуска | 69 выпуск | 70 выпуск | 71 выпуск | 72 выпуск | 73 выпуск |
|---|---|---|---|---|---|
| Валюта займа | Доллары США | | | Евро | |
| Форма выпуска и вид облигаций | Документарные, на предъявителя, процентные, неконвертируемые | | | | |
| Объем эмиссии | 20 млн. | 21 млн. | 9 млн. | 8 млн. | 2 млн. |
| Количество облигаций | 20.000 | 42.000 | 90.000 | 16.000 | 20.000 |
| Серия, номера облигаций | ВЛ69 000001-020000 | ВМ70 000001-042000 | ВН71 000001-090000 | ВО72 000001-016000 | ВП73 000001-020000 |
| Номинальная стоимость | 1000 | 500 | 100 | 500 | 100 |

**6.3. Цель выпуска облигаций**
Эмиссия облигаций шестьдесят седьмого – семьдесят третьего выпусков (далее – облигации) осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств физических лиц и направления полученных средств на пополнение ресурсной базы Банка.

**6.4. Период проведения открытой продажи облигаций**
После опубликования настоящей Краткой информации, заверенной в установленном порядке Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, Банк проводит открытую продажу на внебиржевом рынке:
облигаций 67-68 выпусков – с 01.12.2009 по 31.05.2011;
облигаций 69-73 выпусков – с 01.12.2009 по 31.08.2010, если больший срок не будет определен Правлением Банка. Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций соответствующего выпуска.

**6.5. Место и время проведения открытой продажи облигаций**
Открытую продажу облигаций осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.
Облигации продаются по их номинальной стоимости в валюте номинала. Владельцами облигаций в период открытой продажи могут быть физические лица – резиденты и нерезиденты, приобретающие их не в целях предпринимательской деятельности (далее – физические лица).
В оплату облигаций физические лица обязаны внести денежные средства наличными либо перечислить в Банк в безналичном порядке. Денежные средства от открытой продажи облигаций будут поступать на соответствующие балансовые счета 4940, открытые в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка.

**6.6. Срок обращения облигаций:**
67-68 выпусков – 729 календарных дней (с 01.12.2009 по 30.11.2011);
69-73 выпусков – 546 календарных дней (с 01.12.2009 по 31.05.2011).
День начала размещения и день начала погашения облигаций считаются одним днем.

**6.7. Дата начала погашения облигаций:**
67-68 выпусков – 30.11.2011;
69-73 выпусков – 31.05.2011.

**6.8. Размер дохода по облигациям, условия его выплаты**
По облигациям 67-68 выпусков установлена доходность в размере ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения) **плюс восемь** процентных пунктов. По облигациям 69-73 выпусков установлена доходность в размере **10** (Десяти) процентов годовых.
Выплата дохода по облигации производится периодически в виде процентного дохода при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации в Банк в соответствии с графиком выплаты процентного дохода:

**по облигациям 67 и 68 выпусков (один раз в три месяца)**

| Номер процентного периода | Начало периода | Конец периода, день начала выплаты дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 01.12.2009 | 28.02.2010 | 89 |
| 2 | 01.03.2010 | 31.05.2010 | 92 |
| 3 | 01.06.2010 | 31.08.2010 | 92 |
| 4 | 01.09.2010 | 30.11.2010 | 91 |
| 5 | 01.12.2010 | 28.02.2011 | 90 |
| 6 | 01.03.2011 | 31.05.2011 | 92 |
| 7 | 01.06.2011 | 31.08.2011 | 92 |
| 8 | 01.09.2011 | 30.11.2011 | 91 |
| | | ИТОГО | 729 |

**по облигациям 69, 70 и 72 выпусков (один раз в три месяца)**

| Номер процентного периода | Начало периода | Конец периода, день начала выплаты дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 01.12.2009 | 28.02.2010 | 89 |
| 2 | 01.03.2010 | 31.05.2010 | 92 |
| 3 | 01.06.2010 | 31.08.2010 | 92 |
| 4 | 01.09.2010 | 30.11.2010 | 91 |
| 5 | 01.12.2010 | 28.02.2011 | 90 |
| 6 | 01.03.2011 | 31.05.2011 | 92 |
| | | ИТОГО | 546 |

**по облигациям 71 и 73 выпусков (один раз в шесть месяцев)**

| Номер процентного периода | Начало периода | Конец периода, день начала выплаты дохода | Продолжительность периода (дней) |
|---|---|---|---|
| 1 | 01.12.2009 | 31.05.2010 | 181 |
| 2 | 01.06.2010 | 30.11.2010 | 183 |
| 3 | 01.12.2010 | 31.05.2011 | 182 |
| | | ИТОГО | 546 |

Начисление процентного дохода осуществляется за период со дня, следующего за днем фактической продажи Банком облигации, по:
30.11.2011 – по облигациям 67-68 выпусков;
31.05.2011 – по облигациям 69-73 выпусков включительно (за исключением случаев досрочного погашения облигации). Со дня истечения срока обращения облигации процентный доход не начисляется.
Первый процентный доход по соответствующей облигации начисляется со дня, следующего за днем ее продажи Банком, по день начала выплаты процентного дохода за процентный период, в котором была продана облигация включительно. Последующие процентные доходы (включая последний) начисляются со дня, следующего за днем начала выплаты процентного дохода за предшествующий процентный период, по день начала выплаты процентного дохода по данному процентному периоду включительно (дату начала погашения).
Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за процентный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, по процентной ставке соответствующего выпуска, указанной в части первой настоящего пункта.
Процентный доход по облигациям 67-68 выпусков рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + .... + Kn*H*tn)/365*100,$$

где: Д – процентный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части процентного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем процентном периоде;
K1, K2, Kn – ставка процентного дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления процентного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс восемь процентных пунктов;
H – номинальная стоимость облигации соответствующего выпуска.
Процентный доход по облигациям 69-73 выпусков рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = \frac{П * Н * t}{365*100}$$

где: Д – процентный доход;
t – количество дней соответствующей части процентного периода;
П – ставка процентного дохода в размере 10 процентов годовых;
Н – номинальная стоимость облигации соответствующего выпуска.
При расчете процентного дохода по облигации принимается календарное количество дней в году.
Выплата процентного дохода по облигации производится в наличном либо безналичном порядке по требованию предъявителя оригинала облигации в Банк. В случае если день начала выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется, начиная с первого рабочего дня, следующего за нерабочим днем.
При выплате процентного дохода по облигациям 69-73 выпусков наличной иностранной валютой Банк покупает у владельца облигации часть процентного дохода в размере менее минимального номинала банкноты соответствующей иностранной валюты (доллара США или евро) по обменному курсу покупки соответствующей иностранной валюты, установленному в обменном пункте (кассе), осуществляющем(ей) покупку, на момент совершения операции выплаты процентного дохода.
Выплата процентного дохода по облигациям осуществляется филиалами, центрами банковских услуг Банка, структурными подразделениями Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка (независимо от места продажи облигации) в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.
При досрочном погашении облигации сумма неполученного процентного дохода рассчитывается по дату ее досрочного погашения включительно.

**6.9. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**
Облигации могут быть предъявлены к досрочному погашению, но не ранее рабочего дня, следующего за днем истечения:
трех месяцев со дня продажи облигации 67-68 выпусков;
шести месяцев со дня продажи облигации 69-73 выпусков.
При этом предъявителю оригинала облигации выплачивается ее номинальная стоимость и неполученный процентный доход по дату досрочного погашения облигации включительно.
При досрочном погашении облигации выплата части номинала облигации, части процентного дохода не производится.

**6.10. Порядок погашения облигаций**
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, предъявивших оригинал облигации в Банк к погашению, начиная:
с 31.05.2011 – облигаций 69-73 выпусков;
с 30.11.2011 – облигаций 67-68 выпусков.
Погашение облигации (независимо от места ее продажи) осуществляют филиалы, центры банковских услуг Банка, структурные подразделения Банка, филиалов, центров банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка ежедневно в течение операционного дня соответствующего учреждения Банка.
При погашении облигации, предъявленной к погашению в сроки, указанные в части первой настоящего пункта, владельцу возмещается номинальная стоимость облигации, а также уплачиваются все неполученные процентные доходы наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
При погашении облигации выплата части номинала облигации, части процентного дохода не производится.

**6.11. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь**
В случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, Банк в срок не позднее 30 дней с момента принятия указанного решения возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами (с даты, следующей за датой продажи облигаций, до даты ее возврата, но не позднее дня истечения 30 дней с момента принятия вышеуказанного решения) по процентной ставке соответствующего выпуска, указанной в части первой пункта 6.8 настоящего документа.

**6.12. Дата и номер регистрации облигаций**
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 03 ноября 2009 года.
Регистрационный номер:
67 выпуск: 5-200-02-0373;
68 выпуск: 5-200-02-0374;
69 выпуск: 5-200-02-0375;
70 выпуск: 5-200-02-0376;
71 выпуск: 5-200-02-0377;
72 выпуск: 5-200-02-0378;
73 выпуск: 5-200-02-0379.

**6.13. Информация об обеспечении облигаций**
Банк выпускает облигации без учета положений, предусмотренных в подпункте 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг», в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 названного Указа, по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь. Общий размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка.

**Заместитель Председателя Правления – начальник ОПЕРУ ОАО «АСБ Беларусбанк»** **Г.С. Господарик**

**Главный бухгалтер ОАО «АСБ Беларусбанк»** **И.П. Лысоковская**

**http://www.belarusbank.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*
*Лицензия на профессиональную и биржевую деятельность по ценным бумагам № 02200/0385579 (зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь 13.07.2009 № 5200-1246-1024). УНП 100325912.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.29 | 16.17 | 8.48 |
| Віцебск — | 7.24 | 16.02 | 8.38 |
| Магілёў — | 7.19 | 16.07 | 8.48 |
| Гомель — | 7.10 | 16.10 | 9.00 |
| Гродна — | 7.43 | 16.33 | 8.50 |
| Брэст — | 7.38 | 16.40 | 9.02 |

**Месяц**
***Апошняя квадра 9 лістапада. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Анастасіі, Ганны, Мікалая, Яўгена.*
***К.*** *Анастасіі, Ніны, Мацея, Тодара, Эміля, Яна.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

## Дзве даты

## 11 лістапада

**1401 год** — у нямецкіх хроніках як аб'ект ваенных паходаў крыжаносцаў упершыню згадваецца Любча (сёння — гарадскі пасёлак у Навагрудскім раёне). У 1590 годзе мястэчка атрымала права на самакіраванне і герб — на блакітным полі сярэбраная падкова з трыма залатымі крыжамі, у сярэдзіне падковы — дзве рыбіны. У 1644 годзе Любча атрымала новы герб — на блакітным полі вароты з дзвюма вежамі, паміж імі — узброены рыцар, у правай руцэ якога меч, у левай — шчыт.

**1918 год** — у 11 гадзін раніцы ў Камп'енскім лесе (Францыя) паміж ЗША, Англіяй, Францыяй і іншымі дзяржавамі антыгерманскай кааліцыі і пацярпелай паражэнне Германіяй была заключана перамір'е, якое завяршыла Першую сусветную вайну.

## Цытата дня:

***«Лянівыя кожны дзень збіраюцца штосьці зрабіць».***
**Люк дэ Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.**

# ГРОШЫ

**Грошы заўсёды выклікалі вялізную цікавасць у свядомасці чалавека. Грошы выступалі знакам багацця і служылі прадметам абмену, гандлю, выкупу або проста падарункам. У той жа час у народным асяроддзі да грошай было даволі стрыманае стаўленне. Адно з «залатых правілаў народнай культуры» сведчыла: ніколі не падбіраць грошы на раздарожжы дарог, бо менавіта грашыма «адкупляюцца» ад хваробаў, бедаў і нястачаў.**

**У дачыненні да грошай у нашых продкаў былі сфарміраваныя добра акрэсленыя рэгламентацыі. Па меркаваннях старых людзей, той, хто парушае вызначаныя забароны і абмежаванні, можа назаўжды «страціць» поспех або, як гаварылі ў старажытнасці, «спор».**

● Так, катэгарычна забаранялася праводзіць грашовыя разлікі пасля захаду сонца або ў панядзелак.

● Забаранялася гаварыць, што ў хаце зусім няма грошай, нават калі іх і насамрэч вельмі мала, бо лічылі, што грошы «пакрыўдзяцца» і пакінуць хату назаўсёды.

● Існавала нямала спосабаў, якія, па меркаванні продкаў, дапамагаюць прымножыць «багацці». Здаўна вядомы звычай кідаць грошы на дно крыніцы каля культавых будынкаў: храмаў, манастыроў — у надзеі на паляпшэнне свайго дабрабыту.

● Народныя знахары і сёння раяць «выправіць» фінансавае становішча, якое пагоршылася, так: пад Каляды паслаць па пошце на царкву хай нават самую малую суму грошай.

● Зімой, у самую сцюжу, падкормлівайце птушак. А калі будзеце кідаць зерне ці крошкі, гаварыце так: «Мой хлеб (збожжа) дзюбайце, мне грашыма плюйце. Амін».

● Каб быць з грашамі на працягу года, нашы продкі раілі патрэсці пазвінець грашыма ў кішэні, калі ўвесну першы раз пачуеце зязюлю, або пералічыць усе наяўныя ў хаце грошы на Каляды або Вялікдзень, а падчас святочных службаў у храме абавязкова трымаць у кішэні трохі грошай.

● Існавала нямала «загавораных» слоў на грошы або кашалёк, напрыклад: «Як зорак у небе шмат, як вады ў моры хапае, так і майму кашальку каб грошай было шмат і заўсёды хапала. Амін».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

**Сквапнасць — лепшы сродак ад жанчын.**

☺

Як высветлілася, футбол прыдумаў дзядуля, які ўсё ж дагнаў калабка.

☺

**Фэн-шуй — гэта калі халадзільнік стаіць побач з камп'ютарам для спадручнасці і прыгажосці**

☺

— Раскажыце, як страціла розум ваша жонка.

— Мы падарожнічалі па гарах, дзе выдатнае рэха. Але жонка прывыкла, каб апошняе слова заўсёды заставалася за ёй...

☺

**Кожны муж незадаволены тым, на што выдаткоўваюць грошы яго жонка і ўрад. Розніца толькі ў тым, што ён не баіцца адкрыта лаяць урад.**

☺

Як высветлілася, п'есу «На дне» напісала сакратарка Максіма Горкага, якой надакучыла адказваць на пытанне, ці паклала яна цукар у каву.

МІНЗДРАЎ ПАПЯРЭДЖВАЎ...

На хвалі

# БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ ЗАМАНІЛА СЛУХАЧОЎ У «ПАСТКУ»

**У мінулую суботу Першы нацыянальны канал Беларускага радыё прадставіў радыёспектакль «Пастка» паводле аднайменнай аповесці Васіля Быкава. Дакладней, паўтарыў на «біс» — прэм'ера гэтай пастаноўкі адбылася яшчэ летам, у Дзень Незалежнасці. Пасля прэм'еры на адрас рэдакцыі прыйшло мноства водгукаў: многія слухачы ўхвалялі майстэрства акцёраў, называлі спектакль не менш як «унікальным» і прасілі паўтарыць пастаноўку.**

У рэдакцыі літаратурнага вяшчання пацвярджаюць — сапраўды, пасля пэўнага заняпаду «Тэатр Беларускага радыё» зноў вельмі запатрабаваны ў слухачоў, якія паспелі засумаваць па гэтым жанры. Бо інфармацыйны і музычны складнік ёсць ва ўсіх радыёстанцый, а літаратурна-драматургічны — гэта асаблівы жанр мастацтва...

Дарэчы, тых слухачоў, хто з нейкіх прычын не можа наведаць тэатр, чакае адмысловы падарунак — акрамя студыйных пастановак, Беларускае радыё прыступіла да запісу спектакляў непасрэдна са сцэн тэатраў. Ужо зробленыя аўдыёверсіі двух спектакляў Коласаўскага тэатра ў Віцебску — «Апошнія сведкі» паводле Св. Алексіевіч і «Васса» М. Горкага, запісана пастаноўка сталічнага Рускага тэатра імя Горкага «Перад захадам сонца» паводле Г. Гаўптмана (з Расціславам Янкоўскім у галоўнай ролі), вядуцца перамовы з кіраўніцтвам нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. «Наведаць» гэтыя спектаклі, як расказала «Звяздзе» галоўны рэдактар літаратурнага вяшчання Беларускага радыё Галіна Шаблінская, можна будзе напрыканцы снежня — у студзені. Што да радыёпастановак, то, акрамя ўжо згаданай «Пасткі», у лістападзе слухачы пачуюць яшчэ адну прэм'еру — па п'есе Аляксея Дударава «Крыж». Таксама да Новага года чакаецца прэм'ера паводле гістарычнай драмы XVII стагоддзя «Магнаты і сірата» («Сафʼя, князёўна Слуцкая»). Што адметна, гэту п'есу яе аўтар, знакаміты Уладзіслаў Сыракомля, напісаў на польскай мове — беларускі пераклад быў зроблены толькі летась, а спектакль на беларускай мове будзе пастаўлены ўпершыню.

Увогуле ж фонд Беларускага радыё налічвае сотні разнастайных аўдыёспектакляў, якія захоўваюцца з 50-х гадоў мінулага стагоддзя! «Важна, каб найлепшыя спектаклі з удзелам самых яркіх зорак сцэны заставаліся не толькі ва ўспамінах, але і ў выглядзе радыё- і тэлеверсій», — пераканана галоўны дырэктар вытворчасці праграм Беларускага радыё Пётр Раманчук.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Каб даць магчымасць «наведаць» найлепшыя спектаклі — ад Шэкспіра да Сыракомлі

# Калекцыя пачатку

**18 мастацкіх твораў адрэстаўравалі спецыяльна для выставы, прымеркаванай да 70-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.**

Трэба нагадаць, што пачатак стварэння нацыянальнага музея паклала Дзяржаўная карцінная галерэя БССР, якая адкрылася 8 лістапада 1939 года. Пад галерэю аддалі будынак былой Марыінскай жаночай гімназіі. Тады шмат увагі надавалася фарміраванню калекцыі, якая б стала сапраўдным нацыянальным скарбам. Але вайна пазбавіла нашу рэспубліку велізарнай часткі каштоўнасцяў, след якіх не ўдалося адшукаць пасля.

Творы, якія захаваліся падчас вайны і знаходзяцца дагэтуль у калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, будуць прадэманстраваныя гледачам. На юбілейнай выставе з першых калекцый Дзяржаўнай карцінай галерэі можна будзе ўбачыць творы як заходняга, так і беларускага і рускага мастацтва, якія належалі нашай краіне яшчэ да вайны.

Пасля вайны калекцыю даводзілася аднаўляць, папаўняць. Наколькі гэта было важна для краіны, сведчыць той факт, што ў карцінай галерэі ў 1957 годзе з'явіўся свой будынак, а сама яна стала Дзяржаўным мастацкім музеем. Сёння калекцыя музея ўтрымлівае 27 тысяч экспанатаў. Але цяпер ёсць магчымасць на свае вочы ўбачыць тыя творы, з якіх усё пачыналася. Шмат якія з іх атрымалі новае жыццё дзякуючы рэстаўратарам і спонсару музея.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Чатыры бразільскія арэхі

Інфарм-укол

**Аўстралійскія вучоныя мяркуюць, што селен можа супрацьстаяць раку кішэчніка.**

Паводле праведзеных эксперыментаў, частата раку кішкі ў мышэй, якіх падкормлівалі селенам, знізілася на 60 працэнтаў. Падобны эфект вучоныя выявілі і ў людзей ва ўзросце пасля 50 гадоў. І ў жывёл, і ў людзей быў адзначаны магутны ўзровень ферменту, які абараняе арганізм ад акісляльнага пашкоджання. Мяркуецца, што менавіта гэты фермент, актываваны ў кішэчніку, служыць свайго роду абаронцам ад узнікнення раку. Аднак селен у выглядзе дабаўкі да ежы неабходна прымаць толькі па рэкамендацыі ўрача. Паколькі высокія канцэнтрацыі селену ў арганізме могуць быць небяспечнымі з-за яго таксічнасці. У цэлым для прафілактыкі можна ўжываць, напрыклад, чатыры бразільскія арэхі ў дзень.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

## У ВАС АДЧУВАЛЬНЫЯ ЗУБЫ? АДМОЎЦЕСЯ АД АДБЕЛЬВАЛЬНЫХ ПАСТАЎ І ЦЫТРУСАВЫХ!

36,6°

**АПОШНІМ часам колькасць зваротаў да стаматолагаў па прычыне павышанай адчувальнасці зубной эмалі значна павялічылася. Больш як палова насельніцтва ва ўсім свеце пакутуе ад розных формаў адчувальнасці зубоў. Часцей за ўсё скардзяцца на яе жанчыны.**

Гіперэстэзія — павышаная адчувальнасць тканак зуба да механічных (напрыклад, дотык зубной шчоткі), хімічных (салодкае, салёнае, кіслае, горкае) і тэмпературных (холад, цяпло) раздражняльнікаў. Боль пры гіперэстэзіі кароткачасовы, але пры гэтым вострыя і пякучы. Калі празмерная адчувальнасць праяўляецца ў большасці або ва ўсіх зубах — гавораць пра генералізаваную гіперэстэзію. (Дарэчы, клінічныя назіранні дазволілі вызначыць сезоннасць праяў генералізаванай формы. Абвастрэнні часцей за ўсё назіраюцца восенню і ранняй вясной, што, відаць, звязана, з аднаго боку, з павелічэннем паступлення ў арганізм восенню раслінных прадуктаў і, з іншага — з узнікненнем гіпавітамінозаў вясной.) Калі ж боль узнікае ў вобласці асобнага або некалькіх зубоў — гаворка ідзе пра лакалізаваную (абмежаваную) форму.

Адкуль з'яўляецца гэты боль? Павышанай адчувальнасцю валодае зусім не зубная эмаль, а размешчаны пад ёю больш рыхлы слой — дэнцін. Эмаль, нібы моцная браня, засцерагае гэту ўразлівую тканку ад агрэсіўнага ўздзеяння розных фактараў. Аднак па самых розных прычынах зубная эмаль можа патанчацца і нават разбурацца, і тады дэнцін застаецца безабаронным.

Зрэшты, аднаго толькі разбурэння зубной эмалі для развіцця гіперэстэзіі недастаткова. Унутры дэнціну размешчаныя тонкія мікратрубачкі, па якіх праходзяць нервовыя канчаткі. Пакуль гэтыя трубачкі закрытыя, зубы знаходзяцца ў адносным парадку (нават пры наяўнасці дэфектаў эмалі нічога не баліць). Але калі дэнцінныя каналы адкрываюцца, агаляючы нервовыя канчаткі, то ў адказ на любы раздражняльнік узнікае рэзкі пранізлівы боль.

Зрабіць зубы занадта адчувальнымі могуць нервовыя і эндакрынныя захворванні, а таксама асобныя гармануальныя станы (клімакс, цяжарнасць), падчас якіх у арганізме ўзнікаюць парушэнні мінеральнага абмену. Таму вельмі важна яшчэ да пачатку стаматалагічнага лячэння вызначыць ваш агульны стан здароўя. У гэтым — гарантыя не толькі больш эфектыўнага, але і бяспечнага лячэння. Рэч у наступным: саставы, якія ўтрымліваюць фтарыды, што прымяняюцца для барацьбы з гіперэстэзіяй, асабліва ў высокай канцэнтрацыі, могуць прыводзіць да гіпафункцыі шчытападобнай залозы, калі стан гэтага органа быў не ў норме. Таму калі адчувальных зубоў — поўны рот, перад візітам да стаматолага трэба наведаць і эндакрынолага.

Сярод іншых прычын павышанай адчувальнасці часта сустракаюцца розныя стаматалагічныя праблемы: карыес, эрозія і трэшчыны эмалі, бруксізм (скрыгатанне зубамі ў сне). Таксама зубы могуць «расчуліцца» і ў тым выпадку, калі адбылася атрафія дзясны і агалілася іх шыйка. Гэта здараецца з-за захворвання тканак парадонту, а таксама з-за няправільнага прыкусу.

Часам мы самі вінаватыя ва ўзнікненні гіперэстэзіі: напрыклад, калі вельмі любім кіслыя прадукты або газаваныя напоі, якія разбураюць зубную эмаль. Да трэшчын на эмалі прыводзіць і звычка есці часта халодную і гарачую ежу, а таксама няправільная гігіена поласці рота. Прычым эмаль можа пацярпець не толькі ад дрэннай або нерэгулярнай чысткі зубоў, але і ад празмернай стараннасці ў гэтым пытанні. Не варта вельмі моцна націскаць шчоткай на зубы, а таксама выкарыстоўваць шчоткі з жорсткай шчацінай і пасты, якія ўтрымліваюць высокі працэнт абразіўнасці (пасты, у склад якіх уваходзяць злучэнні алюмінію, крэмнію, сода-бікарбанат).

Стаматолагі для лячэння гіперэстэзіі прымяняюць альбо спецыяльныя лакі, з дапамогай якіх закрываюцца мікрапоры ў зубной эмалі і пустыя прасторы ў дэнцінных каналах, альбо рэмінералізуючыя прэпараты (звычайна ўтрымліваюць фтор). Дзякуючы апошнім павышаецца парог узбуджальнасці нервовых валокнаў, а цвёрдыя тканкі зубоў насычаюцца кальцыем ці фторам. Каб умацавальныя рэчывы лягчэй пранікалі ў зубныя тканкі, выкарыстоўваюць іонафарэз (прэпараты дасягаюць пункта прызначэння з дапамогай слабага разраду электрычнага току). А каб пацыент мог працягваць лячэнне самастойна, існуюць спецыяльныя капы для хатняга выкарыстання. З зубных радоў здымаюць злепкі, па іх вырабляюць празрыстыя капы, якія ахоплліваюць зубы з усіх бакоў. Лекавае рэчыва закладваецца ўнутр капы, пасля чаго яе надзяваюць на зубы, такім чынам, рэчыва ўтрымліваецца на зубах і дзяснах. Дзейнае рэчыва выбіраецца, паводле меркавання стаматолага, у кожным выпадку індывідуальна (гэта могуць быць фторыстыя або кальцыевыя злучэнні, супрацьзапаленчыя сродкі і інш.).

### ПРАФІЛАКТЫКА

● Звярніце ўвагу на сваё харчаванне. Прадукты і напоі з высокім утрыманнем кіслот (таматы, цытрусавыя, кола і іншыя безалкагольныя газаваныя напоі) пашкоджваюць эмаль зубоў і робяць іх больш адчувальнымі да тэмпературнага ўздзеяння. Пасля яды (асабліва, калі з'елі штосьці салодкае або кіслае) пажадана пачысціць зубы або хоць бы прапаласкаць рот гатаванай вадой.

● Чысціце зубы шчоткай з мяккай шчацінай. Рухі павінны быць плаўнымі, вертыкальнымі, а не гарызантальнымі. Пачынаць лепш не з разцоў, а з кутніх зубоў.

● Набывайце пасты з нізкай ступенню абразіўнасці, лепш спецыяльна прызначаныя для адчувальных зубоў. Яны могуць утрымліваць солі калію (нітрат або хларыд), фтарыды, хларыд стронцыю. Найбольш распаўсюджаныя і эфектыўныя — злучэнні калію: яны змяншаюць дыяметр расшыраных дэнцінных каналаў адчувальных зубоў, зніжаюць ток вадкасці ўнутры іх і аслабляюць рэакцыю зубоў на раздражняльнікі. Эфект ад прымянення такіх пастаў будзе заўважаны ўжо праз некалькі дзён. Праўда, пасля пераходу на звычайную пасту ўсё вернецца на кругі свае.

● Карысныя фтарыраваныя паласканні для рота, але іх павінен прызначаць урач, бо такія сродкі нельга выкарыстоўваць пастаянна.

● Пазбягайце рызыкоўных для адчувальных зубоў працэдур. Напрыклад, хімічнае і механічнае адбельванне вам супрацьпаказана — лепш скарыстацца ўльтрагукавым. Гэта самы ашчадны метад, пры якім выкарыстоўваюць нізкую канцэнтрацыю актыўнага рэчыва, ды і час уздзеяння апошняга на зубы мінімальны. Награванне і траўмаванне зубных тканак падчас сеансу не адбываецца, таму ні да, ні падчас, ні пасля працэдуры непрыемных адчуванняў пацыент не зведвае. Гэты спосаб можа прымяняцца ў комплексе з лазерным адбельваннем. (Дарэчы, за некалькі тыдняў да правядзення працэдуры адбельвання рэкамендуецца выкарыстанне дэсенсібілізуючых (зніжаюць адчувальнасць) зубных пастаў, што садзейнічае прадухіленню з'яўлення павышанай адчувальнасці.)

**Увага!** Адчувальнасць да гарачага—халоднага можа захоўвацца на працягу нейкага часу пасля лячэння ў стаматолага. Прычына — у лёгкім запаленні пульпы, якое звычайна праходзіць праз некалькі дзён. Але часам такая адчувальнасць сігналізуе аб сур'ёзным запаленчым працэсе ў зубе. Вось прыкметы, пры якіх трэба абавязкова звярнуцца да доктара:

● боль пасля ўжывання халоднай або гарачай ежы або напояў застаецца доўгі час;

● павышаная адчувальнасць праяўляецца ў вобласці толькі аднаго зуба;

● прымяненне спецыяльнай зубной пасты на працягу 2 тыдняў не дае выніку.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Нашы дзеці

# «А праўда, што вы НЕ МАЕ РОДНЫЯ БАЦЬКІ»?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Падобнага пытання асцерагаюцца, як агню, многія пары, якія ўсынавілі маленькіх дзетак. Але лес чуе, а поле бачыць: свет, як вядома, не без «добразычлівых» людзей. Добра, калі праўда абрушылася на галаву вашаму сыну ў дзіцячым садку ці ў малодшых класах. У маршрутцы ж год таму давялося размаўляць з жанчынай, якой тайна ўсынаўлення абярнулася бокам. 16-гадовая дачка, даведаўшыся праўду ад аднакласніка, з якім пасварылася, замкнулася, перастала ёй давяраць. «Маўляў, як я магу давяраць чалавеку, які ўсё жыццё мяне падманваў. Цяпер у Сняжаны свая сям'я, дзеці, але адносіны ў нас па-ранейшаму нацягнутыя».**

Як захаваць даверлівыя адносіны ў сваёй не зусім звычайнай сям'і? Практыкай дзеляцца дзве мілыя жанчыны, якія, прытуліўшы чужых дзяцей, ужо не раз шукалі адказ на пытанне, як быць?

### Гісторыя 1.

### Пра тое, як у Антона з'явіўся старэйшы брат Саша

— Памятаю, прыбягае Антоша са школы і пытаецца: «А праўда, што ты не мая родная мама? Мне Танька сказала», — не без слёз узгадвае Алена.

Ужо даўно жанчына думала пагаварыць на гэту тэму з сынам. Але ніяк не магла падабраць момант. Неўзабаве жыццё падабрала яго за яе. У той жа дзень Алена прызналася васьмігадоваму сыну, што дзевяць месяцаў ён жыў у жывоціку іншай маці. Пасля апынуўся ў дзіцячым доме...

Размова прайшла вельмі лёгка, мабыць, таму што Антон яшчэ маленькі. А магчыма і таму, што пра дзіцячыя дамы і пра дзетак, якія растуць там без маці, чуў не ўпершыню.

— Нават мара ў яго ёсць: просіць, каб мы прывезлі адтуль маленькага браціка, — кажа Алена. — Страшна падумаць, якая б магла быць яго рэакцыя, калі б ён даведаўся праўду ад чужых людзей у падлеткавым узросце.

Хутка пасля гэтага Алена ў газеце ўбачыла фотаздымак. На ім — бабуля і хлопчык, вельмі падобны да Антона. Бабуля пісала, што часта хварэе і баіцца, што ўнук застанецца адзін на гэтым свеце. Расчуленая маці адразу ж пабегла да сяброўкі, паплакалі разам і вырашылі, што трэба тэлефанаваць, бо інакш рана ці позна гэта зрабіла б «добразычлівая» суседка. Гэта ж вёска, тут усе як на далоні.

— Антон першы час хадзіў задраўшы нос і ўсім расказваў, што ў яго ёсць брат, — усміхаецца жанчына. — Саша прыязджаў да нас на канікулах, вазілі да бабулі і Антошку. Бабуля сказала, што цяпер лічыць мяне сваёй дачкой. Пра біялагічную ж маці і бабуля, і дзеці ўзгадваюць неахвотна. «Яна п'е, гуляе, а раз падпільнавала Сашу ля пад'езда і клянчыла тысячу». Саша ж на пытанне пра маці прамовіў кароткае: «Зараза яна!».

### Гісторыя № 2.

### Пра тое, як Наталля Карнілава за адзін год стала маці траіх дзяцей

— Мае сыны, 28-гадовы Санька і 13-гадовы Ільюша, перад судом па ўсынаўленні пажартавалі: «Мы згодныя есці і апранацца на 20 % менш, толькі б не адмовілі!» — распавядае Наталля.

Спачатку хацелі ўдачарыць Ленку. Але, калі даведаліся, што яна з двойні, вырашылі не разлучаць брата з сястрой. «Калі пракормім аднаго, то і двух зможам», — сказаў тады апошняе слова муж Наталлі.

Ленка была баявая, а вось Пашка — дзікаваты, як Маўглі. Усё за сястру хаваўся, быццам хвосцік. Першы час сярод ночы ўрываўся да новых бацькоў у спальню, уключаў святло, каб пераканацца ці на месцы яны. Прайшло два гады, за гэты час дзеці забыліся пра дзіцячы дом.

— Але дагэтуль, калі я ці муж збіраемся на працу ці па прадукты, яны пытаюцца не «Калі ты вернешся?», а «Мама (тата), а ты вернешся?».

З першага дня сям'я Наталлі Карнілавай ведала, што ў Пашкі з Ленкай ёсць 12-гадовая сястра. Наталля пад выглядам карэспандэнта сустрэлася са Светай, пагаварыла з ёй па душах. Дзяўчынка расказала, што чакае маці з турмы. «Мама піша, што яна ў турме з-за мяне. Што вернецца хутка і забярэ мяне».

Жанчына выйшла з турмы 29 верасня, але пра свае абяцанні, напэўна, адразу ж забылася.

— Дырэктар інтэрната папрасіла ўдачарыць Свету, бо прападзе сама, — узгадвае Наталля. — Начальнік калоніі сказаў каротка: «Тут толку не будзе, забірайце дзяўчынку, а то маці ёй на шыю сядзе праз пару гадоў».

Наталля прыехала да Светы зноў і запрасіла яе далучацца да сваёй сям'і.

— Няхай лепш у цябе будзе тры матулі (яшчэ італьянская), чым ні адной, сказала я дзяўчынцы, — распавядае Наталля. — У інтэрнаце дамовіліся, калі маці аб'явіцца, няхай адрас пакіне, мы будзем расказваць ёй пра дзяцей, але, пакуль дзецям не споўніцца 18, не дазволім ніякіх стасункаў. А вырастуць, самі вырашаць, як быць.

У Наталлі Карнілавай пасля ўсынаўлення адкрылася новае дыханне. Яна пачала пісаць апавяданні, адкрыла сайт «Гарадок аўтараў-пачаткоўцаў «Вяснянка» (www.kornilova.by), дзе на ўласным прыкладзе дае людзям зразумець, што мацярынства — гэта шчасце. **Дзякуючы сайту, якія жыве толькі 4 месяцы, ужо чатыры маленькія чалавечкі знайшлі сваю сям'ю, яшчэ чатыры пары афармляюць дакументы на ўсынаўленне.**

**А зараз на пытанні «Звязды» адказвае <u>педагог-псіхолаг Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Вольга ГАЛАЎНЁВА</u>.**

***— Вольга Сяргееўна, ці трэба захоўваць тайну ўсынаўлення?***

— Я лічу, што людзі, якія вырашылі падарыць дзіцяці тое, чым яно абдзелена, не павінны адымаць тое, што яно мае. У кожнага з нас ёсць свая гісторыя, радавая памяць. Перакрэсліваць усё — гэта пазіцыя няспелых бацькоў, якія ўзялі дзіця ў першую чаргу, каб вырашыць свае праблемы, у прыватнасці, закамуфляваць адчуванне асабістай няпоўнавартаснасці.

***— У якім узросце, на ваш погляд, трэба расказаць дзіцяці праўду?***

— Большасць прыёмных бацькоў кажуць, што не будуць захоўваць тайну ўсынаўлення. «Мы яму раскажам, калі ўбачым, што ён гатовы». Але, як паказвае жыццё, такі момант не наступае і дзіця даведваецца праўду ад чужых людзей. Як правіла, у здзеклівай форме. Мы не раім усынавіцелям у пэўным узросце садзіць дзіця на табурэтку і расказваць, як яно трапіла ў іх сям'ю. Лепш з першага дня завесці альбомчык, куды ўклеіць разам з новымі сямейнымі фотаздымкамі здымкі, зробленыя ў дзіцячым доме. Гэта могуць быць фотаздымкі галоўнага ўрача, нянечкі, дзетак, якія былі побач. Вось і своеасаблівы мосцік з дома дзіцяці ў вашу сям'ю. Пры гэтым, калі ваш сын будзе тыцкаць пальцам і пытацца, хто гэта на фотаздымку, перадайце яму думку, што дзіця ў сям'і можа з'явіцца па-рознаму. Галоўнае, каб гэта сям'я была дружная. Калі ваш сын з самых пялюшак будзе чуць, што ўсынаўленне — шчасце, то ў больш свядомым узросце гэта будзе ім успрымацца, як норма, а не трагедыя, шанц, дзякуючы якому ён знайшоў маму і тату. І, паверце, тады яго ніхто не зможа пакрыўдзіць.

***— А калі ён пачне распытваць пра сваіх біялагічных бацькоў?***

— Вялікая спакуса сказаць, што «твае біялагічныя бацькі — алкаголікі, адкіды грамадства». Дзіця можа замкнуцца. Вырашыць, што раз яго біялагічная маці такая дрэнная, то і ён не лепшы. З іншага боку, нельга і падманваць, што яны такія цудоўныя, «героі Савецкага Саюза». Некалі ён захоча даведацца, а хто гэтыя героі. Трэба знайсці такія словы, якія дапамогуць яму зразумець, што жыццё бывае розным, што не кожны, хто нарадзіў дзіця, на жаль, спраўляецца з адказным і доўгачасовым клопатам пра яго.

***— А раптам вырасце і стане біялагічную маці шукаць? Што рабіць, калі яна пачне шукаць яго сама? Ці трэба забараняць стасункі з біялагічнымі роднымі?***

— Біялагічныя маці, як правіла, не шукаюць сваіх дзяцей самі. Некаторыя прыёмныя бацькі баяцца, што з'явіцца жанчына на крутой машыне і падкупіць іх сына дарагімі і бліскучымі цацкамі. Насамрэч, гэта міф. Нашы маці-зязюлі не маюць жыццёвай энергіі, нават каб памыць дзіця, не кажучы ўжо, каб імкнуцца нечага дасягнуць у жыцці. Калі ж дзіця ў свядомым узросце захоча знайсці маці, то няхай шукае. А вы б не шукалі? Дапамажыце яму. Ад гэтага ўсім толькі лепш. А любіць вас у такім выпадку стануць значна мацней. Убачыўшы жанчыну з пустымі вачыма, як правіла, дзіця супакойваецца, магчыма падтрымлівае рэдкія кантакты, застаючыся пры гэтым адданым сынам людзям, якія прысвяцілі яму сваё жыццё. Што ж датычыцца бабуль, братоў і сёстраў, то пра іх па біялагічных бацьках меркаваць нельга. Нельга перашкаджаць стасункам з братамі і сёстрамі. Іншая рэч, калі дзіця само не захоча гэтага.

* * *

І напрыканцы — апошняя парада ад гераіняў гэтай публікацыі людзям, якія хацелі б усынавіць дзіця. Нікога не слухайце. Ні родных, ні сяброў. Яны, хутчэй за ўсё, будуць адгаворваць. Маўляў, гэта ж дзеці алкаголікаў, а калі гены правяцца? Ведаеце, пакажыце мне таго, у каго сёння няма генаў. Ды і ў непітушных бацькоў дзеці часам таксама алкаголікамі становяцца!..

**Надзея ДРЫЛА.**

** Імёны маці і іх дзетак па іх просьбе зменены.*

### ДЛЯ МАХЛЯРОЎ ПЕРАПІС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У кватэру да 75-гадовай гамяльчанкі прыйшоў малады хударлявы мужчына з папкай, які прапанаваў жанчыне «перапісацца», паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. Адначасова грамадзянін пачаў распытваць яе аб жыцці-быцці, а потым перайшоў да сапраўднай мэты свайго візіту і стаў патрабаваць у сталай жанчыны грошы. Далей — больш: паміж імі завязалася няроўная барацьба, і жанчына пачала гучна клікаць на дапамогу. Вось тут не вытрымалі нервы ў ліхадзея — ён хутка збег, а жанчына доўга адыходзіла ад сустрэчы з «перапісчыкам», якога сама даверліва пусціла ў кватэру.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### ЭЛЕКТРЫК-САДЫСТ

**Апошнюю кропку ў скандале са сваёй сужыцелькай паставіў прасам 57-гадовы электрык з в. Моўчадзь Баранавіцкага раёна.**

Ён быў п'яны і не чуў, калі вярнулася дамоў сужыцелька. Жанчына пагрукала ў дзверы, затым пастукала ў акно — адказу не было. Тады жанчына выбіла шыбу. За гэта мужчына яе моцна пабіў, ды яшчэ паставіў на сужыцельку разагрэты прас. Пацярпелая звярнулася па медыцынскую дапамогу, а пазней падключылася міліцыя і завяла на электрыка крымінальную справу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Сітуацыя

# СЫН ВЫГНАЎ ВАСЬМІДЗЕСЯЦІГАДОВАГА БАЦЬКУ З ЧАТЫРОХПАКАЁВАЙ КВАТЭРЫ

Дзесяць гадоў дзядуля не жыве ў кватэры, купленай на ўласныя грошы. Пасля падпісання дароўнага дакумента на імя сына, стары вымушаны пасяліцца ў сваёй сяброўкі дзяцінства.

Адрэй Іванавіч* і Марыя Аляксееўна жывуць у двухпакаёвай кватэры на вуліцы Сердзіча. Маленькую кватэрку яны дзеляць з унучкамі Марыі Аляксееўны і яе пітушчай дачкой.

— Вы не пужайцеся, у нас святла няма, — папярэджвае бабуля Марыя. — Адключылі. Дачка павінна была плаціць, але ў запой пайшла, ды і трохмесячная пазыка вісіць. Трыста тысяч. Мы тут пасіху дакладваем. Вунь мы з Іванам у школе прыбіральшчыкамі працуем, дык за тры месяцы назбіраем.

Іван Андрэевіч дзесяць гадоў таму жыў са сваім адзіным сынам Андрэем і жонкай Аленай Паўлаўнай у чатырохпакаёвай кватэры на вуліцы Альшэўскага ў Мінску. Жылі яны сям'ёй дружнай (па словах дзядулі), душа ў душу. Сам Іван Андрэевіч, пакуль хапала сілаў, працаваў дальнабойшчыкам. Зарабляў нядрэнна, таму кватэру змог прыватызаваць досыць хутка.

Сын ажаніўся з Таццянай.

— Яна проста змяніла яго, — расказвае Іван Андрэевіч. — Сутнасць у тым, што мой сын — інвалід: яму адарвала руку на працы. З-за гэтага ў яго комплекс ёсць. А Таццяна — уладная дзеўка, вось і пачала ўводзіць яму ў вушы, што ім трэба жыць асобна.

Сын заняўся бізнэсам, і праз некаторы час пара мела ўласнае жыллё.

— Пасля памерла мая Аленка, — уздыхае дзядуля. — У мяне тады нават нешта ў галаве памуцілася. Свету белага не бачыў. Запіў страшна.

Вынікам тыднёвага запою стаў мікраінсульт. Івана Андрэевіча адвезлі ў шпіталь. Сын жа і нявестка вельмі спалохаліся. Маўляў, калі памрэ дзядуля, то кватэра ім не дастанецца.

— Яны прыехалі ў шпіталь і папрасілі аформіць дароўную на імя Андрэя, сына майго, — апавядае дзядуля. — Мне, па шчырасці, было тады ўсё адно. Я думаў, што і так нядоўга працягну. Прыехаў тады да мяне брат мой Сашка. Ён штурхаў мяне ў бок, шаптаў: «Што ты робіш, дурань! Пачакай». А я думаў, што калі памру, то і пахаваць мяне не будзе каму.

Вось ужо і паперы падпісаныя, вось ужо і сваякі да пахавання рыхтуюцца, а дзядуля вазьмі ды і выжыві.

Паздараveў Іван Андрэевіч, ачуняў, хадзіць нармальна стаў. І ў той час (у семдзесят гадоў) сустрэў дзядуля сваё былое школьнае каханне.

— Раней мы ў адну вёску да бабуль прыязджалі, — расказвае Марыя Аляксееўна. — Ён мне нават замуж прапаноўваў ісці. Прыйшоў сватацца, а я збегла ў клуб. Мне тады патрэбныя былі бойкія, а не сціплыя, як ён.

Сустрэліся і засталіся разам. Двое сямідзесяцігадовых адзінокіх людзей (у Марыі Аляксееўны таксама памёр муж).

— Мы ж у загс нават схадзілі і распісаліся, — апавядае Іван Андрэевіч. — Усё па законе.

Як сапраўдны джэнтльмен Іван Андрэевіч запрасіў новую жонку жыць у сваю, як ён думаў тады, кватэру. Але стары зусім забыўся, што ўжо падпісаў дароўную. На гэтую кватэру ў нявесткі і сына былі свае планы. Яны ўжо дамовіліся з кватарантамі, якія вось-вось павінны былі ўехаць. І тут дзядуля з нейкай жонкай незразумелай. Старому ставіць умову: або жывеш у адным пакоі сам, або сыходзь.

— Я спрабаваў мірна з імі дамовіцца, але там нявестка кіруе, — скардзіцца Іван Андрэевіч. — Ніхто ж на кватэру не прэтэндуе. Нам вунь ужо па восемдзесят гадоў. Невядома, ці да заўтра дажывём. Але што тут казаць, калі сын нават і не прыязджае.

— Мы не ведаем, што тут рабіць, куды кідацца, — кажа Марыя Аляксееўна. — З аднаго боку, гэта ж родны сын, дзіцятка ягонае, а з другога — нам тут таксама вельмі цяжка жыць з дачкой маёй такой і ўнучкамі дарослымі.

## КАМЕНТАРЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

— Вы ведаеце, у чым праблема? У тым, што бабулі і дзядулі самі не пішуць скаргі альбо пішуць, а пасля забіраюць іх, — распавялі мне ў **Камітэце па працы і сацыяльнай занятасці насельніцтва Мінгарвыканкама**. — Звычайна старэйшае пакаленне баіцца скардзіцца, каб не стала яшчэ горш. У асноўным, у такіх выпадках нам тэлефануюць суседзі. Тады сацыяльныя працаўнікі змогуць прыйсці і праверыць. Аднак што мы можам зрабіць, калі пісьмовай скаргі няма? Калі справа даходзіць да міліцыі, то старыя шкадуюць дзяцей і забіраюць заявы. Дзядулам і бабулям, якія трапілі ў такую сітуацыю, важна зразумець, што яны маюць права звяртацца ў суд, у органы сацыяльнай абароны. І не баяцца гэтага рабіць. А калі канфлікт толькі ўзнікае, то варта схадзіць да псіхолага.

**Алена ДЗЕВОЙНА, юрыст газеты «Звязда»:**

Згодна з пунктам 2 артыкула 275 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь пераход права ўласнасці на кватэру не з'яўляецца падставай для спынення права карыстання кватэрай былога ўласніка.

Пункт 3 таго ж артыкула сведчыць, што члены сям'і ўласніка жылога памяшкання могуць патрабаваць ліквідацыі парушэнняў іх правоў на жылое памяшканне ад любых асобаў, у тым ліку ўласніка памяшкання.

Артыкулам 543 гэтага кодэкса таксама прадугледжана, што ў дагаворы дарэння кватэры ў якасці істотнай умовы павінен утрымлівацца пералік асобаў, якія захоўваюць права карыстання жылым памяшканнем, якое перадаецца ў дар, пасля пераходу права ўласнасці на яго.

Выселіць дзядулю без забеспячэння яго жыллём магчыма толькі ў тым выпадку, калі ён сістэматычна псуе кватэру, калі з ім немагчыма пражываць на адной тэрыторыі і ў падобных да гэтага выпадках, а таксама калі дзядуля мае ў гэтым жа населеным пункце іншае жылое памяшканне на праве ўласнасці. Калі гэту праблему не ўдаецца вырашыць у добраахвотным парадку, то ўсе такія спрэчкі разглядаюцца толькі ў судзе.

Кватарантаў засяліць без згоды бацькі сын таксама не меў права. Жонку засяліць бацька без згоды сына таксама не можа (частка 2 артыкула 116 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

Згодна з артыкулам 549 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, дарыльшчык мае права адмяніць дарэнне, калі атрымальнік дару здзейсніў замах на яго жыццё, жыццё каго-небудзь з членаў сям'і ці блізкіх сваякоў альбо наўмысна прычыніў дарыльшчыку цялесныя пашкоджанні. Калі нічога такога не назіралася, то вярнуць кватэру ва ўласнасць можна толькі праз суд і толькі ў тым выпадку, калі дзядулю ўдасца даказаць, што ён знаходзіўся ў момант здзяйснення здзелкі ў такім стане, што не мог разумець значэння сваіх дзеянняў ці кіраваць імі.

Насамрэч, ён вельмі паспяшаўся, афармляючы дароўную. І страх таго, што ў выпадку смерці кватэра прападзе — беспадстаўны. Калі кватэра прыватызаваная, то нават без дарэння і без завяшчання яна ўсё адно засталася б у сына як першачарговага спадчынніка.

**Вікторыя ВАЛУЕВА, урач-псіхатэрапеўт, прыватнае прадпрыемства «Злітны выбар»:**

— З пункту гледжання псіхалогіі, канфлікт — сітуацыя, у якой кожны з бакоў імкнецца заняць пазіцыю, несумяшчальную і супрацьлеглую ў дачыненні да інтарэсаў іншага боку.

Наогул, разумныя рашэнні, калі яны сапраўды разумныя, прымаюцца любым пакаленнем. Магчыма, было мала спробаў зразумець пачуцці бацькі з боку дзяцей і выпрацаваць адзін-два пакоі для яго і яго новай жонкі. Магчыма, бацькі ў свой час не зважалі на сапраўдныя патрэбы сына, які рос. За побытавымі канфліктамі часта хаваюцца непрапрацаваныя крыўды, нявыказаныя ўзаемныя папрокі.

**Настасся ЗАНЬКО.**

** Імёны зменены па просьбе герояў.*

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 20 ноября 2009 г. в 10.30

по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 состоится ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе следующих лотов:

| Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|
| **Комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Гагарина, 35, в составе:** кап. строение с инв. № 710/С-55984 (одноэт. кирп. здание склада многоцелевого назнач. № 1) пл 268,7 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-55980 (одноэт. кирп. здание склада многоцелевого назнач. № 2) пл. 268,7 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-55981 (одноэт. кирпич. здание склада стройматериалов) общ. пл. 222,1 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-55979 (двухэт. кирп. здание проходной) пл. 21,9 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-55974 (одноэт. кирп. здание пилорамы) общ. пл. 197,3 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-55983 (одноэт. из ж/б плит здание склада с пристройкой) пл. 89,8 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-55982 (двухэт. кирп. здание мастерских с участком деревообработки, складом, двумя пристройками) общ. пл. 1070,6 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53567 (склад базы СРСУ) общ. пл. 69,8 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53574 (площадка хранения) пл. 533 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53576 (площадка пилорамы) пл. 237 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53568 (навес участка металлоконструкций) пл. 154,1 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53575 (покрытие а/б базы СРСУ) пл. 11492 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53573 (эстакада ж/б базы СРСУ) пл. 40 кв.м, кап. строение с инв. № 710/С-53577 (ограждение базы ж/б с воротами) протяженностью 486,72 м, кап. строение с инв. № 710/С-53571 (электросети базы СРСУ) протяженностью 103,3 м, кап. строение с инв. № 710/С-53569 (тепловые сети базы СРСУ) протяженностью 19,6 м, кап. строение с инв. № 710/С-53572 (сети хозпитьевого водопровода базы СРСУ) протяженностью 144,4 м, кап. строение с инв. № 710/С-53570 (сети хозфекальной канализации базы СРСУ) протяженностью 19,25 м | **Незавершенный строительством комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Энергетиков, 5, в составе:** незавершенное законсервир. кап. строение с инв № 710/С-3795 (административно-бытовой корпус) пл. 1941,8 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв № 710/С-3797 (вспомогательный корпус) пл. 2776,3 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв № 710/С-3796 (производственный корпус) пл. 5386 кв.м; незавершенное законсервир. кап. строение с инв № 710/С-3798 (заправка) пл. 87 кв.м; незавершенное кап.строение (очистное сооружение литер 5Б) пл. 14,67 кв.м; незавершенное кап.строение (очистное сооружение литер 4Б) пл. 14,78 кв.м; ограждение ж/бет площадью 2244 кв.м. с воротами металлическими площадью 12,6 кв.м; незавершенные строительством сооружения: покрытие бет. пл. 2550 кв.м, резервуары установки пожаротушения пл. 32,5 кв.м, грязеуловители, внутриплощадочные тепл. сети |

| Общие сведения | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509), г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 | |
| Начальная цена продажи, рублей без НДС | 578 702 461 | 6 869 370 627 |
| Размер задатка, рублей | 28 935 120 | 343 468 530 |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000 | |
| Площадь земельного участка | **4,0721 га**, кадастровый номер 741000000003000056, правовой режим – право постоянного пользования | **5,9884 га**, правовой режим – право постоянного пользования |
| Условия продажи | аукцион без условий | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | |
| Условия оплаты | определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи | |
| Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка | по 19 ноября 2009 г. включительно | |

*Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 181 от 25 сентября 2009 г.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 

# «5 ЗОРАК» БЯРОЗАЎСКАГА СЫРАРОБНАГА КАМБІНАТА

**Летась Бярозаўскі сыраробны камбінат зноў стаў першым сярод прадпрыемстваў малочнай галіны краіны па аб'ёмах вытворчасці сыроў. І такі выдатны паказчык ён трымае не першы год. Яго прадукцыю добра ведаюць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. Бясспрэчнымі перавагамі прадукцыі прадпрыемства з'яўляюцца: натуральнасць, карыснасць, выдатныя смакавыя якасці і даступныя цэны.**

*Дырэктар ААТ «Бярозаўскі сыраробны камбінат» Уладзімір ПАПЕНЯ.*

## НОВАЕ АБЛІЧЧА ЯКАСЦІ

Асартыментная лінейка прадуктаў камбіната надзвычай багатая і дае магчымасць кожнаму спажыўцу выбраць ласунак на свой густ. Толькі сыроў Бярозаўскі сыраробны камбінат выпускае 17 найменняў. У тым ліку — сыры з павышаным узроўнем прапіонавакіслага браджэння «Радивилл» і «Монарх».

— Цвёрдыя сычужныя сыры — каштоўная крыніца жывёльнага бялку, малочнага тлушчу і вітамінаў, якія з'яўляюцца абавязковымі кампанентамі здаровага харчавання, — расказвае інжынер-тэхнолаг прадпрыемства Таццяна КРЫШТАЛЬ. — Яны вельмі карысныя, бо маюць большы працэнт утрымання бялку, чым мяса, і лягчэй засвойваюцца. Мы прапануем нашым спажыўцам «Российский молодой», «Мраморный», «Сметанковый», «Сливочный», «Русский», «Монастырский», «Пошехонский», «Костромской», «Сельский», «Юбилейный» (с паприкой), «Полесский» і інш. Сыры «Радивилл» і «Монарх» (з вялікімі «вочкамі») розняцца па смаку ад традыцыйных гатункаў. Яны выпускаюцца з паніжаным утрыманнем солі і маюць адметны, саладкавата-востры смак. Якасць нашых сыроў неаднойчы адзначалася шматлікімі прызамі і ўзнагародамі на рэспубліканскіх і міжнародных выставах.

Акрамя цвёрдых сычужных сыроў камбінат выпускае мяккія сыры («Адыгейский», «Солнечный»), расольныя (брынза «Славянская»), а таксама шырокі асартымент плаўленых сыроў.

— Мы імкнёмся атрымаць прызнанне па ўсіх групах тавараў, якія выпускаем, — дадае маркетолаг Дзмітрый ХОБАТНЕЎ, — і пастаянна працуем над павышэннем іх якасці. У нас ёсць пэўныя віды прадукцыі, якія на любой прафесійнай выставе ці конкурсе заўсёды вылучаюцца сваімі выдатнымі характарыстыкамі, напрыклад, сыр «Радивилл».

Прадпрыемства выпускае некалькі найменняў вяршковага масла, сухія малочныя прадукты, у тым ліку замяняльнік цэльнага малака, казеін, згушчанае малако, маянэз.

Вялікую групу прадукцыі камбіната складаюць тварог і тварожныя вырабы: разнастайныя тварожныя дэсерты, крэмы, глазіраваныя сыркі. Аматары салодкага даўно ацанілі бярозаўскае марожанае. Пламбір класічны ў глазуры, эскімо, марожанае «Спортивное», «Чёрный принц», «Айсберг», торт-марожанае «Сладкая сказка» — гэта далёка не поўны пералік асартыменту, які, між іншым, вырабляецца на італьянскай вытворчай лініі. Сёлета прадпрыемства асвоіла выпуск халоднага салодкага ласунку ў глазіраваных ражках — «Х-Айс».

Асобную групу прадуктаў складаюць кісламалочныя напоі. «Активил» Бярозаўскага сыраробнага камбіната ведае кожны беларус. Ён стаў сапраўдным народным прадуктам. Адэпты здаровага ладу жыцця любяць і цэняць «Идеал», «Активил Фрутис», «Jogi», «Окей», «Орхидею», «Меркурий». Усе гэтыя напоі ўтрымліваюць лакта- і біфідабактэрыі, якія рэгулююць баланс кішэчнай мікрафлоры, стымулююць ахоўныя функцыі арганізма, спрыяюць прафілактыцы гастрытаў, калітаў, язваваў хваробы страўніка і дысбактэрыёзу кішэчніка, дапамагаюць расшчапляць лактозу з утварэннем малочнай кіслаты без прадуктаў браджэння.

— Літаральна месяц таму на паліцах крамаў з'явіўся новы кісламалочны біянапой «Маруся» ў 100-грамовай расфасоўцы, — працягвае Дзмітрый Хобатнеў. — Дызайн упакоўкі распрацаваны сумесна з брэндам «MARUSYA» — дызайнерскае адзенне для дзяцей. Арыентаваныя на дзяцей, такія напоі першапачаткова задумваліся як спалучэнне «прыемнага з карысным». Кожны прадукт утрымлівае комплекс з 7 культур біфіда- і лактабактэрый, карысных для здароўя. Гэты комплекс падабраны такім чынам, каб напоі прыносілі дзіцячаму і даросламу арганізму максімальную карысць. Кожная культура бактэрый не толькі выконвае сваю ролю, але і спрыяльна ўплывае на іншыя культуры, стымулюе іх рост, узмацняе іх дзеянне. Думаю, дзеці і іх бацькі высока ацэняць гэты напой.

Сёння Бярозаўскі сыраробны камбінат прапануе сваім спажыўцам цэлых пяць навінак пад агульным брэндам «5 зорак». Гэта пяць малочнакіслых напояў, якія валодаюць ярка выражаным прафілактычным і аздараўленчым уздзеяннем. Знаёмцеся: «Эликсир», «Баланс», «Лактиналь», «Активил СпортАктив», «Иммунолакт».

**Лактиналь.** Прызначаны для ўмацавання і аднаўлення здароўя жанчага арганізма, асабліва карысны жанчынам ад 20 да 50 гадоў. Напой утрымлівае комплекс чатырох унікальных лакта-культур, ад якіх шмат у чым залежыць здароўе і прыгажосць жанчын. Амінакіслотны і ферментны склад, які прадуцыруецца гэтымі культурамі, спрыяе выпрацоўцы жыццёва важных гармонаў, недахоп якіх прыводзіць да заўчаснага старэння.

**Иммунолакт.** Прызначаны для ўмацавання імунітэту людзей усіх узростаў. Асабліва карысны для тых, хто часта пакутуе ад вірусна-рэспіраторных захворванняў.

**Активил СпортАктив.** Прызначаны для ўмацавання і аднаўлення здароўя. Утрымлівае да мільярда жывых клетак біфідабактэрый, якія станоўча ўплываюць на фізіялагічныя функцыі арганізма. Дзякуючы экстракту гуараны (натуральнага «энергетыка»), аднаўляе сілы, павышае тонус.

**Эликсир.** Прызначаны для людзей любога ўзросту. Асабліва карысны для тых, хто працуе ў шкодных умовах. Выдатна ўздзейнічае на фізіялагічныя функцыі і біяхімічныя рэакцыі арганізма чалавека.

**Баланс.** Падыдзе ўсім, хто клапоціцца пра сваё здароўе і імкнецца заставацца ў добрай фізічнай форме. Напой утрымлівае 5 жыццёва важных бактэрыяльных культур, якія выступаюць бар'ерам супраць шкодных бактэрый у страўнікава-кішачным тракце, дапамагаюць прыгнятаць патагенныя мікраарганізмы, умацоўваць імунітэт.

— Апошнія нашы навінкі адрозніваюцца ад класічнага асартыменту паніжаным утрыманнем тлушчу, — патлумачыла Таццяна Крышталь. — Яшчэ раз падкрэслю: усе нашы кісламалочныя напоі «жывыя», нетэрмізаваныя, а значыць, карысныя для здароўя чалавека.

## УПОР — НА КАНКРЭТНАГА ЧАЛАВЕКА

Першая асоба на любым прадпрыемстве — яго кіраўнік, чалавек, які нясе на сабе адказнасць за кожнага работніка і за вытворчасць у цэлым. Поспехі Бярозаўскага сыраробнага камбіната — шмат у чым вынік намаганняў дырэктара Уладзіміра ПАПЕНІ, яго арганізатарскага таленту і прадпрымальніцкага чуцця. Мы папрасілі Уладзіміра Рыгоравіча расказаць пра гісторыю прадпрыемства, пра тое, з чым давялося сутыкнуцца ў розныя часы.

— Прадпрыемства працуе з 1944 года. Я сам у перапрацоўчай галіне з 1971 года. Пасля заканчэння мясамалочнага тэхнікума быў накіраваны на Кардымаўскі малочнакансервавы камбінат Смаленскай вобласці, які выпускаў сухія вяршкі і малако. Пасля арміі, у 1973 годзе, я прыйшоў на Бярозаўскі камбінат. На пасадзе дырэктара 23 гады. Я ведаю пра прадпрыемства ўсё. Давялося перажыць і цяжкія перыяды. Іншым часам такі адчай агортваў, здавалася, што немагчыма справіцца з абставінамі, але я нагадваў сабе: «Я ж мужык!» і працягваў змагацца. Галоўнае было — калектыў настроіць, падабраць выдатных спецыялістаў, адладзіць усю сістэму.

Сёння ў склад прадпрыемства ўваходзяць яшчэ тры вытворчыя адзінкі, якія раней былі самастойнымі структурамі. Гэта Івацэвіцкі малочны завод, Іванаўскі малочны завод і былы саўгас «Прамень». Першым шэсць гадоў таму мы набылі Івацэвіцкі завод, які на той час быў у стадыі банкруцтва. Закрылі яго даўгі, уклалі шмат сродкаў у мадэрнізацыю і за паўтара года «ўзнялі» завод на нармальны вытворчы ўзровень, цяпер ён працуе выдатна.

Амаль 4 гады таму набылі саўгас. Яго стан быў яшчэ горшым, чым у Івацэвіцкага завода. Букет праблем, якімі паспеў абрасці «Прамень», — яшчэ большым. Тым не менш, сёння надоі на карову ў яго лепшыя ў раёне! Мы навялі там парадак. Пачалі з паляпшэння побытавых умоў, абнавілі і працягваем абнаўляць парк сельскагаспадарчай тэхнікі. Уявіце, самай перадавой машынай на момант далучэння ў іх быў трактар сямі гадоў эксплуатацыі. На пачатку мы адчувалі недахоп кадраў, а сёння штат укамплектаваны вартымі, кваліфікаванымі работнікамі. Раней часам узнікалі пытанні з дысцыплінай, але цяпер іх няма.

Калі мы толькі прынялі да сябе «Прамень», заробак там быў вельмі нізкі. А дакладней, 200 тысяч, у той час як ва ўсіх астатніх гаспадарках ужо перавалiў за 300. Патроху давялі мы ім заробак да 700 тысяч.

Апошнім мы набылі Іванаўскі малочны завод. Зрабілі гэта, як і ў абодвух папярэдніх выпадках, па просьбе абласных і раённых уладаў. Іванаўскі завод на той час быў банкрутам. За год мы ўзнялі яго вытворчасць на дакрызісны ўзровень, пры тым, што яшчэ не ўсе даўгі завода пагасілі. Цяпер ён працуе нядрэнна, хоць мне, як заўсёды, хочацца, каб лепш. Галоўнае — мы захавалі працоўны калектыў і профіль вытворчасці.

*Адбор сыру для правядзення лабараторнага аналізу.*

**— Сёння многія прадпрыемствы «задыхаюцца» ў цяжкіх фінансавых умовах без усякіх дадатковых нагрузак. А вы не толькі самі выжываеце, але яшчэ і ставіце на ногі банкрутаў, якіх вам давялося ўзяць «на буксір». За кошт чаго атрымліваецца вывесці ўсю вашу шматлікую гаспадарку на высокія эканамічныя паказчыкі?**

— Першае — гэта калектыў. Ён у нас падрыхтаваны, кваліфікаваны. Вы ж разумееце: прадукцыю выпускаюць людзі. І важна стварыць для іх такі мікраклімат на прадпрыемстве, каб яны працавалі з задавальненнем. Калі я бачу, што нехта з маіх работнікаў спяшаецца на завод без настрою, абавязкова падбадзёру яго, нагадаю мой любімы выраз: «На працу — як на свята!» Ва ўсіх сваіх структурных падраздзяленнях — Івацэвічы, Іванава, «Прамень», як і на галаўным нашым заводзе ў Бярозе, мы стварылі годныя ўмовы, кожны работнік трымаецца за сваё месца.

Што датычыцца завода ў Іванаве, ён меў такі вялікі мінус па рэнтабельнасці, што за яго страшна было браць. Давялося літаральна па кожным участку, па кожнай службе ўносіць змяненні і карэктывы. Патроху выправілі ўсе слабыя месцы, правялі рэканструкцыю, замянілі абсталяванне, вырашылі шмат тэхналагічных і тэхнічных пытанняў. Усё разам дапамагло мінімізаваць страты. Не апошнюю ролю адыграла і ўзмацненне дысцыпліны. Без гэтага ніяк.

З былымі работнікамі завода — пенсіянерамі, ранейшае кіраўніцтва не сустракалася, ніхто пра іх не клапаціўся. Мы ў першы ж год арганізавалі для іх святочны канцэрт, ушанавалі добрым словам падзякі людзей, якія аддалі заводу ўсё працоўнае жыццё. Адна бабулька прызналася, што ўжо сабралася была памірaць, але перадумала — захацелася яшчэ такі канцэрт пабачыць. Добрае слова любому ў радасць. Вядома ж, выпадкі здараюцца розныя, але часцей людзі «адгукаюцца» на чалавечнасць, пачынаюць лепш працаваць. Мы робім упор на канкрэтнага чалавека. Кожны наш работнік нясе асабістую адказнасць за свой участак работ і за выкананне працоўнай дысцыпліны, пры гэтым ён можа разлічваць на падтрымку прадпрыемства.

У нас салідны сацыяльны пакет, ёсць свой медпункт, дзе працуе тэрапеўт, гінеколаг, стаматолаг, ёсць кабінет фізіятэрапіі, гідрамасажныя ванны, маецца свая выдатная сталоўка. Наш інтэрнат — адзін з найлепшых не толькі ў раёне, але і ў вобласці. Актыўная і выцццядзейная прафсаюзная арганізацыя.

Вялікую ўвагу мы надаём добраўпарадкаванню, даўно займаемся гэтай справай. Прычым робім гэта не для «галачкі», а для сябе, каб нам было прыемна ісці на працу, любавацца клумбамі, газонамі. Нездарма раённыя ўлады заўсёды прыводзяць нашу дзейнасць у якасці станоўчага ўзору добраўпарадкавання.

**— Што яшчэ, акрамя зладжанай работы калектыву, дапамагае прадпрыемству выжываць?**

— Праблема выжывання сёння надзвычай актуальная для ўсіх вытворцаў. Хаця, згодна з законамі класічнай эканомікі, мы ва ўмовах крызісу павінны адчуваць сябе горш, чым іншыя, але на практыцы атрымліваецца якраз наадварот. Заходняя эканамічная тэорыя адным з пастулатаў паспяховага вядзення бізнэсу называе вузкую спецыялізацыю. У нашым выпадку гэты эканамічны закон не спрацоўвае. Больш за тое, менавіта наша шматпланавасць дае нам прастору для манеўру. Напрыклад, калі зараз лепш за ўсё прадаецца сыр, то мы можам частку малака перыарыентаваць на вытворчасць сыру, а нешта стратнае (умоўна скажам, сухое малако) скараціць у аб'ёмах. Такі метад самарэгулявання і дапамагае прадпрыемству выжыць.

У нас ёсць прастора для ўнутранага манеўру. А прадпрыемствы, у якіх малыя магчымасці манеўравання, падчас крызісу нясуць аграмадныя страты. Дастаткова сказаць, што ў большасці малочных прадпрыемстваў рэспублікі сёння цяжкае фінансавае становішча, хаця перад усімі пастаўлена задача да канца года выйсці на бясстратную работу. Асабліва складана было тым вытворцам, хто большую частку прадукцыі адпраўляў на экспарт. Для тых, хто ў асноўным рэалізоўваў яе на ўнутраным рынку, сітуацыя склалася больш стабільная.

**— Колькі вашай прадукцыі ідзе на экспарт?**

— Гэта прыблізна 46 працэнтаў аб'ёмаў вытворчасці. Увогуле, расійскі рынак абсалютна непрадказальны — па любым відзе асартыменту цэны скачуць па некалі разоў на месяц. Сёння, дзякуючы пэўнай стабілізацыі ў эканамічных узаемаадносінах з нашым усходнім суседам, уся наша экспартная прадукцыя прыносіць прыбытак. На працягу апошніх гадоў мы працуем з пастаяннымі пакупнікамі, якія прапануюць нашу прадукцыю на расійскі рынак. Дзякуючы ім, Бярозу ведаюць у Маскве і Маскоўскай вобласці, у Санкт-Пецярбургу, Калінінградзе, Варонежы, Арле.

Унутраны рынак больш стабільны — і ў плане аб'ёмаў продажу, і ў плане цэнаў. Наша прадукцыя прысутнічае літаральна ва ўсіх абласцях рэспублікі. Толькі ў Мінску мы ў месяц прадаём прадукцыі на 3 млрд рублёў. У цэлым па краіне месячная выручка прадпрыемства складае 12 млрд рублёў.

**— У многім якасць прадукту харчавання залежыць ад сыравіны, з якой ён выраблены. Як вы змагаецеся за павышэнне якасці малака?**

— Мы ўжо гадоў 8 працуем у гэтым кірунку. Пачалі з астуджэння малака непасрэдна ў гаспадарках нашай сыравіннай зоны, якую складаюць гаспадаркі Бярозаўскага, Іванаўскага, Івацэвіцкага і часткова Драгічынскага раёнаў. Там, дзе была неабходнасць, устанавілі спецыяльнае абсталяванне. Цяпер у нас 99,8 працэнта ўсіх аб'ёмаў малака астуджваецца на месцы. Стварылі мабільную брыгаду, якая абслугоўвае халадзільныя і даільныя ўстаноўкі. Прымаем мы і малако ад насельніцтва. Сёння ў агульным аб'ёме нашай сыравіны яго доля не перавышае 10 працэнтаў (у сувязі са скарачэннем пагалоўя на прыватных падворках), а калісьці гэты паказчык складаў 33 працэнты. Збор малака ад насельніцтва дзесьці праводзім самі (у нас ёсць свае прыёмныя пункты), дзесьці — сіламі сельскіх Саветаў ці мясцовых СВК. У любым выпадку магчымасць здаваць малако ёсць у кожнага жыхара нашай сыравіннай зоны.

**— Раскажыце аб асноўных кірунках далейшага развіцця прадпрыемства, аб планах на найбліжэйшую будучыню...**

— Яны, безумоўна, ёсць і патроху ўвасабляюцца ў жыццё. Мы намагаемся паралельна развіваць усе чатыры свае структурныя падраздзяленні. Напрыклад, у саўгасе мы прыступілі да будаўніцтва новага сучаснага комплексу на 768 галоў. Сёння ў нас ёсць 3 малочныя фермы (невялікія па памерах, з састарэлым абсталяваннем). На адной з іх мы плануем правядзенне поўнамаштабнай рэканструкцыі па адкорме і дарошчванні жывёлы. Скарачэнне вытворчых выдаткаў і ўкараненне найноўшых тэхналогій павінны даць значны эканамічны эфект.

Пры вырабе сыру ў якасці другаснага прадукту вытворчасці застаецца сыроватка. Гэта вельмі каштоўны прадукт, замяняльнік сухога малака, які выкарыстоўваецца ў харчовай прамысловасці і ў жывёлагадоўлі. Акрамя таго, вытворчасць сухой малочнай сыроваткі значна менш затратная, чым выраб сухога малака, што для нас, вытворцаў, таксама важна. У нас ёсць ультрафільтрацыйная ўстаноўка, якая раздзяляе сыроватку на бялковы кампанент і лактозу. З іх мы потым вырабляем малочны цукар і сыроватачны бялковы канцэнтрат (надзвычай каштоўны прадукт, які выкарыстоўваецца ў вытворчасці дзіцячага харчавання і харчовых дабавак для спартсменаў). Са 100 тон сыроваткі атрымліваецца 1,1 тоны малочнага цукру і каля тоны бялку. І першы, і другі прадукты карыстаюцца стабільным попытам і паспяхова рэалізуюцца. Малочны цукар-сырэц выкарыстоўваецца ў жывёлагадоўлі. Мы вырашылі дапрацаваць сваю тэхналогію, каб вырабляць высокаачышчаны малочны цукар, які можна было б выкарыстоўваць і ў харчовай прамысловасці. Сёлета мы ўжо рэалізавалі сваю задуму і атрымалі цукар выдатнай якасці. Цяпер працягваем развіваць гэты напрамак. Што датычыцца бялку-пратэіну, мы таксама працуем над павышэннем яго якасці. Цяпер набываем новае абсталяванне, калі канкрэтна — установіць мікрабіялагічнай ачысткі. Гэта наш задзел на будучыню.

У свеце стабільна высокім попытам карыстаецца дэмінералізаваная сыроватка. Мы ўжо набылі адпаведную ўстаноўку для дэмінералізацыі і да канца года ўвядзём яе ў дзеянне. Адзначу, што ў Беларусі нічога падобнага пакуль няма і ў найбліжэйшы час наўрад ці з'явіцца, таму мы смела можам лічыць сябе манапалістамі ў гэтай галіне. Увогуле, планаў у нас шмат.

*Інжынер-тэхнолаг Таццяна КРЫШТАЛЬ.*

Цяпер актыўна працуем над энергазберажэннем. Год таму ўсталявалі міні-ўстаноўку па выпрацоўцы электраэнергіі. Дзякуючы ёй, мы на 52 працэнты забяспечваем сябе ўласнай электраэнергіяй. Прычым адна наша кілават-гадзіна таннейшая, чым пакупная. У Іванаве будуем участак па вытворчасці замяняльніка цэльнага малака для цялят. Мяркуем далей развіваць сыраробства і павялічыць асартымент сыроў.

Мы ўваходзім у тройку айчынных прадпрыемстваў галіны, якія падалі заяўку на атрыманне ветэрынарнага нумара еўрапейскага ўзору, які дае права пастаўляць прадукцыю ў ЕС. Зараз мы праходзім інспектаванне на адпаведнасць еўрапейскім стандартам, прычым правяраецца не толькі сама вытворчасць, але і сыравінная зона, ветэрынарыя і г.д. **Наша галоўная задача — пастаяннае павышэнне ўзроўню вытворчасці і якасці прадукцыі.**

**Матэрыял падрыхтавалі Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіва прадпрыемства.**

УНП 200022701.

*На лініі фасоўкі сыру.*

*Ультрафільтрацыйная ўстаноўка ў цэху сушкі.*